# МАСТАЦТВА

(АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

7



# МАСТАЦТВА

## (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)

Вучэбны дапаможнік для 7 класа ўстаноў адукацыі,
якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы
агульнай сярэдняй адукацыі,
з беларускай мовай навучання і выхавання

Пад рэдакцыяй *С. І. Колбышавай*

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

*2-е выданне, перагледжанае і дапоўненае*

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2024

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

УДК 7.03(100)(075.3=161.3)
ББК 85(0)я721
М32

Аўтары: Ю. Ю. Захарына, С. І. Колбышава, М. Л. Карпянкова, І. Р. Томашава, М. А. Волк

Пераклад з рускай *А. У. Бельскай*

Рэцэнзент: кафедра ўсходазнаўства факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (кандыдат філалагічных навук, дацэнт *С. Ю. Лебедзеў*)

Матэрыялы электроннага дадатку размешчаны
на рэсурсе https://e-vedy2.adu.by

**ISBN 978-985-599-964-6**

© Бельская А. У., пераклад на беларускую мову, 2024
© Афармленне. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2017
© Афармленне. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”», 2024, са зменамі

# ЗМЕСТ

**Як працаваць з вучэбным дапаможнікам** .................................. 5

**Раздзел 1.**
**У пошуках прыгажосці: мастацтва першабытных часоў** .......... 7

§ 1. Мастацтва першабытнай эпохі: пасланне нашчадкам ....... 8
§ 2. Асваенне прасторы: зараджэнне архітэктуры ....................15
§ 3. Мастацтва першабытных часоў на беларускіх землях ........ 22
§ 4. Язычніцкая культура на беларускіх землях ......................... 28

**Раздзел 2.**
**Мастацтва, застылае на тысячагоддзі: Старажытны Егіпет** .... 33

§ 5. Ідэі вечнага жыцця ў старажытнаегіпецкай архітэктуры .... 34
§ 6. Сюжэты і вобразы ў выяўленчым мастацтве Старажытнага Егіпта ........................................................... 41
§ 7. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Егіпта ..................................................................... 47
§ 8. Загадкі Старажытнага Егіпта: літаратура і музыка ............. 53
§ 9. Творчы ўрок. Старажытнаегіпецкая пісьменнасць .............. 59

**Раздзел 3.**
**Мастацтва праз тысячы гадоў: Старажытны Усход** .................. 61

§ 10. Мастацтва шумераў: моц правіцеля і вера ў багоў ........... 62
§ 11. Вавілон і Асірыя: барацьба за культурныя каштоўнасці ................................................................... 69
§ 12. Мастацтва Старажытнага Ірана: услаўленне магутнасці цара і яго дзяржавы ........................................... 76
§ 13. Мастацтва Старажытнай Індыі: ідэалы прыгажосці............ 82



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

§ 14. Мастацтва Старажытнага Кітая: прыгажосць у дэталях ... 88
§ 15. Манументальнасць архітэктуры і скульптуры Старажытнага Кітая ... 94
§ 16. Творчы ўрок. Паветраны змей ... 101

**Раздзел 4.**
**Атланты і карыятыды: мастацтва Старажытнай Грэцыі** ... 103

§ 17. Мастацкая фантазія крыта-мікенскага мастацтва ... 104
§ 18–19. Ордарная сістэма ў старажытнагрэчаскай архітэктуры ... 110
§ 20. Грэчаскі храм — ідэал гармоніі і прыгажосці ў архітэктуры ... 115
§ 21. Вобраз чалавека ў скульптуты Старажытнай Грэцыі ... 121
§ 22. Керамічныя вырабы Старажытнай Грэцыі ... 128
§ 23. Цуды свету ў Старажытнай Грэцыі ... 132
§ 24. Гармонія думкі і слова: літаратура Старажытнай Грэцыі ... 138
§ 25–26. Тэатр і музыка Старажытнай Грэцыі ... 143
§ 27. Творчы ўрок. Выразныя прыёмы ў старажытнагрэчаскім тэатры ... 150

**Раздзел 5.**
**Мастацтва Старажытнага Рыма: пасланне ў будучыню** ... 151

§ 28. Мастацтва этрускаў: папярэднікі вялікіх рымлян ... 152
§ 29. Архітэктура Старажытнага Рыма: наватарства, веліч і інжынернае майстэрства ... 157
§ 30. Выдатныя пабудовы Старажытнага Рыма ... 163
§ 31. Партрэтны жанр у скульптуры Старажытнага Рыма ... 169
§ 32. Своеасаблівасць тэхнік манументальнага жывапісу Старажытнага Рыма ... 174
§ 33. Тэатр і музыка ў Старажытным Рыме ... 179
§ 34. Творчы ўрок. Старажытнарымская мазаіка ... 186
§ 35. Творчы праект ... 187

**Слоўнік** ... 190

# ЯК ПРАЦАВАЦЬ З ВУЧЭБНЫМ ДАПАМОЖНІКАМ

## ДАРАГІЯ СЯМІКЛАСНІКІ!

У новым навучальным годзе мы пачынаем знаёміцца з гісторыяй мастацкай культуры. Гэта будзе захапляльнае падарожжа.

Першы прыпынак у падарожжы — культура першабытнай эпохі. Вы даведаецеся, пра што хацеў расказаць першабытны чалавек, ствараючы малюнкі жывёл, чалавечыя фігуркі, загадкавыя сімвалы і знакі.

Другі прыпынак — самыя буйныя цэнтры цывілізацый старажытнасці: Егіпет, Месапатамія, Індыя, Кітай. Вы пазнаёміцеся з архітэктурнымі збудаваннямі, пабываеце ў храмах, разгадаеце загадкі, пакінутыя нам старажытнымі культурамі.

Трэці прыпынак — самыя значныя з'явы Антычнасці. Вы ўбачыце, як сіла чалавечага духу, жаданне спазнання і дасканаласці, уласцівыя антычнай культуры, выявіліся ў творах мастацтва. Сустрэўшыся з мастацтвам антычнага свету, вы даведаецеся, чаму антычную культуру лічаць калыскай сусветнага мастацтва.

У вучэбным дапаможніку пасля кожнага параграфа прадугледжаны «Пытанні і заданні», адказаўшы на якія, вы ўбачыце ўжо знаёмыя мастацкія творы з новага боку. У «Творчай майстэрні» атрымаеце вопыт па стварэнні свайго твора мастацтва.

У слоўніку вы знойдзеце азначэнні новых слоў, якія ў тэксце вучэбнага дапаможніка пазначаны колерам. Яскравыя звесткі пра мастацтва выкладаюцца ў рубрыцы «Цікавы факт!». Урыўкі з літаратурных твораў і вывады да кожнага параграфа вылучаны колерам для зручнага прачытання.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# УМОЎНЫЯ АБАЗНАЧЭННІ

У працы вам дапаможа электронны дадатак, які змяшчае выявы твораў мастацтва. Адкрыць яго вы зможаце з дапамогай QR-кода. Спасылка на электронны дадатак абазначана значком .

Часам вам можа спатрэбіцца дадатковая інфармацыя, якую неабходна знайсці самастойна. Спасылка на інфармацыйныя крыніцы — даведачную літаратуру, энцыклапедыі, іншыя інтэрнэт-рэсурсы — абазначана значком .

Раздзел 1

# У ПОШУКАХ ПРЫГАЖОСЦІ: МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНЫХ ЧАСОЎ



Петрогліфы, Алтай (неаліт)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 1. МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНАЙ ЭПОХІ: ПАСЛАННЕ НАШЧАДКАМ

Сучасным людзям не толькі цікава, але і важна ведаць, калі ўзнікла мастацтва і чаму чалавек пастаянна да яго звяртаецца. Аб прычынах яго ўзнікнення існуе мноства тэорый. Кожная з іх часткова праўдзівая.

***З'яўленне мастацтва: ад пераймання да творчасці.*** Дакладны час з'яўлення мастацтва назваць складана. Але можна з упэўненасцю сказаць, што мастацтва ўзнікла ў каменным веку. Менавіта тады ў першабытнага чалавека нарадзілася патрэбнасць выказваць эмоцыі і пачуцці, упрыгожваць сваё жыццё, спазнаваць тайны навакольнага свету.

У першабытны час людзі не аддзялялі сябе ад прыроды, лічылі сябе яе часткай. Усе заняткі чалавека — штодзённае жыццё, мастацкая дзейнасць, абрады і рытуалы — былі зліты ў адно. Танцуючы, здзяйсняючы рытуалы, размалёўваючы сцены пячор, людзі яшчэ не ўсведамлялі, што займаюцца мастацтвам. Напэўна, так яны імкнуліся паўплываць на навакольны свет, часта суровы і непрыязны. Усё, што рабіў чалавек, падпарадкоўвалася практычным мэтам і павінна было прынесці ўдачу, забяспечыць добрае надвор'е, даць здароўе.



Выява бізона ў пячоры Шульган-Таш, Расія (каменны век)

Мастацтва першабытнай эпохі ахоплівае каменны, бронзавы і жалезны вякі.

Першабытныя людзі думалі, што ўсё ў навакольным свеце (сонца, неба, вецер), як і чалавек, мае душу, разумее маўленне, мае патрэбу ў харчаванні і сне. Таму ўсім з'явам, ад якіх залежала жыццё людзей, яны *спраўлялі ахвярапрынашэнні*. Звароты да сіл прыроды пераўтварыліся ў абрады. У час правядзення абраду не было падзелу на гледачоў і выканаўцаў. У такую дзейнасць уключаліся людзі і ўсё тое, з чаго складвалася іх жыццё: рэальныя прадметы, выявы чалавека і жывёл, шкуры звяроў і маскі.

Спачатку чалавек *імкнуўся пераймаць прыроду*: напрыклад, капіраваў у танцах і песнях звычкі і гукі жывёл. Пазней ён навучыўся адлюстроўваць жывых істот. Чалавек шчыра верыў у сілу свайго мастацтва: ён маляваў сцэну паспяховага палявання і чакаў, што гэта дапаможа яму і ў рэальнасці вярнуцца са здабычай.



Кара́лі, Чэхія (каменны век)

Аднак першабытныя людзі не толькі малявалі коп'і, што патрапілі ў адлюстраванага звера, але і *«гулялі» з малюнкамі* — на многіх наскальных малюнках жывёл бачныя сколы ад удараў каменных стрэл і коп'яў. Чалавек надзяваў упрыгажэнне з іклоў і зубоў магутнага мядзведзя і чакаў, што яно стане талісманам: надасць яму дадатковую сілу і адвагу. Напэўна, старажытныя людзі спадзяваліся, што гэта можа прынесці ўдачу на паляванні.

*Разгледзьце прыклады ранняга мастацтва. Уявіце сабе людзей, якія іх стваралі. Як вы думаеце, што ў гэтых выявах зачароўвае і хвалюе сучаснага гледача?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Першыя выявы: сюжэты і вобразы.*** Асвойваючы прыроднае асяроддзе, людзі пачалі ўладкоўваць сваё першае жыллё. Яны сяліліся ў пячорах ці будавалі простыя шалашы з прутоў і костак жывёл. Асвоіўшы прастору вакол сябе, людзі захацелі пераўтварыць яе і пакінуць знак-след на «асабістай» тэрыторыі. Прыкладамі такіх знакаў з'яўляюцца першыя выявы ў пячорах.

Яшчэ не прыдумаўшы прыстасавання для малявання, чалавек пачаў выкарыстоўваць тое, што было заўсёды пры ім, — свае рукі. Напрыклад, на мяккім налёце на сценах пячоры людзі *пакінулі доўгія хвалістыя лініі, якія сучасныя вучоныя назвалі «макаронай»*. Іх даўжыня пры гэтым магла дасягаць некалькіх метраў. А ў некаторых пячорах мы можам знайсці і сапраўдныя знакі-сляды — сілуэты рукі чалавека.

З часам першабытны чалавек захацеў не толькі пакінуць след, але і перадаць свой аповед пра ўбачанае і перажытае ў сюжэтах і вобразах.

**Цікавы факт!**
Вучоныя высветлілі, што першабытныя людзі прыкладвалі да сцяны руку, як трафарэт. Пасля набіралі ў рот фарбу і, выдзьмухваючы, распырсквалі яе.



Адбіткі рук у пячоры Куэва-дэ-лас-Манас, Аргенціна (каменны век)



Мамант. Прадрапаны малюнак у пячоры Руфіньяк, Францыя (каменны век)

*Адным з першых адлюстраваных вобразаў рэальнага свету была жывёла.* Людзі ўважліва назіралі за жывымі істотамі і імкнуліся выявіць іх як мага больш натуральна і праўдападобна. Гэта пацвярджаюць графічныя і маляўнічыя выявы першабытнага часу на сценах і скляпеннях шматлікіх пячор сучасных Францыі, Іспаніі, Расіі.

Большасць выяў — вобразы насарогаў, дзікіх коней, быкоў, мядзведзяў. Некаторыя з адлюстраваных жывёл, напрыклад маманты, ужо не існуюць. І толькі малюнкі, створаныя першабытным чалавекам, дазваляюць нам сёння ўявіць іх знешні выгляд, рухі цела і звычкі.



Ласі. Петрогліф у раёне р. Ангары, Расія (неаліт)

У Сібіры, у даліне ракі Ангары, была знойдзена рэалістычная выява ласёў. Яны паказаны ў руху, у профіль. Фігуры злёгку напластоўваюцца адна на адну. Уражвае разнастайнасць пастаў жывёл.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Цікавы факт!**
У адкрыццях многіх твораў першабытнага мастацтва часта ўдзельнічаюць дзеці. Напрыклад, роспісы ў пячоры Альтаміра выпадкова знайшла дзяўчынка дзевяці гадоў, а пячору Ласко адкрылі падлеткі, якія шукалі сабаку.

Часта чалавек рабіў выявы жывёл на прыладах працы і палявання, на разнастайных пласцінах з каменю і косці. А ў месцах першабытных стаянак былі знойдзены маленькія статуэткі жывёл, птушак, рыб. Асабліва выразныя сілуэты жывёл. Людзі, якія іх стваралі, заўважалі самыя дробныя дэталі: асаблівасці лускі рыбы, фактуры футра, грывы ці будовы рагоў.

У адной з пячор Францыі — Мантэспáн — знойдзена *тулава мядзведзя з гліны*. Увенчана яно сапраўдным чэрапам жывёлы. Магчыма, наверх накідвалі і шкуру мядзведзя. Існуе меркаванне, што такая скульптура выкарыстоўвалася ў час рытуалаў.



Гліняная скульптура мядзведзя ў пячоры Мантэспан, Францыя (каменны век)

*Разгледзьце выявы жывёл, пададзеныя ў параграфе і электронным дадатку. Назавіце творы ранняга мастацтва, якія «расказваюць» пра звычкі і характар жывёлы.*

***Вобраз чалавека ў першабытным мастацтве.*** З развіццём першабытнага грамадства сюжэты ўскладняліся, у іх усё часцей з'яўляўся чалавек. Першыя выявы чалавека з'явіліся ў скульптуры. Яны былі выкананы з костак і рагоў жывёл, біўняў сланоў і мамантаў, гліны, дрэва і каменю.

Шырокае распаўсюджанне атрымалі жаночыя статуэткі. Самыя характэрныя з іх — жаночыя фігуркі, вядомыя ўсяму свету як *«палеалітычныя Венеры»*, або *«першабытныя мадонны»*. Гэтыя маленькія статуэткі не перавышаюць у вышыню 25 сантыметраў. У многіх з іх адсутнічаюць ці амаль не прапрацаваныя твар, ногі і рукі. Затое падкрэслены часткі цела, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Хутчэй за ўсё, палеалітычныя Венеры сімвалізавалі ўрадлівасць.



Венера, сяло Касцёнкі, Расія (каменны век)

У мастацтве *бронзавага веку* з дрэва ці каменю пачалі ствараць *ідалаў*. Гэта былі асаблівыя статуі даволі вялікіх памераў. Ім пакланяліся як боствам. Знешні выгляд статуй быў падобны да чалавечага, часцей мужчынскага.

Адна з самых ранніх знойдзеных скульптур, выробленых з дрэва, — *Вялікі Шыгірскі ідал*. Галава пяціметровай статуі захоўвае асноўныя рысы, уласцівыя чалавеку. Драўляная аснова тулава з абодвух бакоў пакрыта разным узорам, у якім угадваюцца некалькі твараў. Ёсць версія, што гэтыя твары адлюстроўваюць культы старажытных людзей: вады і паветра, жывёл і раслін.



Вялікі Шыгірскі ідал, Расія (бронзавы век)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Фрагмент наскальнага роспісу ў цясніне Тасілін-Аджэр, Алжыр (жалезны век)

У мастацтве *жалезнага веку* вобраз чалавека ўскладніўся. Мастакі стараліся не проста адлюстраваць фігуру чалавека, але і раскрыць унутраны стан персанажаў, праз позы і жэсты перадаць эмоцыі сваіх герояў, расказаць пра падзеі ў іх жыцці.

Сярод маляўнічых кампазіцый жалезнага веку шырока вядомыя *роспісы, знойдзеныя ў цяснінах скал Алжы́ра, на плато Тасілі́н-Аджэ́р*. Гэта сапраўдная «карцінная галерэя», якая падрабязна расказвае пра штодзённае жыццё першабытных людзей і іх заняткі. Тут прадстаўлены вобразы паляўнічых, якія пры дапамозе лукаў, стрэл, сякер і дроцікаў адольваюць дзікіх звяроў. А сцэны выгану скаціны сведчаць пра тое, што чалавек у той перыяд ужо прыручыў жывёл. Праўдападобнымі і кранальнымі выглядаюць выявы жанчын-матак, якія гуляюць са сваімі дзецьмі.



Выган жывёлы. Фрагмент наскальнага роспісу ў цясніне Тасілін-Аджэр, Алжыр (жалезны век)

*Пра што расказваюць нам вобразы чалавека, створаныя першабытнымі мастакамі?*

Першабытны чалавек яшчэ не раздзяляў сваё штодзённае жыццё і мастацкую творчасць. Але ўжо ў раннім мастацтве творцы выказвалі свае пачуцці і ўяўленні пра свет. Першабытныя вобразы настолькі ўнікальныя і выразныя, што і сёння імі захапляюцца гледачы, натхняюцца мастакі.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія прыклады ранняга мастацтва вас уразілі найбольш? Што вас прыцягнула: перададзеныя эмоцыі ці аповед пра жыццё далёкіх продкаў?

2. Нямецкі мастак Паўль Клéе натхняўся мастацтвам першабытнага перыяду. У яго карціне мы можам бачыць простыя лініі ў спалучэнні з яркімі і даволі змрочнымі фарбамі. Як вы думаеце, што ў мастацтве першабытнага часу натхніла мастака?



**П. Клее.** Смерць і агонь (1940)

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Выканайце малюнак на любую тэму ў стылістыцы першабытнага мастацтва. Вазьміце для гэтага чорны фламастар і выкарыстоўвайце толькі лінію. Малюнак можна зрабіць на камп'ютары (смартфоне) у адной з даступных графічных праграм.

## § 2. АСВАЕННЕ ПРАСТОРЫ: ЗАРАДЖЭННЕ АРХІТЭКТУРЫ

У далёкія часы, калі чалавек яшчэ не навучыўся ўзводзіць збудаванні, жыллём яму служылі сховы, падказаныя прыродай: густыя галіны дрэў, пячоры, гроты ў скалах. Пастулова людзі сталі больш упэўнена адчуваць сябе ў навакольным свеце. Яны асвоілі новыя землі, навучыліся ўзаемадзейнічаць з прыродай, напрыклад, «прыручылі» агонь. Але галоўнае — у людзей узнікла патрэба ў стварэнні жылля сваімі рукамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Жыллё першабытнага чалавека. Рэканструкцыя Ігара Грабнёва

***Першыя спробы будаўніцтва.*** Першае жыллё з’явілася ў каменным веку. Спачатку гэта былі простыя *заслоны* ад ветру з лісця і *шалашы* з тонкіх жэрдак і костак жывёл, пакрытыя шкурамі, травой, лісцем. Іх пабудова не патрабавала вялікіх затрат сіл і часу. Але такія віды пабудоў маглі лёгка разбурыць вятры, дажджы, знішчыць звяры ў момант нападзення. Таму ўзнікла неабходнасць змяніць канструкцыю жылля.

Шалашы, зямлянкі і паўзямлянкі некалькі тысячагоддзяў заставаліся галоўным жыллём чалавека. Гэта было звязана з тым, што людзі, здабываючы сабе харч паляваннем, качавалі за жывёламі. Таму ўкрыцці, якія лёгка і хутка ўзводзяцца (як сучасныя палаткі), цалкам задавальнялі чалавека. Але пазней, калі колькасць людзей павялічылася, калі чалавек перайшоў да аселага ладу жыцця, спатрэбілася больш устойлівае жыллё. Так з’явіліся стаянкі — неўмацаваныя лагеры першабытных паляўнічых і збіральнікаў. На поўдні нашай краіны знойдзены *стаянкі каменнага веку Бе́рдыж і Ю́равічы*, жыллё якіх было пабудавана з костак маманта.

На змену стаянцы паляўнічых каменнага веку прыйшло *гарадзі́шча* — комплекс пабудоў, размешчаны на ўзвышшы ля ракі і абнесены ўмацаваннямі, напрыклад, земляным валам, агароджай. У ім магла жыць уся радавая абшчына. Вакол гарадзішчаў размяшчаліся



Дзякава гарадзішча ў Маскоўскай вобласці, Расія (V–III стст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

*паселішчы* (селішчы) — групы жылля без агароджы. Унутры паселішчаў жыллё дасягала шасці-васьмі метраў у даўжыню. У кожным з іх жыло па некалькі сем’яў, а ўнутры знаходзілася некалькі ачагоў. І толькі ў канцы каменнага веку жыллё атрымала выгляд хаты, раздзеленай на некалькі памяшканняў.

*Успомніце, з якіх матэрыялаў будаваў жыллё першабытны чалавек. Падумайце, чаму ў ім не было вокнаў. Ці існуе ў сучасным свеце жыллё са шкур жывёл?*

***Архітэктура: загадкі гісторыі.*** З часам людзі пачалі пераходзіць да больш маштабнага асваення навакольнага свету і арганізацыі прасторы. У бронзавым веку пачалі ўзводзіць збудаванні для правядзення разнастайных магічных і рытуальных дзеянняў. Гэтыя пабудовы стваралі з вялікіх камянёў. Таму іх і называюць *мегалітамі*. Гэта самая загадкавая з усіх з’яў першабытнай культуры. Паступова сфарміраваліся асноўныя тыпы мегалітаў: менгіры, дальмены, кромлехі.

*Менгі́р* уяўляў сабой вертыкальна пастаўлены камень вышынёй да пяці метраў. Менгіры адшуканы на тэрыторыі розных краін Еўропы,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Менгіры, камуна Карна́к, Францыя



Дальмен, Францыя

Азіі і Афрыкі. Найбольшая іх колькасць захавалася ў Францыі. Дакладнае прызначэнне менгіраў невядомае. Старажытныя людзі ўстанаўлівалі іх, падобна манументам, у месцах, найбольш значных з пункта гледжання вераванняў. Першапачаткова на менгірах не было выяў, але пазней некаторыя з іх сталі пакрываць гравіраваным арнаментам ці малюнкамі.

*Дальме́н* — больш складанае збудаванне з некалькіх гіганцкіх камянёў. Часцей за ўсё дальмен стваралі з шасці і больш велізарных камянёў, адзін з якіх служыў асновай, другі — перакрыццем, а астатнія — апорамі. Нярэдка ў адной са «сцен» дальмена знаходзілася круглая адтуліна ці быў высечаны праём у выглядзе аркі. Існуе тэорыя, што дальмены мелі культавае прызначэнне і з'яўляліся правобразам першага храма.

*Кро́млех* таксама будавалі з каласальных па памерах камянёў, якія размяшчалі па акружнасці. Да нашага часу кромлехі ў першапачатковым выглядзе не захаваліся. Таму высветліць адназначна іх прызначэнне досыць складана. Адны вучоныя лічаць, што кромлех з'яўляўся агароджаным месцам для правядзення разнастайных рытуалаў, у тым ліку ахвярапрынашэнняў. Другія вучоныя прытрымліваюцца меркавання, што кромлех будаваўся як абсерваторыя, у якой можна было назіраць за нябеснымі свяцiламі.

*Разгледзьце выявы мегалітаў, пададзеныя ў параграфе і электронным дадатку. Якое ўражанне зрабілі на вас гэтыя пабудовы? Прапануйце сваю тэорыю выкарыстання і ўзвядзення мегалітаў.*

***Кромлех Стоўнхендж.*** Кромлехі сустракаюцца ў розных краінах Еўразіі. Але найбольшую славу атрымаў *кромлех Стоўнхендж* у Англіі (Велікабрытанія).

Гіганцкае каменнае збудаванне заварожвае сваімі формамі. Шматтонныя камяні маюць вышыню ў два і больш чалавечыя росты. Рэканструкцыя мегаліта дазваляе ўявіць яго першапачатковы выгляд. Збудаванне мела форму круга з вертыкальна пастаўленых камянёў, на якіх ляжалі камяні-перамычкі. Па акружнасці мегаліт быў умацаваны двума землянымі валамі і ровам. У цэнтры размяшчалася алтарная пліта, акружаная двума кругамі камянёў. Алтар акружалі пяць *трылі́таў* — збудаванняў з трох камянёў, два з якіх служаць апорамі, а трэці — перамычкай.

*Удакладніце ў інфармацыйных крыніцах, якія існуюць гіпотэзы пра ўзнікненне Стоўнхенджа. Як гэта збудаванне выкарыстоўваюць у сучаснасці?*



Сучасны мастак Марк Энсці малюе Стоўнхендж



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Курганы — маўклівыя сведкі гісторыі.*** У першабытную эпоху важным было афармленне *месцаў пахавання* чалавека.

Калі-нікалі над магілай чалавека рабілі *курган* — насып з зямлі або камянёў. Курганы мелі форму паўсферы ці конуса. Размяшчаліся яны ў асноўным групамі: часам да 10–15 курганоў побач. Чалавек не размяшчаў курганы ў прасторы хаатычна, а прадумваў, як яны будуць звязаны з лесам, ракой, полем. Курганы сустракаюцца на ўсіх кантынентах, апрача Аўстраліі і Антарктыды. На тэрыторыі Беларусі першыя курганы з'явіліся ў бронзавым веку. Многія з іх нагадваюць доўгія земляныя валы, якія працягнуліся на дзясяткі метраў.

**Цікавы факт!**
У Мінску, у мікрараёне Паўднёвы Захад, да нашых дзён захаваўся курган дрыгавічоў. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя ў беларускай сталіцы налічвалася каля 70 курганоў.



Курган дрыгавічоў (X–XI стст.), Мінск

*Назавіце самыя вядомыя курганы, узведзеныя на тэрыторыі нашай краіны ў XX стагоддзі. З якімі памятнымі падзеямі было звязана іх з'яўленне?*

Архітэктуру невыпадкова называюць прамаці мастацтваў. Яна з'яўляецца не толькі вынікам творчасці, але і асновай для іншых відаў мастацтва.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Нямецкі філосаф XIX стагоддзя Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель пісаў: «Пачаткам мастацтва з'яўляецца архітэктура». Як вы думаеце, што меў на ўвазе вучоны?

2. Англійскі мастак XIX стагоддзя Джон Канстэбл стварыў дзівосную акварэль, дзе паказаў Стоўнхендж у час моцнай стыхіі. Як вы думаеце, што прывабіла Канстэбла ў руінах Стоўнхенджа? Пры дапамозе якіх мастацкіх сродкаў ён паказаў свае адносіны да гэтага помніка? А якімі фарбамі Стоўнхендж намалявалі б вы? Патлумачце свой адказ.



**Д. Канстэбл.** Стоўнхендж (1835)

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

У архітэктуры сучасных мемарыяльных комплексаў можна разгледзець адгалоскі старажытнай традыцыі курганоў. Напрыклад, мемарыяльны комплекс «Курган Славы» заклікае да асэнсавання памятных падзей мінулага — гераізму і мужнасці беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Гісторыя стварэння кургана ўнікальная: жыхары збіралі яго літаральна па жменях, прывозячы зямлю для яго збудавання з розных рэгіёнаў.

Правядзіце самастойнае даследаванне пра значэнне і сімволіку гэтага манумента. Звярніце ўвагу на форму кургана, яго памеры і размяшчэнне ў прасторы, а таксама на барэльефы і надпісы. Якім чынам гэтыя мастацкія элементы раскрываюць ідэйны змест Кургана Славы?



Мемарыяльны комплекс «Курган Славы», Смалявіцкі раён



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 3. МАСТАЦТВА ПЕРШАБЫТНЫХ ЧАСОЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Лад жыцця першабытных людзей у розных кутках планеты быў падобны. У той жа час у кожным рэгіёне склаліся і арыгінальныя формы творчага асэнсавання навакольнага свету. Свой след у мастацтве пакінулі і тыя першабытныя людзі, якія жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

***Мастацтва першых стаянак.*** На тэрыторыі нашай краіны было адшукана мноства стаянак каменнага веку. Пры раскопках знайшлі прадметы, якія маюць важнае значэнне для разумення таго, як развівалася мастацтва.

На стаянцы Бердыж археолагі знайшлі жыллё з костак мамантаў. У цэнтры жылля размяшчаўся ачаг. Каб узвесці такую пабудову з даступных матэрыялаў, усім насельнікам стаянак трэба было выканаць даволі складаныя работы. Магчыма, запатрабаванне старэйшага пакалення перадаваць досвед малодшым членам калектыву і стала пачаткам з'яўлення мастацкай творчасці.

Адны з самых ранніх твораў мастацтва, знойдзеных на стаянках на тэрыторыі Беларусі, — *падвескі з костак жывёл*. Гэтыя прадметы былі не проста аздабленнем касцюма. У іх выяўлялася імкненне чалавека абараніць сябе, набыць якасці, якія лічыліся неабходнымі



Стаянка Бердыж (каменны век). Макет. Чачэрскі гісторыка-этнаграфічны музей


Падвеска са сківіцы куніцы (каменны век)

для адважных паляўнічых, адказных за сваё племя. Верагодна, людзі думалі, што такія ўпрыгажэнні могуць перадаць чалавеку сілу, спрыт і шпаркасць звера.

*Чаму, на вашу думку, першымі ўпрыгажэннямі былі менавіта падвескі з костак жывёл?*

***Увасабленне вобраза чалавека.*** У прадметах мастацтва першабытныя мастакі імкнуліся паказаць *асаблівасці аблічча чалавека*. Яскравым прыкладам майстэрства ў адлюстраванні чалавека з’яўляюцца невялікія вырабы са стаянкі Асавец, знойдзенай у Віцебскай вобласці. Фрагмент твора з косткі — галава з падоўжаным авалам твару, даўгаватым носам, буйнымі вачыма. На тыльным боку вырабу маецца адтуліна для таго, каб насіць яго як амулет. Скульптурка з дрэва ўяўляе сабой суровы мужчынскі вобраз з вельмі выразнай мімікай. Ссунутыя бровы і сціснутыя вусны выдатна перадаюць яго характар.



Скульптурныя выявы са стаянкі Асавец (каменны век)

На месцы паселішча каля вёскі Азярное ў Мінскай вобласці была знойдзена костка, на якой выгравіравана фігура мужчыны з узнятымі рукамі. Ён быццам падскоквае ў танцы. Нага нібы наступае на фігурку, якая знаходзіцца ўнізе. На адваротным баку косткі размешчана яшчэ адна выява чалавека.

*Разгледзьце выявы чалавека, пададзеныя ў параграфе. Хто гэта, на вашу думку: абагульненыя вобразы супляменнікаў або грозныя багі?*


Гравіроўка на костцы (каменны век)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Змейка з рога
(каменны век)



***Увасабленне вобраза жывёлы.*** Не менш віртуозна майстры каменнага веку ўвасаблялі жывёл. На буйной птушынай костцы са стаянкі Азярное захаваўся толькі фрагмент выявы. Але і сёння можна ацаніць майстэрства разьбяра, які праз дакладныя лініі і кароткія рысачкі ўвасобіў звера, што імкліва бяжыць сярод зараснікаў.



Алень. Статуэтка
з косткі (каменны век)



Галава качачкі
(каменны век)



Выява жывёлы на
птушынай костцы
(каменны век)

Прадметы з выявамі жывёл былі знойдзены таксама на стаянцы Асавец. Статуэтка аленя выдатна перадае грацыёзную пластыку звера. Мастак любуецца яго велічнай постаццю.

Дакладна перададзены і вобраз качачкі. Мы бачым характэрны выгін шыі вадаплаўнай птушкі, які стварае вядомы сілуэт. Вытанчаная фігурка змейкі, пакрытая выразным узорам, мае невялікую адтуліну для нашэння ў якасці амулета. Гледзячы на гэтыя творы, мы разумеем, якіх звяроў людзі шанавалі ў старажытнасці.

*Як вы думаеце, чым адрозніваюцца і чым падобныя выявы жывёл, створаныя ў першабытную эпоху і выкананыя сучаснымі мастакамі?*

***Прыгажосць звычайных рэчаў.*** Важным адкрыццём каменнага веку стала вынаходства глінянага посуду. У тыя часы яго выраблялі ўручную. З мяккага доўгага глінянага жгута фармавалі вастрадонную або кругладонную пасудзіну, згладжвалі сценкі і ўпрыгожвалі іх арнаментам. Пакрывалі посуд дэкорам у выглядзе ямачак, ялінак, зігзагаў. Акрамя арнаментаў на керамічных вырабах сустракаліся і іншыя выявы, напрыклад вадаплаўных птушак.



Кераміка каменнага веку

У бронзавым веку з’явіліся прадметы з медзі і бронзы. Вядома, што яны выкарыстоўваліся разам з шырока распаўсюджанымі каменнымі вырабамі. Часцей за ўсё з бронзы выраблялі рытуальныя рэчы. Таму яны былі багата ўпрыгожаны і высока цаніліся. Цаніўся і «сонечны камень» — бурштын.



Бронзавая шпілька



Бронзавая сякера



Упрыгажэнні з бурштыну

*Чаму ў мастацкай культуры першабытнага грамадства найбольш шырокае распаўсюджанне атрымала менавіта дэкаратыўна-прыкладное мастацтва? Звярніцеся да электроннага дадатку.*

***Культура старажытных гарадзішчаў.*** У жалезным веку на беларускіх землях з’явіліся ўмацаваныя паселішчы — гарадзішчы. Гэта было звязана з назапашваннем каштоўнасцей у радавых супольнасцях. Як правіла, гарадзішчы будаваліся на ўзвышэннях або ў цяжкадаступнай балоцістай мясцовасці. Насельнікаў гарадзішчаў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Гарадзішча Нікадзімава (V–VII стст. н. э.). Макет. Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава

засцерагалі ад ворагаў надзейныя сцены з драўляных слупоў, якія агароджвалі пляцоўкі з жылымі і гаспадарчымі пабудовамі, месцы пахавання.

Побыт гарадзішчаў быў багаты і разнастайны. Знойдзеныя ў час археалагічных раскопак бранзалеты, падвескі, фі́булы, шпількі, кара́лі і сёння здзіўляюць дасканалай працай майстроў, якія валодалі рознымі тэхнікамі апрацоўкі металу і шкла. Цікавай знаходкай сталі і гліняныя цацкі ў выглядзе птушак і звяроў. Яны красамоўна расказваюць нам пра жыццё чалавека ў жалезным веку.



Бронзавая падвеска-лу́нніца з эмаллю



Завушніца з белага металу



Бронзавая падкова-падобная фібула з эмаллю



Шкляныя каралі



Цацка

*Паводле ладу жыцця першабытнае гарадзішча можна параўнаць з сучасным горадам. Назавіце рысы ў арганізацыі першабытнага гарадзішча, падобныя з тымі, што характэрны для населенага пункта, у якім жывяце вы.*

Нягледзячы на суровы лад жыцця, першабытныя людзі ўмелі бачыць прыгажосць і стваралі выдатныя рэчы, якія ўражваюць дагэтуль. Імкненне да гармоніі з навакольным светам і неверагодная назіральнасць — характэрныя рысы першабытнага мастацтва нашых далёкіх папярэднікаў.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Уважліва разгледзьце выявы твораў мастацтва першабытнай эпохі ў параграфе і электронным дадатку. Якія эмоцыі яны ў вас выклікаюць? Якія творы вам спадабаліся больш — выявы чалавека ці жывёл? Чаму?

2. Захаванне культурна-гістарычнай спадчыны — важная і пасяхова вырашальная задача суверэннай Беларусі. У артыкуле 54 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь замацаваны абавязак кожнага чалавека берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці. Гэту місію выконваюць краязнаўчыя музеі. Яны беражліва захоўваюць сведчанні мастацкай культуры і традыцый, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне.
Здзейсніце экскурсію ў краязнаўчы музей у вашай вобласці або наведайце афіцыйны партал «Музеі Беларусі» (museum.by). Звярніце ўвагу на творы першабытнай эпохі. Падзяліцеся атрыманымі ўражаннямі з аднакласнікамі.



Экспазіцыя ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі імя Е. Р. Раманава

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Сучасныя беларускія мастакі беражліва ставяцца да спадчыны мінулага. Напрыклад, Тамара Васюк стварае вырабы па матывах керамікі каменнага веку. Разгледзьце твор гэтага майстра. Намалюйце эскіз любога прадмета побыту для вашага дома, на якім таксама будзе прысутнічаць дэкор у стылістыцы першабытнага мастацтва.



**Т. Васюк.** Работа з серыі «Архаіка» (2009)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 4. ЯЗЫЧНІЦКАЯ КУЛЬТУРА НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

Да канца першага тысячагоддзя на беларускіх землях сфарміраваліся саюзы плямёнаў, кожны з якіх меў адметныя асаблівасці. Значную ролю ў фарміраванні беларускай культуры адыгралі тры племянныя аб'яднанні славян: крывічы, дрыгавічы, радзімічы.

***У што верылі старажытныя славяне?*** Славянская культура развівалася пад уплывам язычніцкіх вераванняў. Нашы продкі абагаўлялі сілы прыроды і верылі ў магутнасць шматлікіх багоў, якія гэтыя сілы ўвасаблялі. У плямёнаў, якія насялялі беларускія землі, быў пашыраны культ ушанавання продкаў, які адлюстраваўся ў складаных рытуалах пахавання.

Важнымі былі і абрады, звязаныя з земляробствам і зменай пор года. Яскравы прыклад такіх абрадаў — язычніцкія святы. Напрыклад, Каляды і Купалле прымеркаваны да зімовага і летняга сонцастаяння, а «Гуканне вясны» і «Багач» — да пачатку і заканчэння палявых работ.

З летапісаў і фальклору мы можам даведацца пра старажытных багоў: Перуна, Вялеса, Ярылу... Аднак гэта толькі адгалоскі міфалогіі. Сістэма старажытных вераванняў дайшла да нас фрагментамі. Асобныя элементы гэтай сістэмы мы можам убачыць у народным мастацтве. Напрыклад, у традыцыйных ткацтве і вышыўцы. Майстрыхі на палатне паўтараюць арнаментальныя ўзоры, якія дайшлі да нас з далёкага мінулага.



Фрагмент арнаменту традыцыйнага народнага тэкстылю

*Якія старажытныя народныя святы, звязаныя з пэўнымі каляндарнымі датамі, вы ведаеце? Раскажыце пра іх.*

***Славянскія свяцілішчы.*** Вялікае значэнне ў культуры старажытных славян мелі культавыя збудаванні. У свяцілішчах багам узносілі малітвы, прыносілі ахвяры з надзеяй на дапамогу і абарону. Для ўзвядзення такіх збудаванняў выбіралі месцы на берагах азёр і рэк, узвышшах, у глухіх лясах і на балотах, агароджвалі іх валамі і равамі. У свяцілішчах размяшчалі алтары-ахвярнікі, вогнішчы і ідалаў — выявы багоў.



Валуны на возеры Янава

Для стварэння свяцілішчаў выкарыстоўвалі велізарныя камяні — валуны. Гэта былі і асобныя вертыкальныя камяні, і камяні, размешчаныя ў вызначаным парадку. Выбар матэрыялу невыпадковы. Камяні, амаль не падуладныя часу, да нашых дзён захоўваюць тысячагадовыя таямніцы. На возеры Янава ў Полацкім раёне знаходзіцца комплекс з валуноў, якія лічацца парэшткамі старажытнага свяцілішча. Камяні размешчаны ў форме літары «П» і маюць асаблівы, чырванаваты колер.

Цэнтральнае месца ў старажытных свяцілішчах займалі ідалы. Гэта выявы свавольных і грозных багоў зямнога, нябеснага і падземнага светаў. У пачатку XX стагоддзя ў горадзе Слоніме была знойдзена скульптура,

**Цікавы факт!**
Захаваліся звесткі, што ў Мінску на рацэ Свіслач да пачатку XX стагоддзя існавала язычніцкае ка́пішча. Цяпер камень, які размяшчаўся на гэтым капішчы, знаходзіцца ў мінскім Музеі валуноў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Слонімскі ідал (X ст.)



Даўгінаўскі ідал (X ст.)

высечаная з шэра-чырвонага каменя, якая атрымала назву «Слонімскі ідал». У ёй рысы твару паказаны ўмоўна, без дэталёвай прапрацоўкі. Аднак сіла ўздзеяння старажытнага твора адчуваецца і сёння.

Некаторыя каменныя статуі мелі крыжападобную форму, якая нагадвала жаночую постаць з шырока раскінутымі рукамі. Напрыклад, адна з самых вядомых скульптур — *Даўгінаўскі ідал* — унікальная тым, што ў ёй спалучаюцца дзве фігуры. Сілуэт маленькага чалавека выбіты на большай фігуры і паўтарае яе абрысы.

*Навукоўцы лічаць, што Даўгінаўскі ідал увасабляе адну з багінь-заступніц урадлівасці, сям'і і шлюбу — Ладу або Мокаш. Як вы думаеце, на чым заснавана гэта здагадка?*

***Упрыгажэнні з курганоў.*** Уяўленні старажытных славян пра замагільны свет адлюстроўваюць *курганы*. У час раскопак археолагі знаходзяць у іх разнастайны посуд, прылады працы, ювелірныя ўпрыгажэнні. Тое, чым пры жыцці карыстаўся памерлы, нашы продкі імкнуліся змясціць у яго магіле. Кожнае са славянскіх плямёнаў мела свае традыцыі пахавання і набор упрыгажэнняў.




Упрыгажэнні са славянскіх курганоў

Для касцюма крывічанак характэрныя скроневыя кольцы простай формы, якія нагадваюць бранзалеты. Асаблівасцю іх касцюма былі вітыя шыйныя гры́ўні, шкляныя пазалочаныя кара́лі, трапецападобныя падвескі і металічныя бразготкі.

Адметнай рысай касцюма дрыгавічанак былі металічныя пацеркі, на якія напайваліся маленькія шарыкі — зерні. Такія пацеркі выкарыстоўвалі для скроневых кольцаў і іншых упрыгажэнняў.

Касцюм радзімічанак быў асабліва яркі. Яго ўпрыгожвалі рознакаляровыя каралі з металічнымі падвескамі, вельмі буйныя грыўні і самыя складаныя па форме скроневыя кольцы з сямю прамянямі.

*Разгледзьце ўпрыгажэнні, пададзеныя ў параграфе. Якія элементы гэтых упрыгажэнняў выкарыстоўваюцца ў сучасным ювелірным мастацтве?*

Язычніцкія вераванні старажытных славян знайшлі адлюстраванне ў прадметах мастацтва, збудаваннях і пахаваннях. Сілы прыроды, якім пакланяліся, паказаны ў вобразах магутных багоў. А рэчы, якія знаходзяць у курганах, «распавядаюць» пра жыццё нашых продкаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якое ўражанне на вас зрабілі старажытныя свяцілішчы і ідалы, пра якія ідзе гаворка ў параграфе і электронным дадатку?

2. Узор беларускай сялянкі Матроны Маркевіч «Узыход сонца», які яна вышыла ў 1917 годзе, размешчаны на Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь. Наша краіна адна з першых выкарыстала нацыянальны арнамент у якасці элемента сцяга.

Падумайце і выкажыце сваё меркаванне, чаму такая ўвага надаецца традыцыйнаму беларускаму арнаменту.



## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Выканайце ў групах эскіз ювелірнага ўпрыгажэння (бірулькі, цацкі) з элементамі першабытнага мастацтва, знойдзенага на беларускіх землях.

Раздзел 2

# МАСТАЦТВА, ЗАСТЫЛАЕ НА ТЫСЯЧАГОДДЗІ: СТАРАЖЫТНЫ ЕГІПЕТ



Тутанхамон з жонкай.
Упрыгажэнне спінкі трона з грабніцы Тутанхамона (XIV ст. да н. э.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 5. ІДЭІ ВЕЧНАГА ЖЫЦЦЯ Ў СТАРАЖЫТНАЕГІПЕЦКАЙ АРХІТЭКТУРЫ

Культура Старажытнага Егіпта — адна з найстарэйшых на Зямлі. У аснову большасці твораў старажытнаегіпецкага мастацтва пакладзена *ідэя вечнага жыцця*. Егіпцяне спадзяваліся, што мастацтва можа дапамагчы чалавеку яго здабыць. І найвялікшыя надзеі яны ўскладалі на архітэктуру — самае даўгавечнае мастацтва.

***Пірамiды Старажытнага Егіпта.*** Сярод маўклівага пясчанага свету пустыні егіпцяне ўзводзілі з каменю або высякалі ў скалах грандыёзныя збудаванні — *грабніцы*, каб яны стаялі вечна і надзейна абаранялі спакой памерлых.

Самыя вялікія пахавальні будавалі для валадароў Старажытнага Егіпта — фараонаў, якія, як лічылася, і пасля смерці працягвалі клапаціцца пра свой народ.

Многія грабніцы мелі форму *піраміды*. Першую піраміду пабудавалі для фараона Джосера. Яна мела ступеньчатую форму



Піраміда фараона Джосера ў Сака́ры (III тыс. да н. э.)



Вялікія піраміды ў Гізе (III тыс. да н. э.)

і складалася з шасці каменных платформ, пастаўленых адна на адну, якія ўтвараюць велічнае збудаванне вышынёй 60 метраў. Сваёй формай пахавальня нагадвае гіганцкую лесвіцу, па прыступках якой памерлы фараон мог падняцца на неба, у царства багоў. Такую форму стварыў Імхатэ́п — вучоны і архітэктар, якога пасля смерці егіпцяне абагавілі.

**Цікавы факт!**
Піраміды былі абліцаваны паліраванымі блокамі, таму на яркім сонцы іх паверхня блішчала.

Неўзабаве ў Старажытным Егіпце пачалі ўзводзіць піраміды з роўнымі гранямі. Так пабудаваны Вялікія піраміды ў Гі́зе. Падобныя ідэальныя геаметрычныя формы былі створаны ў архітэктуры ўпершыню. Самая высокая з пахавальняў — піраміда фараона Хеопса — дасягае 138,7 метра. А гэта вышыня 40-павярховага дома! Манументальная архітэктура егіпецкіх пірамід і сёння робіць на чалавека незабыўнае ўражанне.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Вялікі сфінкс (III тыс. да н. э.)

Побач з Вялікімі пірамідамі знаходзіцца *Вялікі сфінкс*. Гэта скульптурны партрэт фараона Хефрэ́на ў вобразе фантастычнай істоты з целам ільва і галавой чалавека. Так егіпцяне ўвасобілі боскую моц свайго валадара як абаронцы Егіпта. Піраміды і сфінксы сімвалізавалі стабільнасць і непахіснасць старажытнаегіпецкай дзяржавы.

*Разгледзьце выявы помнікаў старажытнаегіпецкай архітэктуры ў параграфе і электронным дадатку. Якія з іх вы хацелі б убачыць наяве? Чаму?*

***Старажытнаегіпецкія храмы.*** У старажытнасці егіпцяне ўзводзілі мноства разнастайных *храмаў*. Яны прысвячаліся багам.

Сваёй урачыстасцю здзіўляюць *скальныя храмы* — свяцілішчы, высечаныя ў скальным масіве. У іх здзяйсняліся службы ў гонар памерлых і абагаўлёных фараонаў, а таксама старажытнаегіпецкіх багоў.

Шмат стагоддзяў таму быў высечаны ўнікальны памінальны храм царыцы Хатшэпсу́т, жанчыны-фараона. Па сваёй форме,

Кідаецца сэрца маё туды і назад, думаючы, што ж скажуць людзі, тыя, што ўбачаць помнікі, мной створаныя, праз гады, і будуць гаварыць пра тое, што я здзейсніла. Не кажы, што гэта пахвальба, але скажы: «Як падобна гэта да яе [яе вялікасць Хатшэпсут], як варта бацькі яе [бога Амона]».

*Надпіс на абеліску Хатшэпсут*

памерах і ўпрыгажэннях пахавальня перасягнула падобныя старажытнаегіпецкія збудаванні. Храм складаецца з трох манументальных тэрас, размешчаных адна над адной і злучаных вялізнымі па́ндусамі. Пахавальны комплекс пабудаваны ля падножжа скал, якія служаць уражальным фонам для ўсяго архітэктурнага збудавання і ўтвараюць з ім гарманічнае цэлае.



Памінальны храм Хатшэпсут (XV ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Храм Рамсеса II у Абу-Сімбеле (II тыс. да н. э.)

Такімі ж велічнымі выглядаюць і скальныя храмы ў Абу́-Сімбе́ле. Вялікі храм быў створаны ў гонар фараона Рамсеса II, а малы — у гонар яго жонкі Нефертá́ры. Каля ўвахода ў вялікі храм высяцца чатыры сядзячыя 20-метровыя статуі ў аблiччы фараона — *калосы*. Галава кожнай гіганцкай скульптуры дасягае чатырох метраў!

Храм з'яўляецца найвялікшым узорам не толькі старажытнаегіпецкага дойлідства, але і навуковай думкі. Дзякуючы неверагодна дакладным вылічэнням астролагаў усяго двойчы ў год прамяні ранішняга сонца дасягаюць статуй у паўзмрочных храмавых памяшканнях. Некалькі хвілін яны асвятляюць твары статуй, але даўжэй за ўсё затрымліваюцца на твары фараона Рамсеса II.

**Цікавы факт!**
У 1959 годзе, пры будаўніцтве плаціны, з'явілася небяспека затаплення храмавага комплексу ў Абу-Сімбеле. У выратаванні помніка прынялі ўдзел больш за 60 краін. Храмы былі распілаваны на блокі, перанесены ў бяспечнае месца і сабраны зноў. Таму сёння гэты храмавы комплекс называюць народжаным двойчы.



Храм Амóна-Ра ў Луксоры (II тыс. да н. э.)

Грандыёзныя храмавыя комплексы былі пабудаваны егіпецкімі дойлідамі ў *Луксóры* і *Карнáку*. Злучаныя доўгай алеяй сфінксаў-двайнят, яны ўтвараюць выдатны архітэктурны ансамбль, які ўключае шматкалонныя залы, свяцілішчы, унутраныя двары. Каля ўвахода ў храм стаялі *абелíскі* — гранёныя слупы, якія звужаліся ўгору. Іх верхавіны пакрывалі золатам, каб яны ззялі на сонцы. Так егіпцяне ўвасаблялі ў архітэктуры ідэю сонечнага праменя.

Выразныя формы, прыдуманыя старажытнаегіпецкімі архітэктарамі, — піраміда, абеліск — выкарыстоўваюцца ў мастацтве і сёння. У канцы XX стагоддзя ў выглядзе піраміды быў перабудаваны ўваход у музей Луўра ў Парыжы. А колькі абеліскаў упрыгожваюць плошчы самых розных гарадоў свету! У Егіпце яны выяўлялі ідэю ўслаўлення жыцця, яго перамогі над смерцю, а ў наш час гэта яшчэ і памятны знак.

*Разгледзьце выявы старажытнаегіпецкіх храмаў у параграфе і электронным дадатку дэталёва. Якое ўражанне на вас зрабілі каласальныя памеры гэтых архітэктурных збудаванняў? Як памеры збудаванняў адлюстроўваюць ідэю велічы егіпецкіх багоў і неўміручасці фараонаў?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Мастацтва старажытных егіпцян было цесна звязана з рэлігіяй. Галоўнымі тыпамі архітэктурных пабудоў у Старажытным Егіпце з'яўляліся грабніцы і храмы. Іх узводзілі на стагоддзі. Бо сваімі манументальнымі формамі яны ўвасаблялі надзею чалавека на вечнае жыццё.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Вялікія піраміды ў Гізе — спадчына ўсяго чалавецтва. У інфармацыйных крыніцах знайдзіце падрабязныя звесткі пра памеры гэтых збудаванняў. Як вы думаеце, чаму адну з іх — піраміду Хеопса — лічаць першым цудам свету? Якія асаблівасці старажытнаегіпецкіх грабніц дазволілі з'явіцца арабскай прыказцы «Усё на свеце баіцца часу, а час баіцца пірамід»?

2. Старажытнаегіпецкія абеліскі, гранёныя слупы, якія звужаюцца ўгору, сімвалізавалі прамяні Сонца — крыніцу жыцця, што дарує святло і цеплыню. У наш час абеліскі захавалі сваю манументальнасць і выразнасць, але набылі новы сэнс. Сёння яны ўспрымаюцца як сімвалы веліччы, памяці, гісторыі. Напрыклад, абеліск на плошчы Перамогі ў горадзе Мінску ўвекавечыў памяць пра подзвіг беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.
Успомніце, ці ёсць у вашым рэгіёне (пасёлку, горадзе) збудаванні ў форме абеліска. Раскажыце пра іх. Якім памятным падзеям яны прысвечаны?




Абеліск на плошчы Перамогі, г. Мінск (1954)

Да егіпецкай тэматыкі мастакі звярталіся ва ўсе часы. У пачатку XX стагоддзя ў Санкт-Пецярбургу быў пабудаваны дом, які ў народзе прazвалі Егіпецкім. Разгледзьце дэталі фасада будынка. Пералічыце элементы, якія дазволілі назваць дом менавіта так. Чаму традыцыі старажытнаегіпецкага мастацтва прыцягваюць увагу мастакоў наступных пакаленняў? Прыдумайце свой варыянт выкарыстання старажытнаегіпецкіх матываў у сучаснай архітэктуры Беларусі. Паспрабуйце расказаць пра яго ў даступнай форме (эскізны малюнак, апавяданне).



**М. Сангайла**. Даходны дом А. І. Няжынскай (Егіпецкі дом), Расія (1911–1913)

# § 6. СЮЖЭТЫ І ВОБРАЗЫ Ў ВЫЯЎЛЕНЧЫМ МАСТАЦТВЕ СТАРАЖЫТНАГА ЕГІПТА

Егіпцяне верылі, што выявы чалавека і навакольнага свету ажывуць у замагільным царстве. Таму ўсё, што хацелася перанесці ў вечнае жыццё, адлюстроўвалі на сценах грабніц з дэталёвай прарысоўкай і захоўвалі ў скульптурных вобразах. Лічылася, што менавіта мастацтва дорыць чалавеку магчымасць вечна жыць у замагільным свеце, а мастак, ствараючы, займаецца свяшчэннадзействам.

***Канон у старажытнаегіпецкім мастацтве.*** Егіпцяне адлюстроўвалі чалавека не такім, якім яго бачылі ў жыцці, а так, як было



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



**Хесіра.** Рэльеф (ІІІ тыс. да н. э.)

патрэбна паводле *канона* — адмысловых правіл адлюстравання. Фігуру чалавека імкнуліся паказаць цалкам: ад пятак да макушкі. Бо ў вечным жыцці ўсё ўвасобіцца менавіта так, як адлюстравана. Чалавек, увасоблены бокам, адродзіцца з адным плячом і адной рукой, а калі па пояс — будзе без ног! Таму чалавечую фігуру паказвалі так, каб кожная частка цела была бачная цалкам: галаву і ногі — у профіль, тулава — анфас.

Фараон на выявах заўсёды выглядае вышэй за ўсіх ростам і не як просты смяротны, а як сын бога: моцны і прыгожы. Так падкрэслівалі яго значнасць і статус. Багоў звычайна ўвасаблялі «зверагаловымі»: з тулавам чалавека і галавой жывёлы.

*Разгледзьце рэльефныя і жывапісныя выявы чалавека ў параграфе і электронным дадатку. Як вы думаеце, чаму мастакі на іх тварах не паказвалі эмоцый?*

***Сюжэты і вобразы ў жывапісе.*** Роспісы і рэльефы падрабязна расказваюць нам пра штодзённае жыццё, адпачынак і рэлігійныя абрады старажытных егіпцян.

Адзін з распаўсюджаных сюжэтаў у старажытнаегіпецкім мастацтве — фараон або вяльможа на паляванні, які трапляе дзідай ці стралой з лука ў дзікіх звяроў. Часта малявалі і весляра, які плыве ў ладдзі па Ніле сярод зараснікаў. Менавіта такія вобразы мы бачым на фрэсцы з грабніцы вяльможы Небамона.

Майстар не проста адлюстраваў працэс палявання, а паказаў чалавека ў дзівосна багатым прыродным асяроддзі. Тут і лотасы, і птушкі, і рыбы… З’яўленне паляўнічага ў суправаджэнні жонкі і дачкі прывяло ў рух увесь птушыны свет.

Паляванне ў зарасніках папірусу. Роспіс з грабніцы вяльможы Небамона (II тыс. да н. э.)



Мастакі часта адлюстроўвалі простых людзей, якія працуюць на палях, у рамесных майстэрнях, у гаспадарскіх дамах. Кананічнасць пастаў у іх выявах не была абавязковай. Галоўнае — перадаць у рухах фігур найбольш характэрныя рысы той ці іншай працоўнай дзейнасці.



Кармленне антылоп. Роспіс з грабніцы фараона Хнумхатэпа II (II тыс. да н. э.)

*Разгледзьце выявы, пададзеныя ў параграфе і электронным дадатку. Назавіце асноўныя тэмы і сюжэты жывапісу Старажытнага Егіпта. Якія з іх прыцягнулі вашу ўвагу? Чаму?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Скульптурны партрэт.*** Пры стварэнні скульптур мастакі таксама прытрымліваліся канона. Для адлюстравання чалавека егіпцяне спецыяльна выбіралі паставы, якія не прадугледжвалі руху. Звычайна гэта сядзячая або стаячая фігура з высунутай наперад левай нагой, абсалютна прамой спінай і амаль поўнай сіметрыяй цела.



Статуя пісца Каі
(ІІІ тыс. да н. э.)

Партрэтная статуя памерлага знаходзілася амаль у кожным магільным склепе. Прычым аблічча чалавека ўзнаўлялася з максімальна магчымым падабенствам. Яскравы прыклад таго — статуя пісца Ка́і. Скульптар праўдзіва перадаў пачціва-стрыманы і вельмі засяроджаны вобраз пісца, які сядзіць са скрыжаванымі нагамі і трымае перад сабой разгорнуты скрутак *папі́руса*. На яго твары непарушны спакой.

*Патлумачце, чаму скульптурныя выявы старажытных егіпцян называюць «крокамі ў вечнасць».*



***Мастацкі канон у эпоху фараона Эхнатона.*** Каноны ў старажытнаегіпецкім мастацтве існавалі тысячагоддзямі ў нязменным выглядзе. Аднак у перыяд кіравання Аменхатэ́па IV (Эхнато́на) строгія правілы былі парушаны. Фараон стаў патрабаваць ад мастакоў больш праўдзіва адлюстроўваць яго самога і эпізоды з жыцця царскай сям'і. У творах з'явілася больш душэўнай адкрытасці вобразаў.

Статуя вяльможы Ранафе́ра
(ІІІ тыс. да н. э.)



Эхнатон з сям'ёй. Рэльеф (XIV ст. да н. э.)

У гэтым сэнсе асабліва ўражваюць сцэны, якія паказваюць Эхнатона ў коле сям'і — як ласкавага мужа і бацьку. На адным з рэльефаў ахінуты промнямі сонечнага бога Атона ўладар Егіпта трымае на руках і цалуе сваю дачку. Ніколі больш егіпецкія фараоны не адважваліся так адкрыта дэманстраваць у творах мастацтва свае пачуцці.

Адным з шэдэўраў старажытнаегіпецкага мастацтва з'яўляецца бюст царыцы Неферці́і — жонкі Эхнатона. Прыгажосць гэтай жанчыны ўвекавечыў майстар Ту́тмес. Ідэальныя рысы яе твару ён удала дапоўніў высокай каронай і масіўнымі каралямі, якія былі ярка распісаны. Такое шматколернае абрамленне падкрэсліла жаноцкасць і грацыёзнасць царыцы. Строгую веліч аблічча Неферціці змякчыла ледзь прыкметная ўсмешка, якая кранула куткі выдатна акрэсленых вуснаў. А погляд з-пад напаўапушчаных павекаў дадаў вобразу таямнічасці.



**Тутмес.** Бюст царыцы Неферціці (XIV ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Пасля смерці Эхнатона ў мастацтве зноў пачаў панаваць традыцыйны мастацкі канон.

*Бюст царыцы Неферціці — адзін з самых выдатных скульптурных партрэтаў, створаных ва ўсе часы. І сёння людзі лічаць яго ўзорам жаночай прыгажосці. Як вы думаеце, чаму?*

Старажытныя егіпцяне верылі, што мастацтва можа падараваць неўміручасць. Толькі для гэтага ўсе выявы трэба было ствараць так, як патрабаваў старажытны канон. У перыяд праўлення фараона Эхнатона мастацтва стала развівацца больш свабодна, але канон усё ж не быў адменены поўнасцю. Традыцыі і вераванні ў культуры Старажытнага Егіпта заўсёды мелі вызначальную ролю.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Падумайце, як развівалася б мастацтва Старажытнага Егіпта, калі б новаўвядзенні Эхнатона не адмянілі.

2. З мэтай папулярызацыі беларускай культуры ў нашай краіне праводзяцца шматлікія мерапрыемствы. Сярод іх быў адзначаны ўнікальны праект «Беларуская Неферціці». Аўтары звярнулі ўвагу на падабенства велічных галаўных убораў старажытных егіпцян з на́міткай — беларускім галаўным уборам. Упрыгожана скульптура арнаментам. Што новага ў вобраз вечнай прыгажосці прыўнеслі беларускія аўтары?



**Г. Інькова, Т. Стасевіч.** Беларуская Неферціці. Фрагмент (пачатак XXI ст.)

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Выканайце сілуэтны малюнак чалавека, прытрымліваючыся традыцый старажытнаегіпецкага канона.

# § 7. ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА ЕГІПТА

Майстры-рамеснікі Старажытнага Егіпта валодалі сакрэтамі апрацоўкі розных матэрыялаў: каменю, дрэва, металаў, гліны, шкла. Старажытныя ўмельцы з вялікім майстэрствам выраблялі розныя прадметы. Большасць з іх выкарыстоўвалася ў хатнім ужытку, некаторыя ж служылі атрыбутамі для свяшчэнных цырымоній або насілі магічны характар.

***Камень у мастацтве егіпцян.*** Камень выкарыстоўваўся ў Старажытным Егіпце не толькі для будаўніцтва маштабных збудаванняў — грабніц і храмаў, але і для вырабу невялікіх прадметаў: пасудзін рознай формы, статуэтак, лямпаў, саркафагаў. Вырабы, знойдзеныя ў пахавальнях знатных асоб, павінны былі служыць памерлым пасля смерці, таму яны ўпрыгожваліся ў адпаведнасці з уяўленнямі пра замагільнае жыццё, а таксама праслаўлялі вяльможаў і фараона.

Напрыклад, з каменю егіпцяне выраблялі *палéткі* — невялікія пліткі для расцірання фарбаў. Верагодна, на палетках змешвалі ўжо падрыхтаваны фарбавальны парашок з раслінным клеем. Падрыхтаваны састаў выкарыстоўваўся ў цырымоніях, звязаных з пахаваннем або святам у гонар фараона.



Палетка чатырох гіен (IV тыс. да н. э.)



Канопы Старажытнага Егіпта (VI ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Палеткі мелі нескладаную форму. Часцей за ўсё абрысы гэтага прадмета нагадвалі жывёл — слана, чарапаху, рыбу, гіпапатама. На палетцы чатырох гіен цэнтрам кампазіцыі з'яўляецца круг, у якім расціраліся фарбы. Яго апраўляюць фігуры гіен, пантэры і гепарда са змяінай шыяй.

*Чаму рамеснікі Старажытнага Егіпта нават у рытуальных прадметах выкарыстоўвалі формы жывёльнага свету?*

***Шкляныя і керамічныя вырабы старажытнаегіпецкіх майстроў.*** Сярод разнастайнасці формаў керамікі вылучаюцца *кано́пы* — посуд для пахавання. Вырабляліся яны з шараватай гліны. Паверхня каноп, хоць і шліфавалася, захоўвала грубасць. Тулава пасудзін паступова пашыралася ўгору, іх накрыўкі мелі форму галоў фараона або жывёл — тых, у вобразе якіх егіпцяне ўяўлялі багоў.

З адкрыццём *фаянсу* форма керамічных вырабаў стала больш разнастайнай. Дзякуючы пластычнасці матэрыялу фаянсавыя вырабы мелі больш складаную форму. Сярод іх былі не толькі пасудзіны для свяшчэнных цырымоній і штодзённага карыстання, але і статуэткі, пацеркі, каралі, фігурныя вазы. З фаянсу выраблялі таксама плітку для ўпрыгожвання палацавых памяшканняў.

Паверхню фаянсавых вырабаў упрыгожвалі рэльефамі і пакрывалі тонкім слоем палі́вы са шклопадобнай масы. Адценні палівы ўражвалі разнастайнасцю. Упадабаным колерам егіпцян быў бірузовы або блакітны. Фаянс атрымліваюць пры абпале сумесі гліны, пяску, вапны і інш.



Фаянсавая качачка
(305–30 гг. да н. э.)



Фаянсавая статуэтка
(XXX–XXVI стст. да н. э.)



Фаянсавы кубак
(XI–VII стст. да н. э.)

У Старажытным Егіпце ведалі таямніцу вырабу шкла. З гарачай напаўпразрыстай шкляной масы майстры выцягвалі тонкую нітку і намотвалі яе на гліняную аснову. Рознакаляровыя хвалістыя лініі — адметная асаблівасць егіпецкіх пасудзін для духмяных рэчываў. Шкло было вельмі дарагім. З яго выраблялі нават элементы ювелірных упрыгажэнняў.



Шкляная пасудзіна
ў выглядзе рыбы
(XIV ст. да н. э.)

*Вырабы з якіх матэрыялаў, вядомых майстрам Старажытнага Егіпта, можна знайсці ў інтэр'ерах жылля сучаснага чалавека? Чым гэтыя вырабы адрозніваюцца ад старажытнаегіпецкіх?*

***Ювелірнае мастацтва і ўпрыгажэнні.*** Упрыгажэнні ў Старажытным Егіпце былі важнай часткай касцюма любога чалавека. Бранзалетам, пярсцёнкам, нагрудным упрыгажэнням надавалі магічнае значэнне. Упрыгажэнні з золата, срэбра, шкла, каштоўных і паўкаштоўных камянёў былі прывілеяй вярхоўных асоб — фараонаў і вышэйшай знаці.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Выраб *галаўных упрыгажэнняў* — дыядэм, стужак, ланцужкоў са скроневымі кольцамі — патрабаваў асаблівага майстэрства. На аснову ўпрыгажэння напайваліся дэталі ў форме кветак, пёраў, жукоў-скарабеяў ці кругавых элементаў, якія сімвалізуюць сонца. Царскую карону ўпрыгожвала фігурка ў выглядзе галавы змяі, што сімвалізавала багіню-заступніцу Егіпта.

*Нагрудныя ўпрыгажэнні* былі шырокія і масіўныя. Галоўным упрыгажэннем-амулетам старажытнага егіпцяніна былі *кара́лі-каўнер*. Іх спляталі ў некалькі радоў з пацерак розных колераў, формаў і памераў. Прыдворныя майстры-ювеліры выраблялі каралі з залатых пласцін, паўкаштоўных камянёў, шкляных або фаянсавых пацерак.

Залатыя вырабы, сярод якіх былі завушніцы, пярсцёнкі, бранзалеты, упрыгожваліся каляровымі пастамі, эмалямі, каштоўнымі камянямі і каляровым шклом. Розныя тэхнікі дэкору: гравіроўка малюнка, траўленне з дапамогай хімічных рэчываў, пайка дробных залатых зярнятак (зерні) на аснову — рабілі вырабы прывабнымі і ўнікальнымі.

Ювеліры стваралі з золата і пахавальныя маскі. Залатая маска фараона Тутанхамона выканана на высокім узроўні майстэрства.



Каралі-каўнер (XIV ст. да н. э.)



Залатая маска Тутанхамона (II тыс. да н. э.)



Бранзалет
(1880 г. да н. э.)



Бранзалет
фараона
Рамсеса II
(XV ст. да н. э.)

Яна дакладна перадае асаблівасці царскага касцюма і адрозніваецца багаццем колераў і мастацкіх тэхнік.

*Разгледзьце выявы вырабаў ювеліраў Старажытнага Егіпта. Якія колеры былі ўлюбёнымі ў старажытных майстроў? Даведайцеся, што сімвалізуе кожны колер.*

***Драўляная мэбля.*** Рэдкія пароды дрэва лічыліся каштоўным матэрыялам у Старажытным Егіпце і выкарыстоўваліся для вырабу мэблі. Знойдзеныя археолагамі ў грабніцах узоры драўлянай мэблі дэманструюць высокае майстэрства старажытных егіпцян не толькі ў разьбе, але і ў дэкаратыўным аздабленні прадметаў. Куфэркі, троны, ложкі, крэслы фараонаў упрыгожваліся золатам, каляровымі пастамі, слановай косцю, шклом і каштоўнымі камянямі.



Трон Тутанхамона
(XIV ст. да н. э.)

Трон фараона Тутанхамона, знойдзены ў яго грабніцы, выкананы з дрэва, пакрытага найтанчэйшымі лістамі золата. Яго падлакотнікі ўпрыгожваюць фігуры крылатых змей. На спінцы трона размешчаны каляровы рэльеф з кранальнай сцэнай размовы Тутанхамона з юнай жонкай пад ззяннем сонца — бога Атона, прамяні якога завяршаюцца далонямі. Пярэднія ножкі вырабу ўпрыгожаны разны́мі выявамі львіных галоў, іх форма нагадвае лапы гэтай жывёлы. У Старажытным Егіпце гэта было асаблівасцю драўлянай мэблі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Егіпта адрозніваецца найвышэйшым майстэрствам вырабу прадметаў для штодзённага жыцця чалавека. З дапамогай унікальных тэхналогій апрацоўкі матэрыялу егіпцяне здолелі зрабіць прадмет не толькі зручным, але і прыгожым. Гэтыя тэхналогіі і сёння служаць узорамі для пераймання.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце творы мастацтва, прапанаваныя ў параграфе і электронным дадатку. Які эмацыянальны водгук выклікаюць у вас шэдэўры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва? Назавіце сюжэты і формы, якія пераважалі ў творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Старажытнага Егіпта.

2. Ювелірныя ўпрыгажэнні Старажытнага Егіпта — крыніца натхнення для сучасных майстроў. Мадэльеры, дызайнеры ўпрыгажэнняў, у тым ліку беларускія, з задавальненнем выкарыстоўваюць у сваёй творчасці матывы старажытнаегіпецкага мастацтва. А якія ідэі егіпцян бачыце вы ў сучасных ювелірных упрыгажэннях — бранзалетах, каралях, завушніцах?



Пектараль «Месяцавая ладдзя, што плыве па возеры з лілеямі» (XIV ст. да н. э.)



**А. Рагальская.** Падвеска, Мінск

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

У многіх творах бачны ўплыў старажытнаегіпецкіх традыцый. Выканайце эскіз твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (посуд, мэбля) для вашага дома, класа, школы ў стылістыцы старажытнаегіпецкага мастацтва. Падумайце, якую форму і матэрыял вы выбераце для ўвасаблення сваёй ідэі.

# § 8. ЗАГАДКІ СТАРАЖЫТНАГА ЕГІПТА: ЛІТАРАТУРА І МУЗЫКА

Старажытнаегіпецкая літаратура — адна з найстарэйшых на зямлі. Многія навукоўцы лічаць яе першай літаратурай у сусветнай культуры.

***Вытокі літаратуры.*** З'яўленне літаратуры звязваюць з вераваннямі старажытных егіпцян. З аднаго боку, з верай у шматлікіх міфалагічных персанажаў, з іншага — у боскасць царскіх асоб (фараонаў). Гэтыя вераванні і вызначылі тэмы, сюжэты і вобразы старажытнаегіпецкай літаратуры.

**Уяўленні старажытных егіпцян пра светабудову**

**Першы цыкл міфаў — пра бога Ра**

Ра — бог сонца. У шматлікіх міфах ён выступае вярхоўным богам, стваральнікам свету і людзей. Штораніцы Ра плыве па небе ў залатой лодцы і назірае за тым, што адбываецца на зямлі. Ён усё бачыць і ўсё ведае... Увечары ўжо ў іншай лодцы ён плыве па падземнай рацэ, пераадольваючы небяспеку. А раніцай зноў з'яўляецца на небасхіле, быццам дазваляючы свету развівацца. З бога Ра пачынаецца свет — змена пор года, дня і ночы. Бог Ра ўвенчвае сабой светабудову егіпцян.

**Другі цыкл міфаў — пра бога Асірыса**

Зямлю ўвасабляе бог Асірыс. Загубіў яго брат Сэт — бажаство гарачай пустыні. Выратавала Асірыса яго няўцешная жонка Ісіда. Пасля ўваскрашэння бог Асірыс стаў уладаром і суддзёй у царстве мёртвых.

Бога Асірыса малявалі як чалавека з зялёным тварам. Як і ўвесь раслінны свет, ён штогод памірае і адраджаецца.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Трэці цыкл міфаў — пра падземнае царства**

Чалавек пасля смерці трапляе ў падземнае царства на суд бога Асірыса, дзе паведамляе пра тое, як ён жыў. Затым на адмысловых шалях узважваецца сэрца памерлага, якое сімвалізуе яго сумленне. На адной чашы — сэрца, на другой — пяро багіні праўды Маат. Калі сэрца чалавека пераважыць праўду, значыць, ён вёў грэшнае жыццё. І суд Асірыса выносіў свой вердыкт.



«Суд Асірыса» з «Кнігі мёртвых» (IV–I стст. да н. э.)

Міфалогія была надзвычай важнай для егіпцян. Мастацкія пераказы міфаў занялі важнае месца і ў літаратуры. Асаблівай папулярнасцю карысталіся пераказы міфаў пра стварэнне ўсяго жывога на Зямлі і пра вечнае жыццё.

З захаваных старажытнаегіпецкіх *гімнаў і павучанняў* мы даведваемся пра тое, як егіпцяне шанавалі сваіх багоў і фараонаў, вучыліся мудрасці, натхняліся сілай.

*Прачытайце ўрывак з прысвячэння Сямі Хатхор* уголас. Паспрабуйце зрабіць гэта як мага больш выразна. Якое стаўленне ў старажытных егіпцян было да музыкі і музычных інструментаў?*

---

* *Хатхор* — старажытнаегіпецкая багіня неба, радасці, урадлівасці, весялосці і танцаў.

Мы воздаём хвалу тебе.
Ведь ты владычица скипетров,
Владычица ожерелья и систра,
Владычица музыки,
Которая звучит для тебя.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ведь ты владычица ликованья, повелительница пляски,
Ты владычица музыки, повелительница игры на арфе,
Ты владычица хороводов, повелительница плетенья венков,
Ты владычица благовоний, повелительница танцев.

*(Пер. А. Ахматовой)*

***Старажытнаегіпецкія апавяданні і казкі.*** Папулярнымі літаратурнымі жанрамі ў Старажытным Егіпце былі *апавяданні* і *казкі*.

«Апавяданне Сінухё» — найстаражытнейшы з твораў, што захаваліся. У ім апавядаецца аб прыгодах вяльможы Сінухё, які з’ехаў з Егіпта і здзейсніў мноства подзвігаў. Але, сумуючы па радзіме, ён шукае магчымасць вярнуцца. Гэта аповед пра тое, што чалавек заўсёды імкнецца вярнуцца ў сваю краіну, да сваіх звычаяў і гісторыі.

...Итак, отправляйся в Египет! Узришь ты подворье, в котором вырос, облобызаешь землю у Великих Врат и соединишься с царскими друзьями.

*Рассказ Синухё.*
*(Пер. М. Коростовцева)*

...Тогда спустился я к берегу, туда, где стояло судно, и окликнул людей, которые были на нём. И воздал я хвалу владыке этого острова, и моряки на судне — также. И двинулись мы на север...

*Сказка о потерпевшем кораблекрушение.*
*(Пер. Е. Максимова)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Карабель пад ветразямі. Роспіс з грабніцы Каема́нха ў Гізе (III тыс. да н. э.)

Найбольш вядомы прыклад старажытнаегіпецкай казкі — «Казка пра пацярпелага караблекрушэнне». Мараплавец распавядае пра крушэнне карабля, сваё выратаванне, жыццё на незаселеным востраве і шчаслівае вяртанне на радзіму.

*Як вы думаеце, ці зразумелыя сюжэты старажытнаегіпецкіх гісторый сучаснаму чалавеку? Чаму?*

***Музыка Старажытнага Егіпта.*** Жыхары Старажытнага Егіпта любілі музыку. Мы даведваемся пра гэта з выяў музыкаў і музычных інструментаў. А дзякуючы археалагічным раскопкам мы можам паглядзець на інструменты і, магчыма, зразумець характар музыкі.

Егіпет быў краінай, дзе з’явіліся першыя прафесійныя музыканты. Яны служылі пры палацах фараонаў, жрацоў, знатных людзей, якія трымалі свайго роду капэлы і аркестры. Гэта відаць па выявах вялікіх груп музыкаў, што граюць перад вяльможамі. Музыка суправаджала і культавыя абрады. Па знойдзеных у грабніцах роспісах відаць, што ігра на музычных інструментах уваходзіла таксама ў абавязкі жрацоў.



Фрагмент роспісу «Музыкі» з грабніцы Рэхміра, Фівы (XV ст. да н. э.)

Па выявах можна прасачыць, як змяняўся знешні выгляд асобных музычных інструментаў. Напрыклад, па фрэсках, знойдзеных у розныя перыяды, відаць, як арфа з немудрагелістага лука ператваралася ў даволі дасканалы музычны інструмент. У далейшым арфа, флейта і лютня сталі найбольш распаўсюджанымі інструментамі ў Старажытным Егіпце.

*Параўнайце старажытнаегіпецкія і сучасныя музычныя інструменты (арфа, флейта, лютня), апісанне якіх даецца ў параграфе і электронным дадатку. Знайдзіце некалькі адрозненняў.*

У Старажытным Егіпце ўзнікла адна з самых старажытных пісьмовых культур. Літаратура гэтага перыяду дае нам магчымасць разгадаць таямніцы міфалагічных уяўленняў егіпцян, дапамагае даведацца пра культуру гэтай дзіўнай цывілізацыі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пералічыце жанры старажытнаегіпецкай літаратуры, да якіх звяртаюцца сучасныя пісьменнікі.

2. У Старажытным Егіпце існавала жэставае абазначэнне нот. Рухамі кісці і пальцаў дырыжор кіраваў хорам ці ансамблем, паказваў ноты, напрамак мелодыі, тэмп, рытм. Жэставыя рухі выкарыстоўваюцца ў музычных школах і сёння.
Разгледзьце ілюстрацыю ніжэй. Паўтарыце рухі кісці і пальцаў егіпецкіх музыкаў. Ці знаёмыя вам гэтыя знакі? Прыдумайце свае жэставыя абазначэнні нот.



Фрагмент роспісу «Музыкі», Фівы (XV ст. да н. э.)

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

У сярэдзіне XX стагоддзя быў знойдзены незвычайны егіпецкі нотны запіс. Навукоўцы лічаць, што колер кружка азначае струну, а велічыня — працягласць гуку. Паспрабуйце, гледзячы на фрагмент пергаменту, прастукаць рытм, зафіксаваны з дапамогай кружкоў.



Пергамент з егіпецкім нотным запісам (V–VII стст. н. э.)

# § 9. ТВОРЧЫ ЎРОК.
# СТАРАЖЫТНАЕГІПЕЦКАЯ ПІСЬМЕННАСЦЬ

Зараджэнне старажытнаегіпецкай пісьменнасці звязана са з'яўленнем малюнкавага пісьма — *піктагра́фіі*. У кожнага слова было сваё абазначэнне-малюнак. Да нашага часу добра захаваўся ўзор такога пісьма — *палетка Нарме́ра*. Лічыцца, што выявы на палетцы — адзін з ранніх узораў старажытнаегіпецкай пісьменнасці.

Паступова замест малюнкаў пачалі з'яўляцца знакі-сімвалы. Напрыклад, выява дзвюх ног у руху азначала «ісці». Так з'явіліся *іерогліфы*, якія лічыліся святымі. Іерогліфаў было шмат — амаль 800, запомніць іх было няпроста, таму пісцы лічыліся прывілеяванай часткай грамадства.



Палетка Нармера
(IV тыс. да н. э.)

Спачатку егіпцяне пісалі на розных матэрыялах: дрэве, камені, гліняных чарапках. Пазней — на папірусе. Для вырабу папірусу разрэзаныя сцёблы раслін асаблівым чынам збіралі, прасавалі, сушылі і скручвалі ў скруткі. Затым спецыяльнай трысняговай палачкай на папірус наносілі малюнак. У сухім клімаце такія скруткі захоўваліся тысячагоддзямі. Гэта і дазволіла сучасным навукоўцам вывучыць старажытныя тэксты, у тым ліку і літаратурныя.

**Цікавы факт!**
У Старажытным Егіпце становішча пісьменнага чалавека было настолькі высокім, што спачатку ў вобразе пісца адлюстроўвалі толькі сыноў фараона.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Картуш Тутмоса III
(XIV ст. да н. э.)



Пісцы з прыладамі для пісьма.
Рэльеф (III тыс. да н. э.)

• Егіпцяне вельмі паважалі ўменне запісваць знакамі гукі маўлення. Яны называлі пісьмо «словамі Бога». Патлумачце, як вы разумееце гэты вобразны выраз.

• Як вы думаеце, чаму прафесія пісца ў Старажытным Егіпце мела такі высокі статус?

• Адкрыццё таямніц старажытнаегіпецкай пісьменнасці пачалося з картушоў — адмысловых знакаў для адлюстравання імя фараона ў авальным контуры. Разгледзьце картуш Тутмóса III. Прыдумайце і выканайце картуш для свайго імя. Раскажыце, што ў час працы было для вас асабліва складаным.

… Они не строили себе пирамид из меди
И надгробий из бронзы.
Не оставили после себя наследников,
Детей, сохранивших их имена.
Но они оставили своё наследство в писаниях,
В поучениях, сделанных ими.

*Прославление писцов.*
*(Пер. А. Ахматовой)*

Раздзел 3

# МАСТАЦТВА ПРАЗ ТЫСЯЧЫ ГАДОЎ: СТАРАЖЫТНЫ УСХОД




**Гу Кайджы.** Павучанні старэйшай прыдворнай дамы (копія, IX ст.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 10. МАСТАЦТВА ШУМЕРАЎ: МОЦ ПРАВІЦЕЛЯ І ВЕРА Ў БАГОЎ

На ўрадлівых землях Месапатаміі, паміж рэкамі Тыгр і Еўфрат, узнікла найстаражытнейшая цывілізацыя шумераў, якая, нароўні з Егіптам, адкрывае мастацкі летапіс Старажытнага свету. У першых гарадах-дзяржавах — Ур, Урук, Лагаш — з'явіліся пісьменнасць, навука, рамёствы і мастацтва.

***Гарады шумераў.*** У Месапатаміі было мала дрэў, будаўнічага каменю і металаў. Таму для ўзвядзення любых пабудоў шумеры выраблялі цэглу з гліны, вады і сечанай саломы, якая высушвалася на сонцы. Толькі з развіццём цывілізацыі для аздаблення асабліва важных збудаванняў стала выкарыстоўвацца абпаленая цэгла.

Найбольш значныя будынкі — храмы і палацы — уводзіліся на высокіх платформах, якія абаранялі сцены пабудоў ад рэгулярных разліваў рэк і ўзвышалі іх над астатнімі збудаваннямі, гарадскімі кварталамі. І палацы, і жыллё беднякоў будаваліся па адным прынцыпе: сцены замыкаліся вакол унутранага двара, утвараючы адзіную кампазіцыю.

Сэрцам горада лічыўся храм. Узводзіліся храмы як прыстанкі багоў, яны адлюстроўвалі ідэю сувязі зямлі і неба, людзей і багоў. Да гэтых збудаванняў ставіліся з асаблівым шанаваннем.

Шумерскія храмы мелі масіўны падмурак з няцотнай колькасцю прыступак. Такія ступеньчатыя збудаванні называюцца *зікура́тамі*. Ніжні ўзровень быў значна буйнейшы за астатнія і служыў платформай збудавання. Асноўныя часткі — платформа, цэнтральныя прыступкі і свяцілішча — злучаліся лесвіцамі і пандусамі.

**Цікавы факт!**
Зікураты, як мяркуецца, мелі азелянёныя тэрасы. Шэсце ў свяцілішча перыядычна гублялася з поля зроку і… ізноў з'яўлялася на верхніх платформах. У вачах народа гэта было містычным дзействам.



Зікурат у г. Уры. Сучасная рэканструкцыя

На фоне гарадской забудовы зікураты вылучаліся не толькі памерамі, але і колеравым вырашэннем. Платформа пакрывалася чорным бітумам для абароны ад вільгаці. Цэнтральная частка захоўвала чырванаваты колер гліны, а верхняя бялілася вапнай. Сам храм меў нябесна-блакітны колер.

Менавіта так выглядаў зікурат у горадзе У́ры. Калі ўрачыстая працэсія павольна рухалася ў свяцілішча, людзям ля падножжа велізарнага збудавання здавалася, што жрацы паднімаюцца ў нябесныя палацы бажаства.

*Зікурат у горадзе Уры часта называюць «гарой бога». Як вы думаеце, чаму?*

***Вобразы чалавека і жывёл.*** Шумеры добра валодалі мастацкімі рамёствамі. Для стварэння пластычных вобразаў, мазаічных кампазіцый, рэльефаў, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва майстры выкарыстоўвалі камень розных парод, металы, дрэва, перламутр.

Адна з мазаік, знойдзеная ў царскім пахаванні ў горадзе Уры, адлюстроўвае сцэны з жыцця шумераў. Навукоўцы далі ёй назву «Штандар вайны і міру». Створаная ў форме даху з двума схіламі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Штандар вайны і міру. Частка «Мір» (каля III–II тыс. да н. э.)

гэтая «гісторыя ў малюнках» услаўляе правіцеля, распавядае нам пра яго ваенныя бітвы і штодзённае жыццё. Фігуры правіцеля, вяльможаў, воінаў, слуг, музыкаў размешчаны трыма радамі, як радкі ў кнізе.

Поруч з правіцелямі і багамі шумеры адлюстроўвалі шанаваных жывёл. Найбольш часта можна ўбачыць аслоў, коз і быкоў. Менавіта ў гэтых вобразах ярка выявілася імкненне майстроў да рэалістычнасці выяў.

У адной з царскіх грабніц у горадзе Уры была знойдзена арфа, упрыгожаная галавой быка. Імкненне да дэкаратыўнасці не перашкодзіла майстру падкрэсліць асаблівасці жывёлы: яе разадзьмутыя ноздры, буйныя выгнутыя рогі, густую поўсць.



Арфа з грабніцы Пуáбі
(III тыс. да н. э.). Рэканструкцыя



Каменная цыліндрычная пячатка з выявай быка

Выявы быкоў поруч з багамі, царамі і фантастычнымі істотамі часта сустракаюцца і ў *глі́птыцы* — мастацтве разьбы па камені каштоўных парод. Выразаныя на каменных пячатках цыліндрычнай формы фігуры гэтых магутных жывёл узяты з міфалагічных сюжэтаў. Пракочваючы цыліндр па мяккай гліне, чалавек назаўжды адлюстроўваў інфармацыю пра ўстойлівыя традыцыі і вераванні шумераў.

*Разгледзьце фігуры на штандары з Ура ў інфармацыйных крыніцах у розных ракурсах. Якія жывёлы выяўлены ў ім? Як вы думаеце, чаму?*

***Культ чалавека, які моліцца.*** Вераванні шумераў закраналі ўсе сферы іх жыцця. Мастацтва ў рэлігійным кульце адыгрывала вельмі важную ролю. Найбольш значнай была скульптура.

Шумеры стваралі вобразы не толькі багоў, але і людзей, якія моляцца, — *адара́нты*. Каб атрымаць прыхільнасць багоў, гэтыя статуэткі скульптары дарылі храмам.

Адаранты не мелі партрэтных рыс. Яны ўяўлялі сабой абагульнены вобраз чалавека, які сядзіць або стаіць са складзенымі ў малітоўным жэсце рукамі. Асаблівая ўвага надавалася вачам. Яны паказваліся шырока расплюшчанымі, для выразнасці нярэдка ўпрыгожваліся каляровымі камянямі. Пра тое, хто стаіць перад бажаствам, можна было даведацца па надпісе на спіне ці пастаменце.

Існуе *статуэтка-адарант Гудэ́а — аднаго з правіцеляў горада Лагаша* — работы невядомага майстра. Цар адлюстраваны на троне. Захоўваючы абагульненую трактоўку фігуры, скульптар вылучыў



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Адарант Эбіх-Іля, вяльможы з г. Ма́ры (III тыс. да н. э.)



Адарант Гудэа (XXI ст. да н. э.)

рукі і плечы, прапрацаваў пальцы рук і ног, намеціў складкі адзення. У скульптуры Гудэа больш праўдзіва мадэлююцца рысы твару: падкрэслены скулы, падбародак, прапрацаваны бровы.

*Знайдзіце падобныя і адметныя рысы ў вобразах вяльможы Эбіх-І́ля і цара Гудэа. Параўнайце іх з выявай правіцеля на штандары з Ура. Якая з гэтых выяў, на вашу думку, нясе больш інфармацыі пра знешнасць шумераў?*

Неумелому купцу приходится стать погонщиком ослов,
Неумелому певцу приходится дудеть в дудку,
Неумелому оружейнику приходится ковать серпы,
Неумелому строителю приходится быть подносчиком глины.

*Эпос о Гильгамеше*

***Пісьменнасць і літаратура.*** Важным укладам шумераў у культуру чалавецтва стала пісьменнасць. У Месапатаміі людзі прыдумалі асаблівую сістэму знакаў для перадачы інфармацыі, якую мы называем *клі́напісам*. З гліны рабілі плоскія цаглінкі-таблічкі, на якіх вострай палачкай выціскалі ўмоўныя знакі. Высушаная на сонцы або абпаленая ў печы, такая таблічка вельмі даўгавечная. Яе можна захоўваць і перадаваць іншым людзям.

Самыя першыя клінапісныя таблічкі мелі гаспадарчае прызначэнне: на іх вялі ўлік жывёлы і іншай маёмасці. Але неўзабаве шумеры сталі запісваць на таблічках законы, паданні пра багоў і герояў, нават казкі і павучальныя вершы. А старажытны аўтар радкоў пра розныя прафесіі папярэджвае: кожны, хто дрэнна робіць сваю справу, апускаецца ў суполцы майстроў на прыступку ніжэй.

Дзякуючы таблічкам, якія захаваліся да нашых дзён, мы знаёмыя і з самай старажытнай на Зямлі паэмай. Гэта *«Эпас пра Гільгаме́ша»*, прысвечаны подзвігам і прыгодам легендарнага цара горада Ару́ка. Гільгамеш здолеў перамагчы пасланых багамі пачвар, зрабіць цывілізаваным дзікага чалавека Энкіду́ і пасябраваць з ім. Страціўшы сябра, Гільгамеш (першым у сусветнай літаратуры!) задумваецца аб прыгажосці жыцця і непазбежнасці смерці. Ён адпраўляецца на пошукі неўміручасці, але даведваецца, што сапраўдная неўміручасць чалавека — у яго добрых справах.



Гільгамеш змагаецца з быком. Адбітак з цыліндрычнай пячаткі (III тыс. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Клінапісная таблічка шумерскага цара Зі́мры-Лі́ма (XVIII ст. да н. э.)

*Нават пасля таго як краіну шумераў захапілі больш ваяўнічыя суседзі, Гільгамеш застаўся любімым героем народаў Месапатаміі. Як вы думаеце, чаму?*

Манументальныя вобразы мастацтва шумераў услаўлялі сілу багоў і магутнасць правіцеляў. Створаныя шумерамі творы мастацтва на працягу многіх стагоддзяў служылі ўзорам для пераймання.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Культуру шумераў часта называюць цывілізацыяй гліны. Як вы думаеце, чаму? Патлумачце сваё меркаванне на прыкладах, прапанаваных у параграфе і электронным дадатку.

2. Параўнайце старажытнаегіпецкую піраміду і шумерскі зікурат. Што іх аб'ядноўвае? Якое прызначэнне абодвух помнікаў архітэктуры?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Паглядзіце ў інфармацыйных крыніцах анімацыйны фільм-фантазію «Эпас пра Гільгамеша», створаны юнымі мастакамі-аніматарамі ў студыі анімацыйнага кіно Л. Лазаравай. Складзіце невялікі аповед пра тое, чаму гісторыя пра Гільгамеша цікавая сучасным людзям.

# § 11. ВАВІЛОН І АСІРЫЯ: БАРАЦЬБА ЗА КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Вавілоняне і асірыйцы, якія атрымалі ў спадчыну культурныя традыцыі і мастацкія каштоўнасці шумераў, удасканальвалі ўяўленні, якія склаліся пра светаўладкаванне. Яны не толькі запазычылі лепшыя дасягненні сваіх папярэднікаў, але і творча пераасэнсавалі іх і дапоўнілі новымі адкрыццямі.

***Ранні Вавілон: спадчыннікі шумераў.*** Для ўвекавечвання важных гістарычных падзей вавілоняне, як і шумеры, узводзілі стэлы. На *стэле цара Хамурапі* клінапісам высечаны знакамітыя законы Хамурапі — адзін з першых зводаў законаў у гісторыі чалавецтва! Увенчвае стэлу рэльеф з выявай цара, які атрымлівае ад бога, што сядзіць на троне, знакі вышэйшай улады — жазло і згорнуты бізун. У рэльефе выразна бачныя складкі адзення, галаўныя ўборы і барада, якая паказвае на вышэйшы статус адлюстраванага.

Па традыцыі шумераў фігуры перададзены абагульнена: галава і ногі паказаны ў профіль, а плечы разгорнуты да гледача. Аднак у гэтай кампазіцыі вызначаецца новая рыса: майстар накіраваў увагу на атрыбуты ўлады і касцюмы персанажаў. Заўважнымі сталі і партрэтныя рысы самога цара: худы твар, высокія скулы, запалыя шчокі.



Рэльеф «Цар Хамурапі (злева) і бог сонца Шамаш». Стэла са зводам законаў (XVIII ст. да н. э.)

*Як вы думаеце, чаму тэкст законаў Хамурапі вырашылі дапоўніць скульптурнай кампазіцыяй?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Мастацтва Асірыі: мастацкая спадчына вялікіх заваёўнікаў.*** Адной з самых ваяўнічых дзяржаў Старажытнага свету была Асірыя. На змену культавым збудаванням і рэлігійным сюжэтам у выяўленчым мастацтве прыйшла свецкая тэматыка. Галоўнай у мастацкай культуры стала тэма праслаўлення магутнасці цара.

Цэнтрам гарадской забудовы ў Асірыі быў палац. Адзін з самых грандыёзных палацаў быў узведзены пры цары Саргоне II у *горадзе Дур-Шарукі́н*. Усе яго пабудовы з унутранымі дварамі размяшчаліся на высокай платформе. Вышыня платформы была 14 метраў. Асаблівую ўвагу дойліды надавалі магутным варотам, да якіх вялі шырокія пандусы. Па пандусах заязджалі калясніцы і вершнікі. За варотамі знаходзілася парадная частка палаца, прызначаная для прыёмаў. Далей размяшчаліся жылыя памяшканні і зікурат.

Уваход у палац ахоўвалі вялізныя статуі фантастычных істот *шэ́ду — крылатых быкоў з галовамі правіцеляў*. Гэтыя міфічныя істоты мелі па пяць ног. Лічылася, што няпрошаныя госці, якія ідуць у палац, будуць уражаны моцай жахлівых фігур. Калі рухацца да ўвахода, можа з’явіцца ўражанне, што шэду рухаюцца насустрач.



Горад Дур-Шарукін. Рэканструкцыя



Шэду з Пергамскага музея ў Берліне (IX ст. да н. э.)

У выяўленчым мастацтве асірыйцы надалі ўвагу размаляваным рэльефам. Галоўным сюжэтам *групы рэльефаў з выявамі эпізодаў палявання на львоў цара Ашурбаніпáла* з палаца ў Нінéвіі, як і іншых выяў, стала ўслаўленне цара. Таму нядзіўна, што майстры падкрэслівалі не індывідуальнасць аблічча, а тыя рысы, якія паказвалі на сілу і моц заваёўнікаў. Перададзены драбнюткія асаблівасці касцюма цара, дэталёва прапрацавана мускулатура чалавека і жывёл. Пярэднія лапы льва нагадваюць рукі воіна. Ногі да калена і рукі да локця ў цара паказаны аголенымі. Гэта дазваляе ўявіць незвычайную сілу кожнага персанажа.



Рэльеф з Ашурбаніпалам, які забівае льва (669 — каля 635 г. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асірыйцы імкнуліся перадаць дынаміку фігур. У вобразе героя адчуваецца сіла, смеласць, адвага. Цар стойка змагаецца з ільвом: магутныя плечы распраўлены, рукі дужыя, выраз твару суровы і рашучы.

*Рэльефныя выявы размяшчаліся стужкамі. На каменных плітах майстры паказалі ўсю гісторыю палявання цара на львоў: выезд на калясніцы, барацьбу і, нарэшце, вяртанне ў палац. Разгледзьце іншыя выявы рэльефу ў інфармацыйных крыніцах і электронным дадатку. Якое ўражанне ў вас яны пакінулі?*

***Новы росквіт Вавілона.*** Бліскучага росквіту Вавілон дасягнуў у VI стагоддзі да н. э. пры цары Навуханадносары II. Пышнасцю сваёй архітэктуры горад засланіў у той час усе суседнія рэгіёны. Адных толькі храмаў у Вавілоне налічвалася больш за пяцьдзясят! І ўсе яны былі багата ўпрыгожаны паліванай цэглай і барэльефамі.

Самым велічным збудаваннем быў *зікурат Этэмена́нкі* («Дом заснавання неба і зямлі»). Яно мела сем ярусаў, кожны з якіх



Панарама Вавілона. Графічная рэканструкцыя

> У Вавілоне, маім абраным горадзе, які люблю, я пабудаваў палац, дом, які ўражвае людзей, вузы аб'яднання краіны, зіхатлівую пабудову, месцазнаходжанне маёй царскасці... Срэбра, золата, каштоўныя камяні, усё, што раскошна і цудоўна, усё дабро і маёмасць, упрыгожванне велічы сабраў я ў ім, я зрабіў яго гіганцкім ёмішчам царскіх скарбаў.
>
> *Навуходаносар II*

згодна з традыцыяй быў афарбаваны ў сімвалічны колер. На вяршыні зікурата знаходзілася свяцілішча Мардýка — галоўнага бога Вавілона.

Да галоўнага храма горада вяла *Дарога працэсій*, якая ўключала восем святых варот, названых у гонар багоў Месапатаміі. Да нашых дзён захаваліся *вароты багіні Íштар* — галоўная брама Вавілона.



Вароты багіні Іштар (IV ст. да н. э.) у Пергамскім музеі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Гэта быў сапраўдны цуд прыгажосці, будаўнічага майстэрства, узор бліскучага сінтэзу архітэктуры і дэкаратыўнага мастацтва. На сценах, упрыгожаных ярка-сіняй паліванай пліткай, размяшчаліся шматколерныя выявы рэальных і міфалагічных жывёл. Іх залацістыя рэльефныя сілуэты сімвалізавалі нябесную абарону горада з боку боскіх сіл.

Фантастычныя вобразы жывёл з тулавам ільва, галавой змяі — вечныя вартавыя, якія велічна ступаюць шэрагамі ў павольным рытме. Глыбокі сіні колер паліванага фону сцен даваў адчуванне таго, што сам купал высокага неба датыкаецца да гарадской архітэктуры.

Згодна з паданнем, у цэнтры Вавілона цар Навухаданосар II загадаў узвесці для сваёй жонкі *«вісячыя сады»*. Маладая царыца Амітыс, якая вырасла ў гарыстай і зялёнай Мідыі, не магла прывыкнуць да горада, размешчанага на пясчанай раўніне. Каб яе суцешыць, на шмат’ярусных платформах былі створаны сады з багатай расліннасцю. Пляцоўкі для раслін пакрываліся пластом урадлівай зямлі, якая пастаянна арашалася вадой. Таму невыпадкова такі высока ўзнесены зялёны аазіс у цэнтры сталіцы называлі не толькі цудам садовага мастацтва, але і цудам свету!

*Храм Мардука, які знаходзіўся на зікураце Этэменанкі, называлі «домам узнятай галавы». Выкажыце свае здагадкі, чаму яго так назвалі. Пацвердзіце іх звесткамі пра памеры вежы.*



Вісячыя сады Семіраміды. Графічная рэканструкцыя

Мастацтва Вавілона і Асірыі развівалася на аснове пера-асэнсавання спадчыны шумераў. Кожнай культуры быў уласцівы свой характар, які адлюстроўваў галоўныя ідэі і каштоўнасці дзяржавы. Асірыйцы прыўнеслі ў мастацтва дух ваяўнічасці, сілы і непахіснасці. Вавілоняне надалі выпрацаваным традыцыям дэкаратыўнасць.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Культуру Вавілона часта называюць забытай культурай. Ці згодны вы з гэтым сцверджаннем? Абгрунтуйце свой пункт гледжання.

2. У царскім палацы ў Ніневіі была пабудавана бібліятэка. Яе збор налічваў дзясяткі тысяч гліняных клінапісных таблічак (электронны дадатак). Заснаваў бібліятэку цар Ашурбаніпал. Лічыцца, што ён быў адзіным правіцелем свайго часу, які ўмеў чытаць і пісаць. На адной з таблічак Ніневійскай бібліятэкі захавалася яго выказванне. Прачытайце яго. Што ў словах цара падалося вам незвычайным? Чаму? У чым вы можаце зраўнавацца з гэтым царом?

Я вывучыў таемнае мастацтва пісьма на таблічках.
Я прадказваю будучыню.
Я ўмею рашаць складаныя, няпростыя задачы на дзяленне і множанне.
Я чытаю таблічкі на старажытнай мове шумераў.
Я знаёмы са старажытнымі запісамі, ужо зусім незразумелымі.

*Цар Ашурбаніпал*
*(даецца ў адаптацыі)*

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Беларусь прыцягвае ўвагу турыстаў усяго свету маляўнічымі краявідамі, зялёнымі вуліцамі і паркамі, унікальнай архітэктурай. Прагулка па шырокіх праспектах або вузкіх вулачках з брукам дазваляе атрымаць асалоду ад невымоўнай атмасферы. Для азелянення населеных пунктаў сучасныя спецыялісты, натхняючыся вісячымі садамі Вавілона, прапануюць размяшчаць павойныя расліны на дахах і балконах-тэрасах вышынных дамоў.

Прапануйце сваё рашэнне вертыкальнага азелянення сучаснай архітэктуры вашага населенага пункта (напрыклад, стварыце эскіз, макет, апавяданне ці інш.).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 12. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА ІРАНА: УСЛАЎЛЕННЕ МАГУТНАСЦІ ЦАРА І ЯГО ДЗЯРЖАВЫ

Культура Старажытнага Ірана — адна з найстарэйшых у Старажытным свеце. На старажытнаіранскае (персідскае) мастацтва паўплывалі рэлігійныя традыцыі Старажытнага Егіпта і суседства з магутнай Месапатаміяй. Адметнай асаблівасцю гэтага рэгіёна было сцвярджэнне велічы вярхоўнай улады цара і яго абагаўленне.

***Палацавая архітэктура і скульптура.*** Палацы ў Старажытным Іране — гэта не проста раскошнае жыллё правіцеляў, але і важныя сімвалы іх улады. Імкненне да велічы перш за ўсё было



Вароты са скульптурнымі выявамі шэду ў Персепалі (V ст. да н. э.)

Палац у Персепалі (V ст. да н. э.)



адлюстравана ў архітэктуры. Велізарныя палацы дэманстравалі магутнасць і дабрабыт цароў, служылі месцам для свецкіх мерапрыемстваў — прыёму высокапастаўленых гасцей і правядзення дзяржаўных цырымоній.



Рэльеф з палаца ў Сузах (V ст. да н. э.)

Помнікамі архітэктуры Старажытнага Ірана з'яўляюцца *палацы ў Пасаргáдах* — адной з першых старажытнаперсідскіх сталіц, а таксама *ў Персéпалі* і *Сýзах*. Руіны палацавых збудаванняў да гэтага часу выклікаюць захапленне размахам выканання і прыгажосцю. Палацавыя комплексы былі спраектаваны такім чынам, каб падкрэсліць значнасць правіцеля і яго перавагу над падданымі. Таму яны былі або абкружаны сценамі, або збудаваны на спецыяльных платформах, да якіх вялі багата ўпрыгожаныя рэльефамі лесвіцы. Уваход у палац ахоўвалі велічныя вартавыя — міфічныя істоты з галавой цара, тулавам быка і крыламі арла. Гіганты выклікалі ў наведвальнікаў палаца страх перад правіцелямі.

Самым значным памяшканнем у палацавых комплексах была прасторная, добра асветленая *парадная зала* са мноствам калон. Пра моц і багацце цара Дарыя I і яго сына Ксеркса I у *«Зале цароў Дарыя — Ксеркса»* ў Персепалі сведчаць раскошныя рэльефы і 36 вялікіх калон. А «Залу цара Артаксеркса II» упрыгожвалі 100 калон! У Сузах у парадняй зале ў акружэнні 20-метровых стройных і прыгожых калон, увянчаных скульптурнымі паўфігурамі быкоў, быў размешчаны трон цара.

Унікальнасць палацавым комплексам Старажытнага Ірана надаюць расквечаныя *рэльефныя кампазіцыі*. Па-майстэрску створаныя выявы не толькі ўпрыгожваюць будынкі, але і з'яўляюцца



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

сведчаннем гістарычных падзей. У адрозненне ад асірыйскіх твораў, персідскім рэльефам уласцівы велічны і святочны характар. У іх адсутнічаюць поўныя руху і эмацыянальнага напружання сцэны барацьбы. Перавага персідскімі скульптарамі аддавалася бясконцым працэсіям воінаў і да́ннікаў, якія нясуць цару падарункі. Спакойныя, строгія вобразы даннікаў з палаца ў Сузах выяўляюць пачцівасць і прымірэнне.

*Многія памяшканні персідскіх палацаў маюць паэтычныя назвы: «Зала ста калон», «Брама ўсіх краін», «Зала страчаных крокаў». Як вы думаеце, чаму яны былі так названы?*

***Грабніцы персідскіх цароў.*** Грабніцы — месцы пахавання цароў — у архітэктуры Старажытнага Ірана займалі асаблівае месца. Ад палацавай архітэктуры пахавальныя збудаванні адрозніваліся стрыманасцю і прастатой.

*Грабніца цара Кі́ра ў Пасаргадах* — адзін з яскравых прыкладаў архітэктуры персідскага стылю. Гэта збудаванне з белага вапняку ў выглядзе ступеньчатай піраміды вышынёй у 11 метраў адлюстроўвала значнасць Кіра Вялікага — цара-заснавальніка персідскай дзяржавы. Адзіным упрыгажэннем грабніцы з'яўляецца размешчаны



Грабніца Кіра ў Пасаргадах (VI ст. да н. э.)



Скальныя грабніцы ў Накш-і-Рустаме (І тыс. да н. э.)

над уваходам арнаментальны матыў у форме кветкі — сімвал вярхоўнага бога.

Уваходы ў *грабніцы ў Накш-і-Рустаме* ўяўляюць сабой своеасаблівыя нішы ў форме крыжа, як бы «ўманціраваныя» на 20-метровай вышыні ў скальныя сцены. У цэнтры крыжа высечаны ўваход, ля якога ўзвышаюцца калоны. Прастора над уваходам упрыгожана рэльефнымі выявамі. Напрыклад, у *грабніцы Дарыя Вялікага* — самай вядомай грабніцы ў Накш-і-Рустаме — гэта выявы самога цара і персідскіх воінаў у час правядзення цырымоніі. І сёння скальныя грабніцы ўражваюць веліччу, выклікаючы пашану да памерлых і магутнасці Старажытнага Ірана.

*Разгледзьце грабніцы ў Пасаргадах і Накш-і-Рустаме. Параўнайце іх знешні выгляд. Знайдзіце ў гэтых збудаваннях агульнае і адметнае. Як вы думаеце, чаму пышнасць палацаў персідскіх уладароў не пераносіцца на іх грабніцы?*

***Раскоша дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.*** Вялікія правіцелі Ірана не толькі імкнуліся да пашырэння сваіх меж, але



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Рытон у форме галавы барана (золата, VII–VI стст. да н. э.)

Ручка вазы ў выглядзе крылатага казярога (срэбра з інкрустацыяй, IV ст. да н. э.)



і выяўлялі цікавасць да развіцця культуры. Раскошныя прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва былі неад'емнай часткай жыцця царскага двара. Вытанчаныя ювелірныя ўпрыгажэнні, цудоўныя тканіны з прыгожым узорам і шкло да гэтага часу выклікаюць захапленне майстэрствам выканання.

Але асабліва высокага майстэрства старажытнаіранскія ўмельцы дасягнулі ў апрацоўцы металаў. Найтанчэйшае разьбярства, непаўторныя арнаменты ў металічных вырабах перадаюць тонкі густ майстроў. Карыстаючыся тэхнікамі чаканкі, гравіроўкі, інкрустацыі каштоўнымі камянямі і золатам, яны стваралі прадметы незвычайнай прыгажосці. Напрыклад, *рытоны* — выробленыя з золата і срэбра пасудзіны, якія мелі форму жывёл або міфічных істот. Вырабы выкарыстоўваліся не толькі для піцця. Гэта былі ўнікальныя творы мастацтва. Старажытнаіранскія дэкаратыўныя вырабы не толькі ўпрыгожвалі палацы правіцеляў, але і сімвалізавалі іх статус, магутнасць і дабрабыт. Кожны цар імкнуўся перасягнуць папярэднікаў, замаўляючы ўсё новыя і новыя шэдэўры для свайго палаца.

*Прадметы побыту, створаныя майстрамі Старажытнага Ірана, адрозніваюцца раскошай і багаццем дэкору. Як, на вашу думку, гэта звязана з культам царскай улады? Звярніцеся да электроннага дадатку.*

Мастацтва Старажытнага Ірана служыла сродкам услаўлення цара. Масіўныя збудаванні і вытанчаныя ўпрыгажэнні, вопратка і рыштунак воінаў, скульптурныя выявы чалавека і фантастычных істот адлюстроўвалі раскошу і моц квітнеючай дзяржавы, сцвярджалі магутнасць правіцеля.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Параўнайце культуру Старажытнага Ірана з іншымі культурамі Старажытнага свету. У чым унікальнасць старажытнаіранскага мастацтва? Якія сюжэты і матывы пераважаюць у рэльефах і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Ірана? З якімі культурамі мастацкі стыль і тэхналогіі іх стварэння маюць падабенства? Звярніцеся да электроннага дадатку.

2. У літаратуры і міфалогіі Старажытнага Ірана Сонца часта займала важнае месца. Яго праслаўлялі як жыццесцвярджальную сілу, як крыніцу святла і цяпла. Прачытайце ўрывак са свяшчэннай кнігі «Аве́ста». Падумайце, у якіх яшчэ культурах Старажытнага свету Сонца займала важную ролю.

Когда Солнце светит,
Когда Солнце греет,
Стоят божества
Все сотнями тысяч
И счастье вбирают,
И счастье вручают,
И счастье дарят Земле...

*Гимн Солнцу.*
*(Пер. И. Стеблин-Каменского)*

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

У культуры Старажытнага Ірана, як і ў іншых культурах Старажытнага свету, вельмі папулярны вобраз фантастычнай жывёлы. Звярніцеся да электроннага дадатку. Прыдумайце і намалюйце пасудзіну ў выглядзе фантастычнай істоты, прытрымліваючыся мастацкага стылю Старажытнага Ірана.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 13. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАЙ ІНДЫІ: ІДЭАЛЫ ПРЫГАЖОСЦІ

Культура Старажытнай Індыі ўзнікла амаль адначасова з іншымі культурамі Старажытнага Усходу. Аднак еўрапейцы адкрылі для сябе багацце гэтай цывілізацыі зусім нядаўна, у XX стагоддзі.

***Таямніцы культуры Харапы.*** У паўночна-заходняй частцы паўвострава Індастан, у даліне ракі Інд, узнікла своеасаблівая культура Хара́пы, якая паклала пачатак развіццю мастацтва Старажытнай Індыі.

Калі на большай частцы планеты цывілізацыя знаходзілася на стадыі першабытнага грамадства, на тэрыторыі Харапы квітнела гарадское жыццё. Росквіт харапскай культуры доўжыўся амаль два тысячагоддзі! Навукоўцы налічылі некалькі дзясяткаў на дзіва аднолькавых гарадоў, са строгай планіроўкай вуліц і дамамі, створанымі, як мы сказалі б

**Цікавы факт!**
Руіны горада Махе́нджа-Да́ра робяць незабыўнае ўражанне. Нядзіўна, што яны ўвайшлі ў Спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.



Руіны г. Махенджа-Дара (III тыс. да н. э.)

сёння, «па тыпавым праекце». Селішчы агароджваліся магутнымі цаглянымі сценамі.

Галоўнымі гарадамі — цэнтрамі харапскай культуры — былі Махенджа-Дара і Харапа. Гэтыя гарады адрозніваў на дзіва высокі ўзровень цывілізацыі. Засушлівы клімат стаў прычынай асаблівага стаўлення да вады — адной з галоўных каштоўнасцей гараджан. У дамах будавалі студні, памяшканні для абмыванняў. Існавалі і грамадскія калодзежы, і нават басейны. У гарадах дзейнічала сістэма водазабеспячэння і каналізацыі.

У руінах гарадоў навукоўцамі былі знойдзены прадметы мастацкага рамяства: ювелірныя ўпрыгажэнні, каменныя і бронзавыя фігуркі людзей, пячаткі з выявамі жывёл, керамічныя вырабы і нават дзіцячыя цацкі.

*У культуры Харапы асаблівае значэнне меў культ вады. Як гэта адлюстравалася ў архітэктуры?*

***Унікальнасць старажытнаіндыйскай архітэктуры.*** Паступова цывілізацыя Харапы прыйшла ў заняпад. Пачаўся перыяд развіцця культуры Старажытнай Індыі, вядучую ролю ў якой адыгрывала рэлігія. Рэлігійныя перакананні прывялі да з'яўлення ў мастацкай культуры новых тэм, сюжэтаў і вобразаў.

Рэлігійныя погляды старажытных індыйцаў паўплывалі і на развіццё архітэктуры. З узнікненнем *будызму* — першай сусветнай рэлігіі — у Старажытнай Індыі разгарнулася маштабнае будаўніцтва культавых збудаванняў.

Унікальным тыпам збудаванняў была *будыйская ступа*. Гэта грандыёзная каменная паўсфера на пастаменце. На вяршыні ступы ўзвышалася невялікая надбудова, у якой захоўваліся святыя рэліквіі. Надбудову ўвенчвалі сімвалічныя парасоны, што атаясамліваліся з часткамі Сусвету.

Адным з сусветна вядомых і захаваных збудаванняў з'яўляецца *ступа ў горадзе Са́нчы*. Асаблівую цікавасць выклікаюць вароты ступы. У рэльефах, якія ўпрыгожваюць іх, бачна майстэрства мастакоў у разьбе па камені. Тут нас сустракаюць выявы сланоў, ільвоў,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ступа ў г. Санчы
(I ст. да н. э. — I ст. н. э.)



буйвалаў, паўлінаў, характэрныя для старажытнаіндыйскай культуры. Мы бачым і сцэны гістарычных бітваў. Вобразы рэальнага і фантастычнага светаў, пераплятаючыся паміж сабой, адкрываюць нам шлях да спазнання каштоўнасцей індыйскага мастацтва.

*Разгледзьце ступу ў горадзе Санчы. У чым, на ваш погляд, заключаецца незвычайнасць архітэктурнай формы самой ступы, а таксама лесвіц пры ёй, агароджы і варот?*

***Пячорныя храмы.*** Па ўсёй тэрыторыі Індыі будаваліся і будыйскія храмы — *ча́йцы*. Іх высякалі ў скалах, а таксама ўзводзілі на адкрытай прасторы.

Самы вялікі пячорны храм — *чайцья ў горадзе Ка́рлі*. Ён размяшчаецца на глыбіні 40 метраў.



Чайцья ў г. Карлі (I ст. да н. э.)



Пячорныя храмы ў Аджанце (II ст. да н. э. — V ст. н. э.)

Унутры — прасторная выцягнутая зала, у завяршэнні якой устаноўлена ступа — як адзін з сімвалаў будыйскай веры. Гэта частка храма, як і алтар хрысціянскіх цэркваў, была найбольш значнай. Унутраныя калоны чайцы ў Карлі маюць падмурак, які нагадвае гліняную пасудзіну. З яго, нібы ствол дрэва, вырастае васьмігранная калона. Завяршае калону форма, якая нагадвае перавернуты звон. На кожнай калоне ўстаноўлены скульптуры сланоў з вершнікамі.

Уражвае пышнасцю і *храмава-манастырскі комплекс у Аджа́нце*. Гэтыя архітэктурныя збудаванні арганічна зліваюцца з прыродным ландшафтам. Уваход у чайцы багата аздоблены рэльефамі з выявамі багоў, чалавечых фігур, жывёл і арнаментальнымі паясамі.

*Уявіце, што вы апынуліся ў прасторнай зале чайцы ў горадзе Карлі. Якія адчуванні можа выклікаць раскошна арганізаваная прастора ўнутры гэтага храма?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Скульптура і жывапіс Старажытнай Індыі.*** Архітэктуру Старажытнай Індыі нельга ўявіць без багатага скульптурнага і жывапіснага афармлення. Незвычайным манументальным збудаваннем была *ста́мбха* — каменная калона, на вяршыні якой устанаўлівалі скульптуру. Стамбхі ўзводзілі ў гонар багоў. Лічылася, што гэтыя калоны злучаюць зямлю і нябёсы.

На стамбхах размяшчалі ўказы правіцеляў, а таксама розныя выслоўі. *Стамбха правіцеля Ашокі* завяршалася скульптурнай групай з чатырох ільвоў, якія скіравалі позірк па баках свету. Некалі яны ўтрымлівалі на сваіх спінах кола — адзін з сімвалаў будызму.

Незвычайным багаццем фарбаў і непаўторнасцю вобразаў адрозніваецца жывапіс Старажытнай Індыі. Жывапісныя кампазіцыі з шырокай разнастайнасцю тэм і сюжэтаў упрыгожвалі сцены палацаў, дамоў вышэйшай шляхты, храмавыя і манастырскія комплексы.

Найбольш яркую карціну штодзённага жыцця індыйцаў даюць роспісы старажытных пячорных храмаў *Аджанты*. Сярод мноства роспісаў, якія пакрываюць сцены пячорных храмаў, мы бачым і сцэны баляванняў, і цырыманіяльныя працэсіі, і малюнкі сланоў, ільвоў,



Стамбха правіцеля Ашокі
(III ст. да н. э.)



Фрагмент роспісу Аджанты
(II ст. да н. э. — V ст. н. э.)

лебедзяў. Мастакі з аднолькавай любоўю ствараюць вобразы багоў і людзей, мужчын і жанчын, прадстаўнікоў вышэйшай знаці і простых людзей.

*Выява стамбхі Ашокі зрабілася ў XX стагоддзі нацыянальнай эмблемай — гербам Індыі. Як вы думаеце, чаму была абрана менавіта гэта скульптурная выява?*

Старажытныя індыйцы, атрымаўшы ў спадчыну каштоўнасці культуры Харапы, разнастаілі свет мастацкіх вобразаў. Увага творцаў да дэталяў спарадзіла характэрную рысу старажытнаіндыйскага мастацтва — дэкаратыўнасць. У гэтых дэталях, прапрацаваных старанна і вытанчана, раскрываецца старажытнаіндыйскае мастацтва.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Як вы думаеце, што прыцягвае мастакоў больш позняга часу ў жывапісных вобразах Старажытнай Індыі (электронны дадатак)? Пазнаёмцеся з фантастычным пейзажам «Мудрасць Ма́ну» Мікалая Рэрыха ў электронным дадатку. Што асабліва мастак хацеў расказаць пра Індыю?

2. Старажытная Індыя лічыцца радзімай шахмат. Паглядзіце, як выглядалі старажытнаіндыйскія шахматы. Раскажыце, наколькі змяніліся асноўныя фігуркі.



Шахматы (III тыс. да н. э.)



Дзіцячая цацка (III тыс. да н. э.)

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Перад вамі выява дзіцячай цацкі, створанай індыйскімі майстрамі. У ёй прадстаўлены сюжэт з жыцця старажытных індыйцаў. Раскажыце, пра што апавядае нам гэта цацка. Паспрабуйце самастойна выканаць з пластыліну яе фрагмент.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## § 14. МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА КІТАЯ: ПРЫГАЖОСЦЬ У ДЭТАЛЯХ

Мастацкая культура Старажытнага Кітая — гэта дзівоснае спалучэнне філасофіі і паэтычнасці. Па сёння прадстаўнікі гэтай цывілізацыі шануюць старажытныя традыцыі, далучаюцца да іх разнастайнасці і чэрпаюць у іх ідэі для творчасці.

***Спадчына Канфуцыя.*** Самабытнасць кітайскай культуры можна растлумачыць многімі прычынамі. Унікальныя прыродныя ландшафты — горныя хрыбты, парослыя лесам, і даліны магутных рэк — падказалі матывы, якія сталі асновай мастацкіх вобразаў жывапісу і паэзіі. Культурныя сувязі Кітая з суседнімі цывілізацыямі паўплывалі на характар старажытнакітайскага мастацтва, узбагаціўшы яго новымі мастацкімі прыёмамі. Але больш за ўсё на стварэнне незвычайных па складанасці і вытанчанасці мастацкіх твораў паўплывала вучэнне вялікага мудраца старажытнасці *Канфу́цыя*. Менавіта таму кітайскую культуру часта называюць канфуцыянскай.

Философ сказал: «Молодёжь дома должна быть почтительна к родителям, вне дома — уважительна к старшим, отличаться осторожностью и искренностью (правдивостью), обильною любовью ко всем и сближаться с людьми гуманными. Если по исполнении сего останется свободное время, то посвятить его учению».

*Конфуций. Суждения и беседы. Глава 1.*
*Не приятно ли учиться... (Пер. П. Попова)*

Вучні Канфуцыя сабралі яго разважанні ў кнігу *«Лунь юй»* — *«Выслоўі»*. Яна з'яўляецца найвялікшым помнікам сусветнай культуры. Спадчына Канфуцыя ўшаноўваецца ў Кітаі і сёння. Выслоўі філосафа заклікалі да парадку і любові, цярпімасці і шанавання традыцый, праяўлення сціпласці і справядлівасці. Гэтымі ідэямі прасякнута ўся кітайская мастацкая культура.

*Прачытайце ў электронным дадатку некалькі выслоўяў Канфуцыя. Якія якасці асобы прапаведуе старажытны філосаф? Чаму яго разважанні цікавыя і сучасным людзям?*

***Мастацтва каліграфіі.*** Старажытныя пісьмёны кітайцаў уяўлялі сабой знакі-малюнкі, якія называюць *піктагра́мамі*. У піктаграмах сімвалічна адлюстроўваліся з’явы і прадметы навакольнага свету. Пазней на іх аснове былі створаны кітайскія *іерогліфы*.



Кітайскія іерогліфы на панцыры чарапахі (II тыс. да н. э.)

Іерагліфічнае пісьмо стала асновай для каліграфіі — мастацтва гарманічнага афармлення іерогліфаў. Кітайская каліграфія — адна з самых дзівосных з’яў у сусветнай культуры. Прыгожа і гарманічна напісаныя знакі — адна з мастацкіх формаў выражэння стану душы чалавека. У кожнага каліграфа была свая пазнавальная манера пісьма. Яскравым прыкладам мастацтва каліграфіі з’яўляюцца творы легендарнага *майстра Ван Січжы́*. Пра яго творчасць прыхільнікі казалі так: «У вытанчанасці прасвечвае камлюкаватасць*, мяккасць нясе цвёрдасць».

Сучасныя даследчыкі параўноўваюць мастацтва каліграфіі з мастацтвам жывапісу. У работах старажытных каліграфаў прасочваецца імкненне да ўвасаблення прыгожага праз унікальныя сімвалы сонца, жыцця, кахання, удачы…

*Ван Січжы прыпісваюць словы: «Адна рыса не там, дзе трэба, — гэта нібы асілак без рукі». Як вы думаеце, што меў на ўвазе майстар?*



**Ван Січжы.** Копія фрагмента пісьма «Прасвет пасля снегападу» (IV ст. н. э.)

---

* *Камлюкаваты* — моцны, мажны, каржакаваты.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Жывапіс на шоўку.*** Жывапіс Старажытнага Кітая злучыў у сабе два скарбы: каліграфію і шоўк. Да вынаходства паперы менавіта шоўк быў асновай для жывапісных выяў. Пэндзлем з воўны жывёл майстар наносіў туш або фарбу на клейкай аснове на шаўковае палатно. Гэты занятак патрабаваў ад мастака поўнай канцэнтрацыі, дакладных, упэўненых рухаў, мастацкага густу.

Адзін з ранніх твораў старажытнакітайскага жывапісу, які дайшоў да нас, — палатно *«Коннік верхам на цмоку»* — быў знойдзены ў магільным склепе знатнага воіна. Статны мужчына ў традыцыйнай даўгаполай вопратцы з кінжалам на поясе стаіць на спіне цмока, які выгінаецца. У руках мужчына трымае павады. Крыху вышэй размешчана выява птушкі Фенікс. Верагодна, гэтыя фантастычныя жывёлы ў Старажытным Кітаі лічыліся праваднікамі ў замагільны свет.

Ужо ў гэтым творы прасочваюцца асаблівасці кітайскага жывапісу. Фон выявы не запаўняўся дэталямі, застаючыся пустым, аднастайным. Ён прымаўся мастаком як бязмежная прастора, у якой чалавек гарманічна суіснуе з прыродным асяроддзем. Абрысы чалавечых фігур, прадметаў побыту ці лініі горных масіваў падказвалі сюжэт кампазіцыі, абуджаючы фантазію гледача. Пазней кітайскі жывапіс пачаў ускладняцца. Сілуэты прадметаў пачалі прапрацоўвацца больш дэталёва. Шырэйшай стала колеравая гама. З'явілася жанравая разнастайнасць. «Горы і воды», «Кветкі і птушкі», «Людзі і прадметы» — менавіта так пачалі называць жанры жывапісу ў Кітаі.

З часам асноўнай формай жывапісных палотнаў стаў *жывапіс на скрутках*. Выкананыя на доўгіх (да 30 метраў) гарызантальных або



Коннік верхам на цмоку
(V–II стст. да н. э.)



**Гу Кайчжы.** Фея ракі Ло. Фрагмент (IV ст.)

вертыкальных шаўковых (пазней папяровых) палотнах жывапісныя кампазіцыі зрабіліся асаблівай формай перадачы ўяўленняў аўтараў пра навакольны свет.

Напрыклад, пяціметровы гарызантальны скрутак *«Фея ракі Ло»* мастака *Гу Кайчжы́* можна разглядаць, павольна раскручваючы справа налева, ад эпізоду да эпізоду. Падзелены на некалькі фрагментаў скрутак падобны на кінастужку, на якой кадры фільма суправаджаюцца надпісамі. Гісторыя сустрэчы паэта і цудоўнай жанчынымары перададзена ў часе: персанажы адлюстроўваюцца на скрутку некалькі разоў.

Мова жывапісу Гу Кайчжы стварае сузіральны настрой: вобразы гор, соснаў, водных плыняў акунаюць гледача ў атмасферу прымірэння і душэўнага спакою. Пейзажныя фрагменты гарманічна ўплецены ў апавяданне, з'яўляючыся метафарай прыгажосці чалавечых пачуццяў.

*У жывапісе на скрутках важнае месца займала каліграфія. Як вы думаеце, якія яна выконвала функцыі?*

***Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*** Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Кітая непарыўна звязана з міфалагічнымі ўяўленнямі і складанымі рытуаламі жыхароў Паднябеснай.

З III тысячагоддзя да н. э. захаваліся *размаляваныя гліняныя пасудзіны Яншаа́*. Высокія кубкі, пузатыя збаны і талеркі правільнай круглявай формы здзіўляюць ідэальнымі прапорцыямі і выразнымі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пасудзіна Яншаа (III–II тыс. да н. э.)



Лакавая пасудзіна з г. Чанша (II ст. да н. э.)



Керамічная пасудзіна з Аньяна (II ст. да н. э.)

сілуэтамі. Гэтыя керамічныя вырабы з чырвонай абпаленай гліны пакрыты разнастайным дэкорам з хвалістых і прамых ліній, зігзагаў, спіраляў, кругоў, ромбаў... Даследчыкі лічаць, што падобныя ўзоры сімвалізавалі прыродныя стыхіі. Радзей сустракаліся схематычныя выявы птушак, рыб, жывёл і чалавека. Выраблялі такі посуд як уручную, так і на ганчарным крузе. Затым вырабы абпальваліся і паліраваліся да бляску спецыяльнымі прыстасаваннямі. Іх таксама ўпрыгожвалі роспісам.

Адным з распаўсюджаных узораў, якія выкарыстоўваліся ў дэкоры рытуальных рэчаў і прадметаў побыту, быў стужачны арнамент у выглядзе ломанай пад прамым вуглом лініі. Дынамічна загінастая стужка магла быць як дадаткам да складанага дэкору, так і самастойным узорам. Напрыклад, у дэкоры белай *керамічнай пасудзіны з Аньяна* стужачны арнамент пакрывае амаль усю

**Цікавы факт!**

Таямніцу вырабу фарфору кітайскім майстрам удалося трымаць у сакрэце шмат стагоддзяў. І толькі ў пачатку XVIII стагоддзя нямецкія майстры разгадалі рэцэпт. Але іх фарфор усё роўна адрозніваўся ад кітайскага. Ужо ў сярэдзіне XVIII стагоддзя вытворчасць фарфоравых вырабаў была наладжана і ў Расіі.

паверхню вырабу. Падобныя пасудзіны з белай гліны былі папярэднікамі *фарфору*, тэхналогію якога вынайшлі пазней, у IV–VII стст. Вытанчаныя вырабы, «звонкія, як гонг, тонкія, як папера, зіхатлівыя, як сонечны дзень», сталі вынікам шматвяковых шуканняў старажытнакітайскіх ганчароў.

Геаметрычныя арнаменты высцілаюць паверхню і рытуальных *пасудзін з бронзы*. Ва ўпрыгожванні такіх вырабаў выкарыстоўваліся не толькі лініі і геаметрычныя фігуры. У іх мудрагелістым дэкоры ды і ў саміх формах майстры адлюстравалі персанажаў кітайскай міфалогіі. Рэльефныя выявы цмокаў, быкоў, бараноў, якія шанаваліся як сімвалы дабрабыту, служылі выдатным «адзеннем» такіх пасудзін і адначасова выконвалі ролю магічных знакаў.



Бронзавая рытуальная пасудзіна (II тыс. да н. э.)

Асаблівым гонарам кітайцаў з’яўляюцца вырабы з дрэва, паперы або тканіны, пакрытыя *лакавым жывапісам*. Аснова пакрыцця — сок дрэва, звараны адмысловым спосабам. Колер саставу надавалі мінеральныя фарбавальнікі. Даследчыкі сцвярджаюць, што гэта тэхналогія існавала ўжо ў IV тысячагоддзі да н. э.! Рэцэпт лаку захоўвалі гэтак жа старанна, як і склад фарфору. Вытанчаныя, трывалыя, але лёгкія куфэрачкі, пасудзіны, люстэркі і нават прадметы мэблі цаніліся вельмі высока. Чорна-чырвоная трохногая пасудзіна, знойдзеная на месцы пахавання знатнай дамы ў горадзе Чанша́, упрыгожана спрошчанымі фігуркамі цмокаў. Гэта яскравы прыклад працавітасці і мастацкага густу невядомага кітайскага майстра.

*Якія прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Кітая карыстаюцца попытам у наш час?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Кітайскія майстры, імкнучыся здабыць гармонію, стварылі ўнікальную мастацкую культуру. Трапяткое стаўленне да мастацтва, уласцівае кітайскай культуры, знайшло адлюстраванне ў мастацкім асэнсаванні з'яў навакольнага свету. Творы ўсіх відаў мастацтва праймае надзвычайнае імкненне кітайскіх майстроў да дэталізацыі і сімволікі.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Чым дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Старажытнага Кітая адрозніваецца ад дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва іншых старажытных культур? Назавіце некалькі адрозненняў, пацверджаных мастацкімі прыкладамі (электронны дадатак).

2. У сучасным Кітаі мастацтва каліграфіі па-ранейшаму выклікае глыбокую павагу. Кітайцы асвойваюць іерогліфы рознымі спосабамі: вывучаюць у школе, ствараюць на іх аснове творы мастацтва і нават малююць вялікімі пэндзлямі на асфальце. Як вы думаеце, чаму каліграфія настолькі актуальная ў культуры Кітая ў наш час?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Адным з найбольш распаўсюджаных у Кітаі з'яўляецца іерогліф «чалавек». Ён уяўляе сабой схематычную выяву чалавека. Выкарыстоўваецца ў мностве слоў і сказаў для абазначэння і аднаго чалавека, і мноства людзей.

Акуратна перанясіце гэты іерогліф на паперу. Што падалося вам складаным? Прыдумайце і намалюйце лагатып (эмблему, постар) з яго выкарыстаннем.



Іерогліф «чалавек»

# § 15. МАНУМЕНТАЛЬНАСЦЬ АРХІТЭКТУРЫ І СКУЛЬПТУРЫ СТАРАЖЫТНАГА КІТАЯ

Калыскай старажытнакітайскай цывілізацыі былі даліны буйных рэк. Чаргаванне горных хрыбтоў і глыбокіх лагчын не толькі надзяліла Кітай мяккім кліматам і ўрадлівымі глебамі, але і рабілася прычынай стыхійных бедстваў. Аднак не толькі складаныя



Вялікая Кітайская сцяна (III ст. да н. э.)

прыродныя ўмовы паўплывалі на характар архітэктуры Старажытнага Кітая. Разуменне архітэктурнага збудавання як часткі ландшафту дапамагала дойлідам па-майстэрску ўпісваць будынак у навакольнае асяроддзе.

***Вялікая Кітайская сцяна.*** Самым вядомым і велічным архітэктурным збудаваннем Старажытнага Кітая з'яўляецца *Вялікая Кітайская сцяна*. Яе будаўніцтва было распачата ў III стагоддзі да н. э. для абароны паўночнай мяжы Кітая ад набегаў качэўнікаў. Узводзілася збудаванне не толькі як абарончая сцяна з вартавымі вежамі, але і як адна з лепшых дарог.

Будаўніцтва сцяны вялося адначасова ў некалькіх раёнах. Таму і матэрыялы выкарыстоўваліся розныя. У адных месцах сцяна насыпалася з зямлі і абліцоўвалася цэглай, у іншых — выкладвалася з каменных пліт. Часткова ў яе будаўніцтве былі скарыстаны фрагменты каменных гарадскіх сцен, пабудаваных у папярэднія эпохі.

Шырыня Вялікай Кітайскай сцяны складае пяць-шэсць метраў. Яе вышыня вагаецца: самыя высокія ўчасткі сцяны з байніцамі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Вялікая Кітайская сцяна

і зубчастым завяршэннем дасягаюць дзесяці метраў. Пашырэнне ўнізе надае абарончаму збудаванню большую ўстойлівасць. На адлегласці палёту стралы былі прадугледжаны дазорныя вежы, якія давалі магчымасць воінам трымаць абарону. У моманты небяспекі на вежах запальвалі сігнальныя агні.

Будаўніцтва Вялікай Кітайскай сцяны расцягнулася амаль на 2000 гадоў. Даўжыня гэтай зубчастай звілістай стужкі перавышае 3000 кіламетраў! Нягледзячы на сваё суровае аблічча, Вялікая Кітайская сцяна нібы струменіцца лёгкай стужкай па вяршынях горнага ланцуга, гарманічна зліваючыся з прыродным асяроддзем. Яе існаванне сцвярджае ідэю велічы кітайскай цывілізацыі.

*Жыхары Паднябеснай называюць Вялікую Кітайскую сцяну «зямляным драконам». Якія канструктыўныя дэталі падказалі такі вобраз?*

***Прыгажосць і гармонія традыцыйнага жылля.*** Пры будаўніцтве жылых дамоў у Старажытным Кітаі ў асноўным выкарыстоўвалі гліну і дрэва. Недаўгавечнасць гэтых матэрыялаў тлумачыць, чаму да нашага часу не дайшлі прыклады тагачаснай жылой архітэктуры. Пра тое, як былі ўладкаваны дамы, можна даведацца пры вывучэнні археалагічных знаходак.

Кожнай сям'і патрабавалася жыллё з вялікай колькасцю памяшканняў, бо пад адным дахам жыло некалькі пакаленняў. Усе жылыя

памяшканні размяшчаліся вакол унутранага дворыка, туды ж выходзілі ўсе вокны і дзверы.

Дом багатых людзей часта ўключаў у сябе шматпавярховае збудаванне накшталт вежы. Яно адлюстравана ў *керамічнай мадэлі дома*, знойдзенай пры раскопках старажытнага горада ў правінцыі Хэна́нь. Майстар стварыў з гліны копію чатырохпавярховага дома. Керамічная мадэль вышынёй 155 сантыметраў да драбнюткіх дэталяў перадае аблічча жылля.

Перад уваходам у дом — невялікі дворык. Туды можна патрапіць праз вялікія вароты, якія падтрымліваюцца слупамі. Слупамі быў умацаваны і каркасны дах. Першыя два паверхі жылля найбольш масіўныя. Кожны наступны паверх крыху меншы па памерах і завяршаецца асобным дахам. Кожны паверх дома ўпрыгожаны па-свойму: сцены першых двух пакрывае жывапіс, а трэці выдзелены ажурнай агароджай балкона. Цікава, што дахі выступалі далёка за межы дома. Магчыма, такім спосабам людзі засцерагалі сваё жыллё ад ападкаў і ратаваліся ад пякучага сонца. Бо такі дах даваў цень на ўвесь паверх. Самі кітайцы форму даху параўноўвалі з разгорнутымі ў палёце крыламі фазана.



Керамічная мадэль кітайскага жылога дома (І–ІІ стст.)



Пахавальны рэльеф дынастыі Хань. Фрагмент (ІІІ ст. да н. э. — ІІІ ст. н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У палацавыя комплексы вяльможаў і імператараў акрамя жылых палацаў уваходзілі і *павільёны* — лёгкія будынкі на слупах з каркасным дахам, вокны якіх служылі «рамай» для зменлівых карцін навакольнай прыроды. На пахавальным рэльефе дынастыі Хань бачна, што ў такіх павільёнах ладзіліся прыёмы — запрошаныя займаліся творчасцю, музіцыравалі, дзяліліся ўражаннямі.

*Як вы думаеце, чаму ў сучаснай культуры Кітая па-ранейшаму выкарыстоўваюцца архітэктурныя формы, якія з'явіліся тысячы гадоў таму?*

***Кітайскія пагады.*** З распаўсюджваннем будызму ў кітайскай архітэктуры з'явіўся новы тып пабудоў — *пáгада*. Гэтыя велічныя будынкі, якія сімвалізуюць мудрасць і духоўнасць кітайскай культуры, узводзілі ў самых маляўнічых мясцінах. «Вежы скарбаў» з'яўляліся сховішчамі будысцкіх рэліквій.

Кітайскія пагады мелі шмат'ярусную форму, якая звужалася да вяршыні. Такая форма сімвалізавала духоўнае імкненне да вышэйшых ісцін. Пагады ідэальна ўпісваюцца ў навакольны пейзаж, дапаўняючы прыроднае асяроддзе і прыцягваючы да сябе ўвагу як мясцовых жыхароў, так і турыстаў з усяго свету.

*Пагада Сун'юэ* — яркі прыклад старажытнакітайскіх пагад. Своеасаблівым пастаментам для гэтага шмат'яруснага збудавання вышынёй 40 метраў стаў высокі першы ярус. Усе астатнія ярусы



Пагада Сун'юэ каля гары Суншань (VI ст.)

маюць характэрны дах з выгнутымі канцамі. Многія архітэктурныя элементы пагады ўпрыгожаны вытанчанай разьбой у выглядзе кветак лотаса і «палымнеючых жамчужын».

*Даследчыкі сцвярджаюць, што сакрэт кітайскіх пагад заключаецца ў яднанні найвышэйшай гармоніі, старажытнай мудрасці і прыроднай прыгажосці. Дакажыце справядлівасць гэтага выслоўя пры апісанні пагады Сун'юэ каля гары Суншань.*

***Падземны палац і «тэракотавая армія».*** Адно са збудаванняў, што найбольш уражвае, падземнае *месца пахавання імператара Цынь Шыхуандзí*. Па захаваных апісаннях і фрагментах пахавання можна ўявіць веліч царскага пахавання.

Магільны склеп меў мноства залаў, у адной з якіх быў пахаваны імператар. Афармленне галоўнай залы ўзнаўляла той свет, у якім



«Тэракотавая армія». Статуі воінаў з месца пахавання імператара Цынь Шыхуандзі (III ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

уладарыў Цынь Шыхуандзі. Рэльефныя сілуэты ўзгоркаў і гор, далін і выгінаў рэк на падлозе захоўвалі вобраз вялікай імперыі. Скляпенне было падобна да нябёсаў, на якіх, нібы зоркі, зіхацелі каштоўныя камяні і жамчужыны.

Пахаванне ўключала і знакамітую *«тэракотавую армію»*. З гліны амаль у натуральную велічыню майстрамі былі створаны шматлікія вобразы засяроджаных салдат, суровых афіцэраў, велічных военачальнікаў. Армію суправаджаюць калясніччыя, музыкі, чыноўнікі.

Скульптары адлюстравалі індывідуальнасць кожнага воіна. Кожны вобраз адрозніваецца не толькі рысамі твару, але і эмоцыямі, жэстамі. Дакладна перададзены дэталі вопраткі кожнага воіна.

*Падумайце, якія складанасці ўзнікалі ў майстроў у працэсе стварэння і захавання «тэракотавай арміі».*

**Цікавы факт!**
«Тэракотавая армія» была знойдзена зусім нядаўна — у 1974 годзе. Кітайскі землеўладальнік, капаючы калодзеж, выпадкова натрапіў рыдлёўкай на галаву статуі. Знаходкі такога маштабу ў гісторыі мастацтва лічаць найвялікшай падзеяй.

Архітэктура Старажытнага Кітая адлюстроўвала маральныя ідэалы і каштоўнасці гэтай краіны, багацце ўнутранага свету чалавека і яго імкненне да найвышэйшых ісцін. Вытанчанасць рукатворных формаў падкрэслівалася прыгажосцю прыроднага асяроддзя. Скульптурныя вобразы чалавека перадавалі яго сілу, мудрасць і баявы дух.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Параўнайце асаблівасці кітайскай архітэктуры з архітэктурнымі збудаваннямі іншых старажытных культур. Свае высновы пацвердзіце мастацкімі прыкладамі (электронны дадатак).

2. Уявіце, што вы археолаг, які знайшоў «тэракотавую армію». Ваша задача — упершыню распавесці пра гэту знаходку. Уключыце ў свой тэкст дэталі пра раскопкі, пра значэнне войска для імператара, а таксама пра тое, якія загадкі яшчэ засталіся неразгаданымі.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Падрыхтуйце для аднакласнікаў віртуальную экскурсію па старажытнакітайскай архітэктуры. Звярніце ўвагу ў сваім аповедзе на ключавыя ідэі старажытнакітайскай культуры, якія адлюстроўваюцца ў архітэктурных збудаваннях. Уважліва пастаўцеся да падбору мастацкіх ілюстрацый. Прыдумайце для экскурсіі арыгінальную назву.

## § 16. ТВОРЧЫ ЎРОК. ПАВЕТРАНЫ ЗМЕЙ

Адным з найстаражытнейшых вынаходстваў жыхароў Кітая з'яўляецца *паветраны змей*. Гэтай «цаццы», здольнай лунаць у небе, каля 2500 гадоў. Змеяў выкарыстоўвалі з рознымі мэтамі: для назірання за ворагам у час вайны або адпужвання злых духаў і прыцягнення ўдачы ў рытуальных і святочных цырымоніях. Мянялася таксама і канструкцыя паветраных змеяў, тэхналогіі і матэрыялы. Паводле гістарычных звестак, іх рабілі з бамбуку, паперы ці шоўку.



У час Міжнароднага фестывалю паветраных змеяў у Кітаі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| Матэрыялы: | Этапы працы: |
|---|---|
| дзве доўгія бамбукавыя шпажкі; ліст паперы фармату А4; празрысты скотч; нажніцы; шпулька трывалых нітак; іголка з шырокім вушкам; утулка ад папяровага ручніка; просты аловак; лінейка; навагодні «дождждык»; матэрыялы для ўпрыгожвання | **1. Ствараем «хрыбет» змея**. Разразаем адну са шпажак на дзве часткі ў прапорцыі 2 : 1 і злучаем іх у форме крыжа з дапамогай скотча.<br>**2.** Прыкладаем «хрыбет» на ліст паперы і алоўкам адзначаем яго даўжыню і шырыню. Выразаем атрыманы ромб, пакідаючы прыпускі ў 1–1,5 см. Мацуем канструкцыю да паперы скотчам. Заварочваем прыпускі, загортваючы канцы шпажак. Мацуем скотчам вуглы атрыманага ветразя.<br>**3. Робім «аброць» змея**. Прасоўваем у іголку нітку, у два разы даўжэйшую, чым шырыня хрыбта. Праколваем дзве адтуліны па абодва бакі ад шпажак на адным з вуглоў крылаў ветразя. Цягнем нітку і завязваем яе вузлом. Мацуем месца праколу скотчам з двух бакоў. Другі канец ніткі прымацоўваем на другім крыле.<br>**4.** Другую частку «аброці» мацуем у вугле «носа» ветразя і пасярэдзіне доўгай шпажкі. Абедзве часткі «аброці» звязваем вузлом.<br>**5. Ствараем ле́ер** — нітку, з дапамогай якой змеем кіруюць. Яго даўжыня залежыць ад вышыні палёту. Адмотваем патрэбную даўжыню на ўтулку ад паперы, другі канец трывала мацуем на вузле «аброці».<br>**6.** Апошні штрых — дэкарыруем хвост і крылы паветранага змея з дапамогай навагодняга «дождждыку» або рознакаляровых нітак. Ветразь — любой даступнай тэхнікай (акварэль, фламастары, аплікацыя). **Тут неабходныя толькі ваша ўяўленне і фантазія!** |

Паветраныя змеі папулярныя і сёння. Напрыклад, у Міжнародны дзень паветранага змея ў неба ўзнімаюцца фігуры цмокаў, рыб, птушак, міфалагічных персанажаў і нават прадметаў побыту.

Вырабіць самага простага паветранага змея зможа кожны. Падрыхтуйце неабходныя матэрыялы і выконвайце этапы працы.

Раздзел 4

# АТЛАНТЫ І КАРЫЯТЫДЫ: МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ



**Леа фон Кле́нцэ.** Афінскі акропаль (1846)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 17. МАСТАЦКАЯ ФАНТАЗІЯ КРЫТА-МІКЕНСКАГА МАСТАЦТВА

Антычная культура — унікальная з'ява, якая заклала асновы еўрапейскай культуры. Яна прапанавала свету мастацкія творы, якія сталі ўзорам для пераймання на многія тысячагоддзі. А калыскай антычнай культуры была непаўторная *кры́та-міке́нская цывілізацыя*.

***Мастацтва Крыта.*** Мастацтва квітнеючага вострава адрознівалася ад мастацтва іншых рэгіёнаў сваім характарам — адкрытым, жыццярадасным, міралюбным. Гэта выяўлялася ва ўсіх відах мастацкай творчасці.





Кноскі палац (XVI ст. да н. э.). Рэканструкцыя

У архітэктуры пераважалі збудаванні, не адгароджаныя ад навакольнага свету глухімі непрыступнымі сценамі. *Крыцкія палацы* ветліва расчыняліся праз шматлікія лесвіцы, тэрасы. У адным з палацаў Крыта — *Кно́скім палацы* — шматлікія пакоі і залы злучаліся лесвіцамі і тэрасамі з пурпурна-чырвонымі калонамі рознай велічыні. Палац меў такую заблытаную планіроўку, што яго атаясамлівалі з легендарным *Лабірынтам Мінатаўра*.

Асаблівасцю палацавай архітэктуры Крыта было выкарыстанне *светлавых калодзежаў* для асвятлення ўнутранай прасторы. Невялікія, але светлыя і ўтульныя памяшканні Кноскага палаца ўпрыгожвалі яркія *фрэскі*. На іх мы не сустрэнем сюжэтаў узброенай



Гульні з быком.
Фрэска з Кноскага палаца
(XVI ст. да н. э.)



Дамы ў блакітным.
Фрэска з Кноскага палаца
(XVI ст. да н. э.)

барацьбы, выяў суровых багоў або замагільнага свету, як у творах іншых старажытных культур.

На *фрэсцы, прысвечанай гульням з быком*, можна разгледзець і загадкавы рытуал, звязаны з культам дзікіх і неўтаймаваных сіл прыроды, і спартыўнае спаборніцтва. Малады ўдзельнік пераскоквае праз спіну чырвонага быка з дзіўнай лёгкасцю і ўпэўненасцю. Мастак змог перадаць свабоду, непасрэднасць, нястрымны запал юнацкасці. На *другой фрэсцы выяўлены дамы ў яркіх, вытанчаных уборах*, з заплеценымі косамі і локанамі, што

**Цікавы факт!**
У XIX стагоддзі англійскі даследчык Артур Эванс здолеў адшукаць месца, дзе знаходзіўся Кноскі палац. Там ён зрабіў рэканструкцыю збудавання. Сёння востраў Крыт — адзін з самых прывабных турыстычных аб’ектаў.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне





Ваза з васьміногам
(II тыс. да н. э.)

Ваза з марской тэматыкай
(рубеж XVI–XV стст. да н. э.)

струменяцца, нібы змейкі. У іх усмешках, лёгкіх, зграбных рухах адчуваюцца радасць, какецтва.

У керамічных вырабах адной з галоўных тэм была прыгажосць навакольнага свету і прыроды. Старажытныя майстры спрабавалі яе ўвасобіць у *кераміцы Кама́рэс*, якая атрымала сваё найменне па назве паселішча, у пячоры якога яна была знойдзена. Майстры выказвалі ў ёй сваё захапленне перад разнастайнасцю і багаццем прыроды, якую яны абагаўлялі. Уражваюць арганічнымі формамі і самі пасудзіны, і роспісы на іх. Фантазійныя кветкавыя і спіральныя матывы наносілі на чорны матавы фон вырабаў белай, аранжавай або чырвонай фарбай.

Не менш папулярная была і *кераміка з марской тэматыкай*. Керамічныя вырабы з абцякальнымі формамі ўсеяны ракавінкамі, караламі, дэльфінамі. Палюбуйцеся на звівістага васьмінога, які ўпрыгожвае адну з крыцкіх ваз. Здаецца, што ён жывы і злёгку калышацца ўнутры пасудзіны. Ні ў якой іншай старажытнай культуры мы не знойдзем падобнай натуральнай выявы. У ёй адчуваецца ўласцівае мастацтву Крыта свабоднае творчае мысленне, не скаванае канонамі.

*Разгледзьце прыклады мастацтва вострава Крыт (электронны дадатак). Якое ўражанне на вас яно зрабіла?*

***Мастацтва Мікен і Тырынфа.*** Культура, якая папярэднічала грэчаскай, развівалася не толькі на астравах Міжземнага мора, але і ў гарадах-дзяржавах на мацерыку — *Тыры́нфе* і *Міке́нах*. Там дагэтуль захаваліся магутныя *крэпасці*, збудаваныя плямёнамі мужных ахейцаў. Складзеныя з велізарных, груба апрацаваных каменных глыб, яны адрозніваюцца ад крыцкіх пабудоў грознай суровасцю. Пазней грэкі назавуць гэту архітэктуру *цыклапі́чнай*. Яны меркавалі, што ўзвесці падобнае маглі толькі аднавокія гіганты — цыклопы.



Ільвіныя вароты ў Мікенах (XIV ст. да н. э.)

Для *роспісаў* у Тырынфе і асабліва ў Мікенах характэрны сюжэты, звязаныя з вайной ці паляваннем. Іх галоўны герой — мужчына-воін. Нават жаночыя выявы знаходзіліся пад уплывам гэтага вобраза. Моцна разгорнутыя шырокія плечы, рашучы профіль з цяжкім падбародкам... У мікенскіх выявах няма далікатнасці і вытанчанасці крыцкага мастацтва.



Ваза з воінамі, Мікены (XIII ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Ахейцы былі вельмі ваяўнічымі плямёнамі. Менавіта яны ў III стагоддзі да н. э. заваявалі *Трою* — багаты горад-дзяржаву ў Малой Азіі. У канцы XIX стагоддзя на тэрыторыі цяперашняй Турцыі навукоўцы раскапалі спаленую Трою, а ў Мікенах выявілі грабніцы ахейскіх правадыроў. Легенда пра багатыя на золата Мікены пацвердзілася мноствам знойдзеных у пахаваннях залатых прадметаў.



Залатая «Маска Агамемнана», Мікены (XVI ст. да н. э.)

Самымі цікавымі знаходкамі з'яўляюцца *залатыя пахавальныя маскі*. Ад твораў крыцкіх мастакоў мікенскія выявы адрозніваюцца большым схематызмам. Але ў дадзеным выпадку стрыманасць выканання толькі ўзмацняе мастацкі эфект. Бровы, вусы і барада мікенскага правадыра перададзены ўмоўнымі насечкамі. Шчыльна зведзеныя павекі і вусны прачаканены адной рэзкай лініяй. Смерць завастрыла кожную рысу на твары мужнага ахейца. Але нават яна не змагла пазбавіць яго выразу грознай, ваяўнічай сілы. Навукоўцы назвалі гэты залаты вобраз імем цара Мікен — Агаме́мнана.

*Падумайце, у чым заключаецца своеасаблівасць мастацтва гарадоў-дзяржаў Мікен і Тырынфа.*

Крыта-мікенская цывілізацыя адрознівалася ад усіх старажытнаўсходніх культур творчай свабодай і мастацкай фантазіяй. Гэта знайшло адлюстраванне ў планіроўцы архітэктурных збудаванняў, у сюжэтах роспісаў, у формах керамічных вырабаў. Удзячныя грэкі назаўжды захавалі памяць пра гэту яркую і самабытную культуру.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Жыхары Крыта чуйна рэагавалі на прыгажосць навакольнага свету. Разгледзьце на старонках параграфа і ў электронным дадатку фрэскі з Кноскага палаца. З дапамогай якіх сродкаў мастакам удалося перадаць багацце прыроднага свету?

2. Рускі паэт XX стагоддзя Валерый Брусаў адзін са сваіх твораў прысвяціў крыцкай кераміцы. Прачытайце ўрывак з верша. На якія асаблівасці ваз звярнуў увагу паэт?

... Как исхищрённы их узоры,
Ласкающие сладко взоры:
В запутанности линий гнутых,
То разомкнутых, то сомкнутых,
Как много жизни претворённой, —
Пресыщенной и утомлённой
Холодным строем красоты,
В исканьях новой остроты!
И вот, причудливо согнуты,
Выводят щупальцами спруты
По стенкам нежные спирали;
Плывут дельфины на бокале,
И безобразны, и прекрасны...

*В. Брюсов.*
*Эгейские вазы (отрывок)*

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

1. Міф пра тое, як Тэсей перамог Мінатаўра, — адна з найбольш захапляльных старажытнагрэчаскіх гісторый. Пазнаёмцеся з яго зместам у інфармацыйных крыніцах. Паглядзіце анімацыйны фільм А. Сняжко-Блоцкай «Лабірынт. Подзвігі Тэсея». Растлумачце, як гісторыя Тэсея і Мінатаўра звязана з Кноскім палацам.

2. Спраектуйце свой варыянт лабірынта з любых даступных падручных матэрыялаў (запалкі, скрынкі, канструктар «Лега», папера і інш.) або намалюйце яго.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 18–19. ОРДАРНАЯ СІСТЭМА Ў СТАРАЖЫТНАГРЭЧАСКАЙ АРХІТЭКТУРЫ

Старажытнагрэчаская архітэктура адрозніваецца разнастайнасцю збудаванняў культавага і грамадскага прызначэння. Дагэтуль не знойдзена дзвюх аднолькавых пабудоў. Кожнае збудаванне — ад невялікіх храмаў да бібліятэк і тэатраў — мела індывідуальнае аблічча. Вялікую ролю ў гэтым адыграла вынаходніцтва грэкаў, якое атрымала назву «ордар».

***Што такое ордар.*** У аснову *архітэктурнага ордара* пакладзена *стойкава-бэлечная канструкцыя*, *якая складаецца з вертыкальнай калоны* і *гарызантальнай бэлькі*. Але гэта не звыклая нам канструкцыя. Дойліды асаблівым чынам — па-мастацку — прапрацавалі кожны элемент, кожную дэталь ордара. Вертыкальная калона — апорная (якая падтрымлівае) канструкцыя, а бэлька — нясучая (якая перакрывае).



Ордар. 1. Вертыкальная апора (калона). 2. Гарызантальнае перакрыцце (бэлька)

Ордар узнік як практычная неабходнасць пры будаўніцтве каменных храмаў. Бо, у адрозненне ад жылых пабудоў, храм узводзілі на стагоддзі. Жыллё багоў павінна было, з аднаго боку, быць трывалым і надзейным, а з другога — уражваць маштабамі і ўбраннем. Таму грэкі з матэматычнай дакладнасцю, да драбнюткіх дэталяў, узгаднялі ўсе элементы канструкцый і дэкору збудавання.

Нягледзячы на адзіную схему, грэчаскія архітэктары здолелі распрацаваць тры розныя ордары. Кожны з іх меў свае асаблівасці. Сама канструкцыя ва ўсіх ордараў была аднолькавая, а прапорцыі, формы і дэкор элементаў адрозніваліся.

*Як вы разумееце паняцце «архітэктурны ордар»? Назавіце асноўныя элементы старажытнагрэчаскага ордара. Якое яго галоўнае прызначэнне?*

***Ордарная сістэма.*** З’яўленне ордарнай сістэмы найперш звязана з пераасэнсаваннем і «пераносам» канструкцый з драўлянага дойлідства ў каменную архітэктуру.

Самым старажытным ордарам з’яўляецца *дарычны*. Сваю назву ён атрымаў ад дарыйскіх плямёнаў. Дарыйцы пачалі ўзводзіць храмы і іншыя збудаванні, у якіх імкнуліся ўвасобіць гармонію прыгажосці і карысці — асноўную ідэю старажытнагрэчаскай культуры. Храм, збудаваны ў дарычным стылі, адрозніваецца масіўнасцю, прастатой і лаканічнасцю дэкаратыўных дэталяў. Навукоўцы звязваюць гэта з ідэяй мужнасці і стойкасці старажытных грэкаў. Невыпадкова дарычны ордар называюць «мужчынскім».

Пазней узнік *іанічны ордар*. Сваю назву ён атрымаў ад плямёнаў іанійцаў, што засялялі адну з абласцей Старажытнай



Прыклад дарычнага ордара. Храм Геры I у Пе́стуме (VI ст. да н. э.)



Прыклад іанічнага ордара. Храм Нікі Аптэрас у Афінах (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Грэцыі — Іонію. Іанічны ордар адрозніваецца ад дарычнага большай лёгкасцю, пластычнасцю і багаццем дэкаратыўных дэталяў. У складнасці яго формаў угадваецца «жаноцкасць».

Пошук новых ідэй у архітэктуры прывёў да з'яўлення больш позняга ордара — *карынфскага*. Яго стваральнікам лічаць скульптара з горада Карынфа. Карынфскі ордар аб'яднаў у сабе ўсё лепшае, што было ў папярэдніх ордарах: канструктыўнасць, лёгкасць і грацыёзнасць. Невыпадкова яго называюць «дзявочым» ордарам.

Карынфскі ордар надае архітэктуры ўрачыста-трыумфальны характар. Таму ён лічыцца эталонам прыгажосці ў еўрапейскім дойлідстве. Карынфскі ордар атрымаў шырокую вядомасць і стаў самым запатрабаваным у наступныя эпохі: у рымскай культуры, культуры эпохі Адраджэння, у мастацтве XIX стагоддзя.



Прыклад карынфскага ордара. Храм Зеўса, Афіны
(VI ст. да н. э. — II ст. н. э.)

*Падумайце, якую мастацкую каштоўнасць уяўляе архітэктурны ордар.*

***Як уладкаваны ордар.*** Галоўныя структурныя элементы кожнага ордара — *аснова*, *апора* і *перакрыцце*. Пры нязменнасці гэтых элементаў усе ордары атрымалі свае мастацкія асаблівасці.

<table>
<tr><th>Дарычны ордар</th><th>Іанічны ордар</th><th>Карынфскі ордар</th></tr>
<tr><td>
</td><td>
</td><td>
</td></tr>
<tr><td colspan="3">1. База — ніжняя частка калоны (чаргаванне выступаў-валікаў і прарэзаных кольцаў, якія апяразваюць калону).<br>2. Ствол калоны — сярэдняя частка (упрыгожваецца падоўжнымі жалабкамі, якія надаюць калонам стройнасць).<br>3. Капітэль — верхняя частка калоны (дэкаратыўна аформлена).<br>4. Антабleме́нт — верхняя, нясучая частка стойкава-бэлечнай канструкцыі.</td></tr>
<tr><td>Няма базы</td><td>База ў выглядзе прыступак</td><td>База ў выглядзе прыступак</td></tr>
<tr><td>Ствол калоны звужаецца знізу ўверх, як ствол дрэва</td><td>Ствол калоны больш вытанчаны ў параўнанні з дарычным, толькі злёгку пашыраецца да базы</td><td>Ствол калоны найбольш вытанчаны і элегантны з усіх</td></tr>
<tr><td>Капітэль мае простую форму, якая складаецца з дзвюх геаметрычных фігур</td><td>Капітэль адрозніваецца большай вытанчанасцю. Яе ўпрыгожваюць дзве валюты — завіткі</td><td>Капітэль адрозніваецца асаблівай пышнасцю. Мае выгляд кошыка з двума радамі лісця, падзеленага некалькімі сцёбламі з валютамі</td></tr>
<tr><td>Антаблемент мае разнастайны дэкор. Упрыгожваецца рэльефамі, падзеленымі вертыкальнымі жалабкамі</td><td>Антаблемент шматступеньчаты. Можа ўпрыгожвацца дэкаратыўнай стужкай з рэльефамі</td><td>Антаблемент шматступеньчаты, але больш складаны ў параўнанні з іанічным. Упрыгожваецца дробнымі ляпнымі дэталямі</td></tr>
</table>



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Асаблівую прыгажосць і спецыфічны характар архітэктурнаму ордару надавала *капітэль*. У дарычным ордары яна была без пышнага дэкору. У іанічным ордары капітэль мела два стромкія завіткі, якія па форме нагадвалі ку́чары. Капітэль у карынфскім ордары ўражвала наборам дэкаратыўных элементаў: дэталёва «вылепленае» лісце ў некалькі радоў, валюты і рэльефныя арнаментальныя палосы.



Капітэль дарычнага ордара



Капітэль іанічнага ордара



Капітэль карынфскага ордара

*Выканайце схематычны малюнак аднаго са старажытнагрэчаскіх ордараў (капітэлі). Пакажыце ў малюнку спецыфічныя асаблівасці ордара (капітэлі).*

Ордарная сістэма, прапанаваная грэкамі, была пакладзена ў аснову збудаванняў не толькі жыхароў Элады, але і іншых цывілізацый. Прымяненне ордара ў архітэктуры дазволіла па-мастацку асэнсаваць каменныя канструкцыі. У наступныя эпохі дойліды ўсяго свету звярталіся да грэчаскага ордара як да ўзору.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Архітэктурны ордар складаецца з некалькіх элементаў. Але ён не дапускае нічога лішняга. Усе элементы канструкцыі і дэкору знаходзяцца на строга вызначаным месцы (электронны дадатак). Чаму, на ваш погляд, ордарная сістэма звязваецца з парадкам? Аргументуйце сваю пазіцыю.

2. Знакаміты закон вялікага старажытнарымскага дойліда Вітрувія абвяшчае: «Трываласць, карысць, прыгажосць». Як вы разумееце гэты выраз у дачыненні да старажытнагрэчаскіх ордараў?

ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Захаванне помнікаў архітэктуры Рэспублікі Беларусь з'яўляецца адной з прыярытэтных задач дзяржаўнай палітыкі. Да такіх помнікаў адносіцца будынак Галоўпаштамта ў горадзе Мінску — адзін з сімвалаў беларускай сталіцы. У час нядаўняй рэстаўрацыі фасадаў будынка асаблівае значэнне надавалася калонам з элементамі старажытнагрэчаскага ордара.

У якіх збудаваннях Беларусі сустракаюцца элементы архітэктурнага ордара? Падрыхтуйце для аднакласнікаў фотавіктарыну з фотафрагментамі архітэктурных збудаванняў Беларусі (вашага рэгіёна, вобласці), у якіх выкарыстаны элементы ордараў.



Будынак Галоўпаштамта ў Мінску (1949–1953)

## § 20. ГРЭЧАСКІ ХРАМ — ІДЭАЛ ГАРМОНІІ І ПРЫГАЖОСЦІ Ў АРХІТЭКТУРЫ

Галоўным тыпам збудаванняў у Старажытнай Грэцыі быў храм — прыстанак багоў. У яго архітэктуры ўвасабляліся самыя яркія мастацкія ідэі. Для будаўніцтва храмаў выкарыстоўвалі каштоўныя матэрыялы, якія нярэдка дастаўлялі з розных гарадоў мацерыка і нават з-за мора.

***Якім быў старажытнагрэчаскі храм.*** Грэкі лічылі храм найвышэйшай духоўнай, мастацкай і матэрыяльнай каштоўнасцю. Ён быў свайго роду скарбніцай мастацтва. Таксама ў ім захоўвалася гарадская казна.

Узводзілі храмы ў цэнтры гарадской плошчы на адкрытай прасторы. Фасад храма быў звернуты на ўсход, да сонца. Унутры ставілі статую бажаства, у гонар якога ён быў пабудаваны. Алтар для ахвярапрынашэнняў спачатку таксама размяшчаўся ўсярэдзіне храма. З часам яго сталі будаваць перад уваходам у дом багоў, каб усе грамадзяне маглі прымаць удзел у святых рытуалах. Бо ўваходзіць у старажытнагрэчаскі храм мелі права толькі жрацы і іх памочнікі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Узор перыптара. Храм Геры II (або храм Пасейдона) у Пестуме (V ст. да н. э.)

Найбольшае распаўсюджванне атрымаў тып храма *пеы́птар* — прамавугольнае збудаванне, акружанае па перыметры калонамі. Перыптары адрозніваліся паміж сабой маштабам і колькасцю калон, а таксама дэталямі ўбрання.

*Старажытнагрэчаскі храм лічаць узорам прыгажосці ў архітэктуры (электронны дадатак). Як вы думаеце, чаму?*

***Афінскі акропаль.*** Галоўныя храмы гарадоў-дзяржаў будаваліся ў *акропалі* — верхнім горадзе. Адначасова акропаль быў і самым умацаваным месцам: тут у час ваенных дзеянняў хаваліся гарадскія жыхары. Размяшчаўся верхні горад на ўзвышшы. Ніжні горад — асноўнае паселішча грамадзян Элады — знаходзіўся ля падножжа ўзгорка, вакол акропаля.



Афінскі акропаль (V ст. да н. э.)

Уяўленне пра тое, як выглядаў верхні горад у перыяд росквіту старажытнагрэчаскага дойлідства, дае архітэктурны ансамбль Афінскага акропаля. Узведзены на скалістай вяршыні ў асяроддзі трох пагоркаў і марской стыхіі, ён і дагэтуль трыумфуе над размешчанай ля падножжа забудовай. Архітэктурныя збудаванні Акропаля зрабіліся ўвасабленнем гераізму і адвагі воінаў, пераможнай славы, сілы і магутнасці Старажытнай Грэцыі. Афінскі акропаль належыць да Сусветнай культурнай спадчыны.

*З якімі з архітэктурных збудаванняў Афінскага акропаля вы пазнаёміліся на ўроках мастацтва, гісторыі раней? Раскажыце пра іх.*

***Прапілеі.*** Уваход у Афінскі акропаль ажыццяўляўся праз *Прапілéі* — парадныя вароты. Праз іх на святую тэрыторыю праходзілі святочныя шэсці ў гонар багіні Афіны. Рухаючыся ў павольным тэмпе, знатныя асобы неслі дары і ахвярапрынашэнні заступніцы горада.



Прапілеі. Архітэктар Мнесíкл (V ст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

Манументальныя архітэктурныя формы Прапілеяў, якія не мелі дэкаратыўных празмернасцей, стваралі адчуванне святочнай атмасферы і ў той жа час настройвалі ўдзельнікаў працэсіі на свяшчэнны абрад. Шэсць масіўных калон дарычнага ордара, нібы каменныя вартавыя, ахоўвалі святое месца. Цэнтральны праём быў значна большым і дазваляў галоўным удзельнікам абраду праехаць конна.

*Падумайце, чаму Прапілеі атрымалі ўрачыстыя і масіўныя формы. Якую ролю адыгрывала гэта збудаванне ў ансамблі Афінскага акропаля?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Парфенон — галоўны храм Афінскага акропаля.*** *Парфенон* быў збудаваны ў гонар Афіны Парфе́нас (Афіны Дзевы). Усярэдзіне храма знаходзілася яе 12-метровая статуя, выкананая скульптарам Фі́дыем. Прыгожая багіня, апранутая ў доўгія залатыя адзенні, у высокім шлеме, са шчытом і дзідай у руках, уражвала моцай і велічнасцю.

Скарб Акропаля, Парфенон, захапляў формамі, маштабам і дэкорам. Храм быў узведзены на самай вяршыні скалы. Гэта вылучала яго з усяго ансамбля. Па планіроўцы Парфенон — адзін



Парфенон. Архітэктары Іктын і Калікрат (V ст. да н. э.)

з самых яркіх узораў дарычнага перыптара. Для яго збудавання дойліды І́ктын і Калікра́т выкарыстоўвалі белы мармур, які надаў архітэктуры святочнае аблічча.

Важную ролю ў архітэктуры храма мела і скульптура. Мастакі пад кіраўніцтвам скульптара Фідыя захавалі ў рэльефах міфалагічныя сюжэты, сцэны падрыхтоўкі да здзяйснення свяшчэннага

**Цікавы факт!**
Залатыя дэталі статуі Афіны важылі больш за тону! Паводле парады Перыкла ўсе яны былі зроблены здымнымі. Кожныя чатыры гады іх вага правяралася, бо адзенне багіні ўяўляла сабой залатую казну дзяржавы.



Фрагмент фрыза Парфенона
(V ст. да н. э.)

абраду ў гонар Афіны і само парадна шэсце. Тут можна было пабачыць і спрэчку багіні з Пасейдонам, і фігуру Дыяніса, і загадкавых кентаўраў. А таксама коннікаў і людзей, якія нясуць кошыкі з дарамі. Каменны летапіс жыцця афінян выглядае святочным і гарманічным.

*Як вы думаеце, чаму рэльефы былі размешчаны не толькі ўсярэдзіне, але і звонку храма?*

***Чым незвычайны Эрэхтэён.*** Скульптура не заўсёды служыла толькі багатым убраннем храмаў Старажытнай Грэцыі. У Эрэхтэёне, адным з праслаўленых на ўвесь свет збудаванняў Афінскага акропаля, у якасці калон дойліды выкарыстоўвалі пластычныя вобразы дзяўчат — *карыятыд*.

Шэсць дзяўчат у доўгім спадаючым адзенні пакорліва застылі пад цяжарам ношы. Злёгку нахіліўшы галовы, яны скіравалі погляд удалячынь, быццам вітаючы рэдкага наведвальніка.



Эрэхтэён
(V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Порцік карыятыд
(V ст. да н. э.)

Эрэхтэён быў пабудаваны ў гонар Афіны, Пасейдона і міфічнага цара Афін — Эрэхтэ́я. Афіна і Пасейдон паспрачаліся пра тое, хто з іх прынясе гораду больш карысці. Пасейдон у спрэчцы стукнуў аб скалу акропаля трызубцам, і ў гэтым месцы ўтварылася «Эрэхтэ́ева мора» (калодзеж з марской вадой). Афіна, у сваю чаргу, уваткнула дзіду ў скалу, і зброя ператварылася ў аліўкавае дрэва. Эрэхтэй вырашыў, што дар Афіны больш дабратворны для людзей, і прысудзіў перамогу ёй.

Мудрыя грэкі разважылі, што для горада карысныя дары абодвух багоў. У іх гонар яны і пабудавалі ўнутры храма Эрэхтэёна два свяцілішчы — Афіны і Пасейдона. У адным з памяшканняў у падлозе была зроблена адтуліна, праз якую быў бачны след Пасейдонавага трызубца. Тут жа знаходзіўся і калодзеж. У другім памяшканні расло аліўкавае дрэва.

*Разгледзьце ў электронным дадатку план-схему Акропаля. Знайдзіце на ёй усе помнікі архітэктуры, з якімі вы пазнаёміліся ў параграфе.*

Храмы Старажытнай Грэцыі ствараліся дойлідамі як узор вытанчанасці і прыгажосці. У іх вобразах знайшлі выражэнне галоўныя ідэі старажытных грэкаў — спалучэнне логікі і паэтычнасці, вытанчанасці і практычнасці. Ідэальныя формы храмаў сталі прыкладам для пераймання ў архітэктуры будучых стагоддзяў.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якое са збудаванняў Афінскага акропаля вам запомнілася больш за ўсё? Апішыце гэта збудаванне, звярнуўшы ўвагу на колькасць калон на фасадах, асаблівасці архітэктурнага ордара, дэкор.

2. Дойліды параўноўвалі старажытнагрэчаскі храм з чалавекам. Якія элементы Эрэхтэёна пацвярджаюць іх думку? Правядзіце даследаванне, якія яшчэ чалавекападобныя фігуры выкарыстоўваюцца ў архітэктуры ў якасці апор.

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Ордарныя сістэмы выкарыстоўваліся ў наступныя эпохі беларускімі архітэктарамі для стварэння асабліва значных збудаванняў: храмаў, тэатраў, палацаў. Выканайце эскізны макет фасада падобнага збудавання з падручнага матэрыялу. Напрыклад, з дапамогай прыклееных трубачак і палосак паперы стварыце франтон і антаблемент. Палоскі гафрыраванага кардону стануць жалабкамі калон. Адрэзкі трубачак і завіткі папяровых палосак пазначаць іх капітэлі і базы. Гармонік з паперы паслужыць прыступкамі.



Гомельскі абласны драматычны тэатр (1954). Архітэктар А. Тарасенка

# § 21. ВОБРАЗ ЧАЛАВЕКА Ў СКУЛЬПТУРЫ СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

Адзін старажытны гісторык, апынуўшыся ў Афінах, вельмі здзівіўся: «Тут статуй больш, чым людзей!» Грэкі, сапраўды, любілі скульптуры і ў вялікай колькасці ставілі іх на плошчах, стадыёнах, уздоўж дарог, у храмах і нават на дахах!

***Людзі і багі.*** Цэнтральным у грэчаскай скульптуры быў вобраз чалавека — прыгожага, маладога, ідэальна складзенага, поўнага сіл і энергіі. Такімі грэкі ўяўлялі і сваіх багоў: Зеўса, Афіну, Апалона, Артэміду... Іх выявы часам немагчыма адрозніць ад выяў простых афінскіх дзяўчат (па-грэчаску *кор*) і юнакоў (*курасаў*). І ў гэтым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Пасейдон, Апалон і Артэміда. Фрагмент фрыза Парфенона (V ст. да н. э.)

Панафінейскае шэсце. Фрагмент фрыза Парфенона (V ст. да н. э.)



заключалася галоўная каштоўнасць грэчаскай культуры: яна апявала чалавека, па сутнасці прыраўноўваючы яго да бажаства.

*Скульптура Фідыя «Параненая амазонка» (электронны дадатак) адлюстроўвае мужную дзяўчыну, якая працягвае змагацца, нягледзячы на атрыманую рану. Яе цела поўнае энергіі, а рух высока ўзнятай рукі выглядае жыццесцвярджальна. Як вы думаеце, ці зможа амазонка перасіліць боль і перамагчы? Якія чалавечыя якасці праслаўляе гэта скульптура?*

***Спорт і прыгажосць чалавечага цела.*** Старажытныя грэкі вельмі любілі спорт. Бег, скачкі, кіданне дыска, барацьба — усе гэтыя віды спартыўных спаборніцтваў прыдумалі ў Старажытнай



**Цікавы факт!**
Старажытныя грэкі і ў архітэктуры, і ў скульптуры любілі яркі колер. Свае храмы і мармуровыя статуі яны багата размалёўвалі. Але за многія стагоддзі фарба сцерлася. І таму доўгі час уся прыгажосць старажытнагрэчаскага мастацтва разумелася выключна як строгая беламармуровая.

**Міран.** Дыскабол
(V ст. да н. э.)

Грэцыі. Як і Алімпійскія гульні, якія праводзіліся раз на чатыры гады ў Алімпіі. Перамога на іх цанілася амаль як перамога на вайне. Алімпійскіх пераможцаў увенчвалі лаўровымі вянкамі, у іх гонар стваралі статуі.

Скульптура *«Дыскабол»* майстра Мі́рана — адзін з самых знакамітых твораў старажытнагрэчаскага мастацтва. Твор з'яўляецца ўвасабленнем антычных ідэалаў прыгажосці і фізічнай дасканаласці. Сама назва «Дыскабол» перакладаецца як «кідальнік дыска». Скульптар паказаў спартсмена ў момант падрыхтоўкі да кідка: цела атлета разгорнута, мышцы напружаныя, погляд засяроджаны. Дынаміка руху перададзена з незвычайнай дакладнасцю і жывасцю.

Міран імкнуўся паказаць не толькі фізічнае дзеянне, але і псіхалагічны момант канцэнтрацыі спартсмена перад вырашальным кідком. У сваёй рабоце ён адыходзіць ад статычнасці выявы, выканаўшы фігуру ў руху. Гэта скульптура — сімвал не толькі антычнага спорту, але і ўмення мастака паказаць чалавечае цела ў гармоніі руху і духу.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Заняткі спортам у Грэцыі былі абавязковымі для ўсіх мужчын. Грэкі верылі, што спорт удасканальвае не толькі цела, але і душу чалавека. Фізічную прыгажосць яны ўспрымалі як запаруку маральнай дасканаласці. Ствараючы сваіх багоў і герояў агаленымі, тым самым паказвалі на іх унутраную дасканаласць.

*Скульптура «Дыскабол» выклікала ўсеагульнае захапленне сучаснікаў і на стагоддзі ўзвысіла спартыўную тэму ў мастацтве. Якія яшчэ творы мастацтва на тэму спорту вы ведаеце?*

***Гаваркія драпіроўкі.*** Прыгажосць жаночых вобразаў, іх унутраны свет грэчаскія скульптары перадавалі і праз мудрагелістую прыгажосць іх вопраткі. Бо грэчаскія адзенні — *хітоны** і *гіма́тыі*** — маглі па-рознаму драпіравацца на фігурах і выражаць розныя грані вобраза. Так, у *статуі коры* з Афінскага акропаля майстар у дэталях узнавіў вытанчаны ўбор і прычоску дзяўчыны. Струменістыя



Статуя коры з Афінскага акропаля (VI ст. да н. э.)



**Фідый.** Статуя Афіны Варварыкон. Паменшаная копія (V ст. да н. э.)

---

* *Хітон* — адзенне (ніжняе), якое нагадвае кашулю.

** *Гіматый* — верхняе адзенне ў выглядзе прамавугольнага кавалка тканіны, што апраналі на хітон.



Ніка Самафракійская
(III ст. да н. э.)



Стэла Гегеса. Служанка і пані
(V ст. да н. э.)

локаны валасоў і мудрагелістыя складкі адзення па-майстэрску паўтараюць адно аднаго. Святочны вобраз дапаўняе ўсмешка.

З дапамогай *мовы драпіровак* грэчаскія скульптары маглі красамоўна распавесці пра эмацыянальны стан чалавека. *У статуі Афіны* работы Фідыя спакойна спадаючыя цяжкія складкі вопраткі падкрэсліваюць урачысты, засяроджаны настрой багіні мудрасці. У аблічы *Нікі Самафракійскай* імклівы палёт багіні перамогі перадаюць не толькі яе магутныя крылы, але і драпіроўкі, што трымцяць на ветры. На *надмагільнай стэле афінянка па імені Гегеса* стомлена размясцілася ў крэсле. Складкі яе вопраткі павольна і нячутна слізгаюць уніз. Яны паўтараюць той сузіральны стан, у які паглыбілася жанчына.

*Старажытныя грэкі бачылі ідэал прыгажосці ў класічным спалучэнні меры, раўнавагі, прастаты. Ахарактарызуйце грэчаскі ідэал прыгажосці на прыкладзе адной са скульптур, прапанаваных у параграфе.*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Драматызм у старажытнагрэчаскай скульптуры.*** Напрыканцы існавання старажытнагрэчаскай цывілізацыі ў мастацтве з'явілася цікавасць да драматычных сюжэтаў. Вобраз чалавека стаў раскрывацца больш глыбока. Акрамя тэмы прыгажосці і сілы чалавека мастакоў пачала хваляваць тэма пакут і чалавечага бяссілля.



**Агеса́ндр, Палідор, Афінадор.**
Лаакаон і сыны (I ст. да н. э.)

Ва ўнікальнай *кампазіцыі «Лаакаон і сыны»* адлюстравана смяротная барацьба траянскага жраца Лаакаона і яго сыноў са змеямі. Фігура галоўнага героя — магутная, па-атлетычнаму дасканалая. Здаецца, што ён здольны разарваць любыя ланцугі. Але, нягледзячы на сваю сілу, Лаакаон знаходзіцца ў роспачы. У яго не атрымліваецца супрацьстаяць багам, якія паслалі на яго страшную кару. Пакуты Лаакаона пагаршаюцца тым, што ён бачыць, як ахвярамі змяіных «абдымкаў» робяцца яго юныя сыны.

*Прачытайце ў інфармацыйных крыніцах гісторыю пра Траянскую вайну і жраца Лаакаона. За што багі пакаралі траянскага жраца і яго сыноў? Якімі сродкамі гэта гісторыя адлюстравана ў скульптуры?*

У цэнтры ўвагі старажытнагрэчаскіх мастакоў быў чалавек і яго жыццё. Грэчаскія майстры навучыліся перадаваць усю гаму чалавечых эмоцый: і радасць, і смутак, і азарт перамогі, і гора. Але ў якіх абставінах ні адлюстроўвалі б чалавека, яны заўсёды стваралі ідэальны вобраз, прыгожы ў любых сваіх праявах.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Як вы думаеце, чаму вобраз чалавека стаў цэнтральным у старажытнагрэчаскім мастацтве? Звярніцеся да электроннага дадатку.

2. У 2003 годзе ў вядомых музеях свету прайшла выстава «Стракатыя багі». Разгледзьце ілюстрацыі (электронны дадатак). Што вас здзівіла? Чаму выстава атрымала такую назву? Раскажыце, якімі бачылі эліны знакамітыя скульптуры.



Лучнік у вобразе траянскага царэвіча Парыса. Франтон храма Асаі, в. Эгіна. Выстава «Стракатыя багі» (2003)

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Тэма спорту вельмі актуальная ў Рэспубліцы Беларусь, дзе ёй надаецца пільная ўвага на дзяржаўным узроўні. Спорт разглядаецца як неад’емны кампанент здаровага ладу жыцця, фізічнага і духоўнага развіцця нацыі. А гонар нацыі — гэта поспехі яе спартсменаў на міжнароднай арэне.

Па ўсёй тэрыторыі Беларусі можна сустрэць сучасныя спартыўныя комплексы, стадыёны, цэнтры, якія прываблiваюць аматараў і прафесіяналаў не толькі сваімі магчымасцямі, але і архітэктурным афармленнем.

Паспрабуйце, выкарыстоўваючы пластычныя матэрыялы, выканаць рэльефную выяву на тэму беларускага спорту.



Мазаічнае пано на будынку спартыўнага комплексу «Славянка» на тэрыторыі стадыёна, Бабруйск



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 22. КЕРАМІЧНЫЯ ВЫРАБЫ СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

Ні ў адной культуры свету мы не сустрэнем такой разнастайнасці формаў керамікі, якая існавала ў старажытных грэкаў. Перш за ўсё, грэкі праявілі свой талент *у вазапісе* — мастацтве роспісу керамічных пасудзін.

***Разнастайнасць формаў керамічнага посуду.*** У культуры Старажытнай Грэцыі існавала такая колькасць формаў посуду, што чалавеку недасведчанаму складана адразу разабрацца ў яе формах і назвах. Сярод грэчаскага посуду былі і масіўныя, ёмістыя пасудзіны дарычнага тыпу, і лёгкія, вытанчаныя вырабы іанічнага тыпу.

Можна вылучыць мноства відаў старажытнагрэчаскіх пасудзін. У *а́мфары*, круглявай пасудзіне з дзвюма ручкамі, захоўвалі напоі.




Віды старажытнагрэчаскіх пасудзін

У *кратэ́ры*, пасудзіне з шырокім горлам, напоі змешвалі. З кі́лікаў, плоскіх чаш, іх пілі. А яшчэ былі пасудзіны, у якіх захоўвалі алей і духмяныя рэчывы…

Многія вазы, няглядзячы на практычнае прызначэнне, з'яўляюцца ўнікальнымі творамі мастацтва.

*Якая з ваз, пададзеных у параграфе і электронным дадатку, вам знаёмая? Дзе вы яе бачылі або чулі пра яе?*

***Чорнафігурны грэчаскі вазапіс.*** Адным з відаў упрыгожвання керамікі быў *чорнафігурны роспіс*. Па жоўта-чырвоным фоне гліны чорным лакам на выраб наносілі малюнак.

Кожная грэчаская ваза — гэта вынік працы двух майстроў. Ганчар яе вылепіў, а мастак размаляваў. Часам імёны абодвух майстроў наносілі непасрэдна на сценкі пасудзіны. Так, знакаміты *кратэр «Ваза Франсуа»* мае подпіс: *«Эргацім мяне зрабіў, Клітый мяне размаляваў»*. Вельмі кранальна: ваза, нібы адушаўлёная асоба, кажа ад свайго імя. Гэта выраб з'яўляецца яркім прыкладам выяўлення святочнай і гераічнай тэматыкі ў чорнафігурнай кераміцы. На пяці ярусах адлюстраваны сцэны вяселля, палявання, спаборніцтвы на калясніцах, бітва пігмеяў з жураўлямі.



**Эксекій.** Амфара «Аякс і Ахіл за настольнай гульнёй» (VI ст. да н. э.)



**Клітый.** Кратэр «Ваза Франсуа» (VI ст. да н. э.)



Кілік «Дыяніс у ладдзі» (VI ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Вазапісцы імкнуліся, каб малюнак падкрэсліваў форму пасудзіны. Прычым размалёўвалі керамічныя вырабы з усіх бакоў. Цалкам пакрывалі роспісамі і плоскую чашу, і яе ножку-падстаўку, і ўнутраную частку ёмістай пасудзіны.

Зірніце на амфару, упрыгожаную выявай Ахіла і Аякса, якія гуляюць у косткі. Як умела мастак Эксе́кій дапасаваў малюнак да формы! Схіленыя спіны гульцоў паўтараюць круглявасці сценак пасудзіны. А кубападобны столік, змешчаны дакладна пасярэдзіне збана, паўтарае сілуэты ног герояў.

*Разгледзьце вазы, выкананыя ў чорнафігурнай тэхніцы. Якія сюжэты прыцягвалі вазапісцаў?*

***Чырвонафігурны грэчаскі вазапіс.*** Паступова ў вазапісе пачала прымяняцца *чырвонафігурная тэхніка*. Мастакі пакрывалі чорным лакам не сілуэты фігур, а, наадварот, фон. Выявы майстры пакідалі ў натуральным тэракотавым колеры, гэта значыць непафарбаванымі. Гэта дазваляла на светлых сілуэтах фігур прамалёўваць вельмі тонкія дэталі.

Тэматыка чырвонафігурнага вазапісу стала нашмат разнастайнейшай. На вазах, выкананых у гэтай тэхніцы, сустракаюцца міфалагічныя сюжэты, сцэны са штодзённага жыцця, дэталёвыя выявы конных запрэжак, архітэктурных збудаванняў, інтэр'ераў... Людзі на чырвонафігурнай кераміцы часцей за ўсё паказаны ў вытанчаным адзенні і ў руху.

По традыцыі размаляваная кераміка выкарыстоўвалася не толькі для бытавых патрэб, але і трапляла ў вялікай колькасці ў пахаванні. Гэта спрыяла яе захаванню. Дзякуючы знаходкам археолагаў грэчаскі вазапіс



Амфара «Кіфарыст на спаборніцтвах» (VI ст. да н. э.)

у наш час шырока прадстаўлены ў многіх найбуйнейшых мастацкіх музеях свету.

*Параўнайце чырвонафігурны і чорнафігурны вазапіс. Чым адрозніваюцца тэхнікі? Як іх адрозненне выяўляецца ў дэкоры ваз?*

***Арнаментальнае мастацтва.*** Вытанчанасць і завершанасць керамічным вырабам надаваў *арнамент* — геаметрычны або раслінны. Як бачна з прыкладаў, грэчаскія арнаменты адрозніваліся выразным чаргаваннем элементаў, адсутнасцю дэталяў, дэкаратыўнай яснасцю.

| | | |
|---|---|---|
|  |  |  |
| **Меа́ндр** — арнамент у выглядзе бесперапыннай ламанай лініі з прамымі вугламі. | **Пальме́та** — арнамент з веерападобнымі лістамі пальмавага дрэва. | **Хваля** — арнамент з завіткоў, якія нагадваюць грабяні марскіх хваль. |

Арнамент выкарыстоўваўся таксама і ў іншых відах мастацтва. У архітэктурных збудаваннях з дапамогай арнаментальнага ўпрыгожвання падкрэслівалася прыгажосць ордараў. У манументальных стэлах і пастаментах — велічнасць. Асаблівую ролю арнамент выконваў у стварэнні ювелірных упрыгажэнняў, мэблі, тэкстылю.



Меандр у росп ісе кіліка (V ст. да н. э.)



Архітэктурны дэкор антаблемента храма Эрэхтэён (V ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Разгледзьце віды старажытнагрэчаскага арнаменту. Успомніце, ці сустракаліся вы з падобнымі арнаментамі ў жыцці. Падзяліцеся сваім мастацкім вопытам з аднакласнікамі.*

Старажытнагрэчаская кераміка ўнікальная. Мастацкія ўзоры вазапісу і сёння радуюць вока. Керамічныя пасудзіны захапляюць формай, разнастайнасцю тэм, колеравай гамай. А па сюжэтах роспісу можна скласці гісторыю Старажытнай Грэцыі.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце вазы, прапанаваныя ў параграфе і электронным дадатку. Якое ўражанне зрабілі на вас формы і роспіс ваз?

2. У роспісах ваз пераважаюць міфалагічныя сюжэты. Якіх з міфалагічных персанажаў вы пазналі?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Пазнаёмцеся з рознымі формамі ваз (электронны дадатак). Выканайце сілуэтны малюнак двух-трох вырабаў. Паспрабуйце ў ім адлюстраваць правільную форму вазы. Намалюйце эскіз роспісу вазы з арыгінальным сюжэтам. Не забудзьцеся ўпрыгожыць вазу з дапамогай арнаменту.

## § 23. ЦУДЫ СВЕТУ Ў СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

На працягу ўсёй эпохі Антычнасці грэкі ўзводзілі незвычайна прыгожыя, гарманічныя збудаванні, стваралі пластычныя вобразы, якія і сёння здзіўляюць хараством. Кожнае тварэнне старажытнагрэчаскіх майстроў можна па праву лічыць дасканалым. Але некаторыя з іх выклікалі ў сучаснікаў захапленне. Гэтыя творы грэкі назвалі цудамі свету.

***Колькі на зямлі цудаў свету.*** Да цудаў свету грэкі аднеслі не толькі ўнікальныя збудаванні і скульптуры антычнага свету, але і грандыёзныя тварэнні дойлідаў іншых старажытных цывілізацый. Усяго спіс налічваў сем помнікаў мастацтва. Сярод іх былі піраміда

Хеопса, Вісячыя сады Семіраміды ў Вавілоне, а таксама пяць непаўторных твораў Старажытнай Грэцыі.

На жаль, ні адно з цудаў старажытнагрэчаскага мастацтва не захавалася. Пазней знатакі мастацтва не раз змянялі гэты спіс, дапаўняючы яго новымі сусветнымі шэдэўрамі. Але менавіта тыя сем твораў мастацтва, якія вылучылі грэкі, увайшлі ў гісторыю як цуды свету.

***Маўзалей у Галікарна́се*** — непаўторнае збудаванне старажытнагрэчаскага мастацтва. Сваю назву ён атрымаў ад імя правіцеля — Маўсола, для якога і пабудавалі грабніцу. Яе ўзвядзенне было распачата яшчэ пры жыцці Маўсола, а завершана яго жонкай — Артэмісі́яй.



Маўзалей у Галікарнасе. Архітэктары Пі́фей і Саты́р (IV ст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

Для свайго часу грабніца мела гіганцкія памеры, параўнальныя хіба што з вялікімі пірамідамі Старажытнага Егіпта. Яе вышыня дасягала 45 метраў. Дзіўна, што грабніца такога маштабу была пабудавана ўсяго за шэсць гадоў!

Фундамент Маўзалея меў форму прамавугольніка. Ніжні паверх служыў магільным склепам правіцеля і яго жонкі. Другі паверх абкружалі калоны іанічнага ордара, паміж якімі стаялі мармуровыя статуі. Завяршаў пабудову дах у выглядзе ступеньчатай піраміды. На вяршыні грабніцы была ўсталявана мармуровая скульптурная кампазіцыя: Маўсол і Артэмісія кіруюць двухколавай каляснiцай



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

з чацвёркай запрэжаных коней. Слова «маўзалей» з тых часоў увайшло ў многія мовы свету.

На жаль, час не пашкадаваў гэты помнік архітэктуры. У XIII стагоддзі ён быў разбураны землятрусам, а пазней з камянёў яго руін была ўзведзена крэпасць.

*Сваімі архітэктурнымі формамі Маўзалей у Галікарнасе здзіўляў нават грэкаў. Разгледзьце яго выяву. Якія дзве архітэктурныя традыцыі аб'ядноўваюць гэта грандыёзнае збудаванне?*

***Храм Артэміды ў Эфе́се*** быў пабудаваны ў гонар багіні палявання. Прыгожую Артэміду асабліва шанавалі ў гэтым горадзе. Зразумела, і храм Артэміды павінен быў адпавядаць грацыёзнасці аблічча багіні.

**Цікавы факт!**
Для ўзвядзення храма была абрана балоцістая мясцовасць. І невыпадкова! Дойліды прадбачылі магчымасць разбурэння такога грандыёзнага збудавання землятрусам. Тэрыторыю асушылі, вырылі катлаван, а падмурак храма дадаткова ўмацавалі.



Храм Артэміды ў Эфесе (VI–V стст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

Вялікі па памерах храм атрымаў святочны ўбор. Артэмісіён упрыгожвалі 127 калон іанічнага ордара. Круглая скульптура і рэльефы служылі ўбраннем інтэр'ера храма. Але галоўным скарбам была велізарная статуя Артэміды. На жаль, яе апісанняў не захавалася. Вядома толькі, што скульптар выкарыстаў каштоўныя матэрыялы для вырабу статуі. Храм Артэміды быў разбураны пажарам у IV стагоддзі да н. э. На яго месцы пабудавалі новы храм, які ў цэлым паўтарыў першапачатковую задуму. Але і ён не ацалеў.

*Разгледзьце выяву рэканструкцыі храма Артэміды. Якое ўражанне на вас зрабіла гэта збудаванне?*

***Фараскі маяк.*** Яшчэ адным цудам свету быў названы *маяк, пабудаваны на востраве Фа́рас*. Гэты востраў знаходзіўся непадалёк ад горада Александрыі, таму маяк нярэдка называюць Александрыйскім. У старажытнагрэчаскім свеце гэта было самае высокае збудаванне — каля 130 метраў. Маяк служыў арыенцірам для караблёў: днём і ноччу яны маглі бесперашкодна прайсці вызначаны шлях.


Фараскі маяк (III ст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

Маяк уяўляў сабой збудаванне з трох вежаў, якія стаялі адна на адной. Вежы паступова памяншаліся ўгору. Ніжняя мела чатырохгранную форму, сярэдняя — васьмігранную, верхняя — цыліндрычную. Менавіта ў верхняй вежы пастаянна гарэў агонь. Яго водбліскі на марской вадзе былі бачныя на некалькі дзясяткаў кіламетраў.

*Падумайце, як звязаны Александрыйскі маяк і асвятляльны прыбор — фара?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Статуя Зеўса*** была створана ў V стагоддзі да н. э. у Алімпіі — адным з галоўных культурных цэнтраў Старажытнай Грэцыі. Яе аўтар — самы знакаміты скульптар гэтага часу *Фі́дый*. Выкарыстоўваючы розныя матэрыялы — дрэва, слановую косць, золата, — майстар стварыў непаўторны вобраз уладара гэтых мясцін. Статуя была не столькі гіганцкай, колькі стварала ўражанне грандыёзнасці. Яе вышыня, па розных звестках, даходзіла да 17 метраў.

Магутны Зеўс, назіраючы за тым, што адбываецца, кіруе светам: спрыяе добрым, карае грэшных. У правай руцэ ён трымае статуэтку багіні перамогі Нікі, у левай — скіпетр з арлом. Галаву Зеўса ўпрыгожвае вянок з галінак алівы. Яго адзенне і атрыбуты выкананы з золата. Зрэшты, як і трон, багата ўпрыгожаны рэльефамі, на якіх адлюстраваны подзвігі магутнага Зеўса.



Рымская манета з Эліды з выявай статуі Зеўса Алімпійскага (II ст. да н. э.)

*У Старажытнай Грэцыі лічылі няшчаснымі тых, хто асабіста не бачыў статую Зеўса, створаную Фідыем. Як вы думаеце, чаму?*

***Статую бога сонца Ге́ліяса***, які па легендзе лічыўся стваральнікам вострава Радос, ляпілі каля 12 гадоў. Яна была не проста вялікая. Яна была настолькі каласальная, што неўзабаве яе пачалі называць *Калосам*. Вышыня статуі дасягала 36 метраў.

Задума была сапраўды грандыёзная. Вобраз бога Геліяса, які зіхацеў у промнях сонца, упрыгожваў гавань Радоса, быў бачны далёка з мора і з бліжэйшых астравоў. Для таго каб устанавіць такую гіганцкую скульптуру, былі зроблены дакладныя матэматычныя разлікі. Для ўмацавання Калоса скульптары вызначылі тры апоры — ногі і край плашча, што звісаў. Іх збудавалі з каменю і ўзмацнілі металічным каркасам. Сама ж скульптура была выраблена з гліны і пакрыта лістамі бронзы.

**Сальвадо́р Далí.**
Калос Радоскі (1954)



Калос узвышаўся на мармуровым пастаменце. Трохі адхіліўшыся назад, Геліяс накіраваў свой позірк у марскую далечыню. Галаву прыгожага юнака аздабляў вянок з промнямі сонца. Іншых звестак пра тое, як выглядаў Калос, на жаль, не захавалася. Статуя прастаяла крыху больш за паўстагоддзя і абрынулася ў час землятрусу, надламаўшыся ў месцах каленяў. Доўгі час яе абломкі праляжалі на востраве, нагадваючы яго жыхарам пра веліч бажаства сонца.

*Крылаты выраз «калос на гліняных нагах» напрамую звязаны з радоскім цудам свету. Што ён азначае? Як яго разумееце вы?*

Выдатныя творы антычных майстроў — цуды мастацтва Старажытнай Грэцыі — праславіліся на ўвесь свет. Нават знішчаныя часам, яны па сёння прыцягваюць увагу даследчыкаў і знатакоў мастацтва. Грандыёзныя архітэктурныя збудаванні і велічныя скульптуры сталі прыкладам умелага спалучэння дакладнасці матэматычных разлікаў і высокага мастацкага майстэрства.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце ілюстрацыі ў параграфе і электронным дадатку. Як вы лічыце, што зрабіла гэтыя пабудовы ўнікальнымі: мастацкія вартасці або складанасць інжынерных рашэнняў?

2. У кожнага цуду свету ёсць свая займальная гісторыя, звязаная з яго стварэннем або гібеллю. Даведайцеся пра іх у даступных інфармацыйных крыніцах. Падзяліцеся інфармацыяй з аднакласнікамі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Архітэктурная спадчына Беларусі багатая і разнастайная. Яна адлюстроўвае ўнікальную культуру краіны і з'яўляецца крыніцай нацыянальнага гонару.
Прыдумайце настольную гульню (напрыклад, лато або «Мемары»), уключыўшы ў яе як матэрыял гэтага параграфа, так і выявы гістарычных і сучасных збудаванняў Беларусі.

# § 24. ГАРМОНІЯ ДУМКІ І СЛОВА: ЛІТАРАТУРА СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

Літаратура Старажытнай Грэцыі ўнікальная. Старажытныя грэкі не толькі адлюстравалі ў ёй звычаі і традыцыі сваёй краіны, але і прапанавалі ўсяму свету разнастайнасць новых тэм, сюжэтаў і вобразаў. На жаль, да нашага часу захаваліся ў асноўным фрагменты літаратурных твораў. І толькі дзякуючы намаганням навукоўцаў, якія аднавілі некаторыя з іх, сучасны чытач знаёмы з літаратурнай спадчынай старажытных грэкаў.

***Вытокі літаратуры.*** Асновай старажытнагрэчаскай літаратуры сталі *міфы*. Грэчаская міфалогія — гэта спроба народа зазірнуць у прычыны розных з'яў навакольнага свету і зразумець іх. Эліны прыдумалі мноства займальных гісторый, у якіх рэальныя падзеі і паэтычная выдумка зліваліся ў адно.

Старажытныя міфы адлюстроўвалі ўяўленні грэкаў пра будову свету.

Акрамя паданняў пра багоў міфалогія Грэцыі багатая на гісторыі *пра герояў*. Героямі грэкі называлі людзей, якія адрозніваліся выключнай сілай, адвагай, мужнасцю, кемлівасцю або прыгажосцю. Гэта маглі быць палкаводцы, воіны, жрацы, прарокі, вялікія паэты... Грэкі верылі: прычына выбітных якасцяў героя ў тым, што адным з яго бацькоў было бажаство.

Міфы пра герояў — гэта займальныя гісторыі пра жыццё, подзвігі і бітвы магутных людзей. Дзякуючы гэтым гісторыям Геракл, Арфей, Адысей і многія іншыя героі станавіліся больш блізкія і зразумелыя звычайным людзям. Пра подзвігі герояў мы даведваемся з літаратурных твораў, якія дайшлі да нас.

| Уяўленні старажытных грэкаў пра светабудову |
|---|
| Свет з'явіўся з бязмежнага і бясформеннага хаосу. З хаосу стаў складвацца Космас, гэта значыць парадак. |
| *1-е пакаленне старажытнагрэчаскіх багоў*<br>Светам кіравалі першыя божаствы — багіня зямлі Гея, бог неба Ура́н, бог падземнага царства Та́ртар. |
| *2-е пакаленне старажытнагрэчаскіх багоў*<br>Гея і Уран спарадзілі тытанаў-багоў, якія ўвасаблялі магутныя сілы прыроды. Тытан Атлант трымаў нябесную сферу. Тытан Акіян кіраваў сусветнай ракой.<br>Тытаніда Феміда вырашала лёсы людзей, а Мнемазіна надзяляла іх памяццю. Тытан Кронас кіраваў часам. |
| *3-е пакаленне старажытнагрэчаскіх багоў*<br>Дзеці Кронаса абралі месцам сваіх сустрэч гару Алімп, і таму багоў сталі называць алімпійскімі.<br>Галоўным богам Алімпу быў Зеўс — вяршыцель лёсаў усіх багоў і людзей. Пасейдон кіраваў морамі. Гера, жонка Зеўса, стала апякункай сям'і і шлюбу.<br>Дачка Зеўса Афіна лічылася багіняй мудрасці, а Афрадыта — багіняй кахання і прыгажосці. Бог-каваль, уладар агню і кавальскага рамяства — Гефест. Апекуном мастацтваў лічылі бога Апалона. Яго сястра Артэміда вядомая як багіня палявання. |

*Успомніце з урокаў мастацтва, літаратуры і гісторыі багоў і герояў Старажытнай Грэцыі. Раскажыце адзін з вядомых вам старажытнагрэчаскіх міфаў.*

***Нараджэнне старажытнагрэчаскага эпасу.*** Першымі літаратурнымі творамі, якія данеслі да нас дзіўныя гісторыі аб прыгодах, падарожжах і подзвігах герояў, сталі паэмы *«Іліяда»* і *«Адысея»* старажытнагрэчаскага паэта Гамера. Ён сабраў больш старажытныя паданні, легенды і склаў эпічныя творы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### Сюжэт паэмы «Іліяда» (траянскі цыкл)

У цэнтры «Іліяды» — падзеі вайны грэкаў-ахейцаў супраць жыхароў горада Троя. Пары́с, сын траянскага цара Прыама, выкраў Алену, жонку спартанскага цара Менелая. З-за гэтага Менелай пачаў Траянскую вайну.

Адзін з герояў паэмы — Ахіл — сын багіні Фетыды і цара Пелея. Высакародны і доблесны герой Ахіл супрацьстаіць сыну траянскага цара Прыама Гектару — сумленнаму, паважанаму воіну, які ўзяў на сябе ўвесь цяжар вайны.

Аднак перамагае траянцаў не Ахіл, а кемлівы Адысей. Яго вераломная хітрасць з велізарным драўляным канём, у якім былі схаваны воіны, сталася для траянцаў фатальнай...

### Сюжэт паэмы «Адысея»

У цэнтры падзей — прыгоды героя Адысея ў час яго вяртання на радзіму. А таксама гісторыя яго жонкі Пенелопы, якая чакае мужа на востраве Іта́ка.

Адысей пастаянна знаходзіцца ў смяротнай небяспецы. Аднак багі і ўласная кемлівасць дапамагаюць яму пераадольваць перашкоды.

Герой абхітрыўаднавокага цыклопа Паліфема, уратаваўся ад чараўніцы Кіркі (Цырцэі). Здолеў пазбегнуць чар сірэн, якія завабліваюць спевамі маракоў, застаўся ў жывых пасля караблекрушэння. Яго падарожжа скончылася вяртаннем на родны востраў да Пенелопы.

У паэмах «Іліяда» і «Адысея» Гамер наглядна апавядае пра падзеі далёкага мінулага. Праз стагоддзі мы даведаемся пра вернасць Пенелопы і Андрамахі, пра прыгоды і подзвігі Ахіла і Адысея, пра пашану людзей да багоў і герояў. Сюжэты і вобразы гамераўскіх паэм і сёння знаходзяць увасабленне ў творах мастацтва.

Муза, скажи мне о том многоопытном муже, который,
Странствуя долго со дня, как святой Илио́н им разрушен,
Многих людей города посетил и обычаи видел,
Много и сердцем скорбел на морях, о спасенье заботясь
Жизни своей и возврате в отчизну сопутников; тщетны
Были, однако, заботы, не спас он сопутников...

*Гомер. Одиссея, песнь первая. (Пер. В. Жуковского)*

Асаблівасцю паэм Гамера з'яўляецца форма верша — гекза́метр. Гэта адмысловы верш, складаны для сучаснага чытача. Аднак менавіта гекзаметр надае паэмам Гамера асаблівы эфект — распеўнасць і меладычнасць. Невыпадкова з часоў Гамера гекзаметр называюць антычным вершам, а самога паэта — родапачынальнікам эпасу ў літаратуры. Гамер — легендарны спявак-казачнік. Грэкі глыбока яго шанавалі. З часам імя, гісторыя жыцця і творчасці паэта ператварыліся ў міф, абрастаючы мноствам неверагодных падрабязнасцей.

**Цікавы факт!**
Старажытнагрэчаскія творы запісвалі на папірусе — шырокіх лістах з расліны, згорнутых у скруткі. Пазней — на пергаменце, вырабленым са скуры жывёл.

*Прачытайце ў электронным дадатку кароткі змест дзявятай песні паэмы «Адысея» Гамера. Падрыхтуйце выразны пераказ адной з прыгод Адысея.*

***Музычнасць старажытнагрэчаскай лірыкі.*** У старажытнагрэчаскай літаратуры быў папулярны не толькі эпас пра жыццё багоў, герояў і людзей, але і паэтычныя творы, у якіх перадаваліся думкі, пачуцці і настрой аўтара. Такія творы з часам сталі называць *лірычнымі.*

Пад гукі *ліры* — старадаўняга музычнага інструмента — грэкі спявалі *песні*, складалі *гімны*. Паэзія Старажытнай Грэцыі была цесна звязана з музыкай. Больш за ўсё гэта выявілася ў *песеннай лірыцы.*

Красивое нас привлекает только
Своею внешностью; но кто душой велик,
Тот истинно прекрасен.
Без добродетели богатство бесполезно,
Но вместе с ней оно ведёт к блаженству.

*Из песенной лирики Сапфо.*
*(Пер. В. Водовозова)*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Найвялікшую паэтэсу Сапфо грэкі называлі «дзясятай музай». У сваіх песнях яна распавядала пра глыбіню і шчырасць пачуццяў чалавека, пра прыгажосць і маральнасць яго імкненняў... І сёння здзіўляе яе глыбокае разуменне душэўнага свету людзей, адлюстраванае ў паэзіі, створанай больш за два тысячагоддзі таму.

*Пазнаёмцеся з лірычнымі творамі Старажытнай Грэцыі. Якія тэмы больш за ўсё прыцягвалі грэчаскіх паэтаў?*

Старажытныя грэкі ўмелі глыбока адчуваць рэчаіснасць і адлюстроўвалі яе ў літаратурных творах. Магчыма, таму сюжэты і вобразы грэчаскай міфалогіі і літаратуры захаваліся праз стагоддзі. А жанры, што склаліся ў Старажытнай Грэцыі, сталі асновай для развіцця сучаснай літаратуры.

В летнюю пору гулял муравей по пашне и собирал по зёрнышку пшеницу и ячмень, чтобы запастись кормом на зиму. Увидал его жук и посочувствовал, что ему приходится так трудиться даже в такое время года, когда все остальные животные отдыхают от тягот и предаются праздности. Промолчал тогда муравей; но когда пришла зима...

*Эзоп. Муравей и жук. (Пер. М. Гаспарова)*

Раз летнім днём цераз дарогу
Мурашка пруцік валакла
Ды прыпынілася была,
Чакаючы сяброўку на падмогу.
І гэтым часам
Пачуўся нейкі гук,
Як бы спяваў хто басам,
А з гукам сеў паблізу Жук...

*Кандрат Крапіва. Мурашка і Жук*

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Выразы «траянскі конь», «ахілесава пята», «дары данайцаў» у сучаснай культуры замацаваліся як устойлівыя. Патлумачце, як вы разумееце сэнс гэтых выразаў.

2. Байка — гэта літаратурны жанр, які атрымаў шырокую вядомасць дзякуючы старажытнагрэчаскаму легендарнаму байкапісцу Эзопу. Прачытайце ўрыўкі з баек «Муравей и жук» Эзопа і «Мурашка і Жук» беларускага пісьменніка Кандрата Крапівы. Што агульнае і што адрознае ў байках аўтараў розных эпох?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Прачытайце ўрывак з «Іліяды» Гамера павольна, з невялікімі паўзамі. Паспрабуйце адчуць меладычнасць гекзаметра. Наладзьце ў класе конкурс на лепшае чытанне ўрыўка. Паспрабуйце скласці верш, выкарыстоўваючы форму гекзаметра.

## § 25–26. ТЭАТР І МУЗЫКА СТАРАЖЫТНАЙ ГРЭЦЫІ

Старажытнагрэчаская культура пакінула свету багатую спадчыну ў галіне тэатральнага і музычнага мастацтва. Тэатр у Старажытнай Грэцыі быў неад’емнай часткай жыцця грамадства, сродкам духоўнага і культурнага развіцця грамадзян. Музыка суправаджала рэлігійныя абрады, тэатральныя паказы і штодзённае жыццё грэкаў, надаючы ім асаблівую атмасферу.

***Архітэктура тэатра.*** Як вядома, Старажытная Грэцыя з’яўляецца радзімай тэатральнага мастацтва. Першапачаткова тэатр быў месцам шанавання бога Дыяніса, затым — збудаваннем для правядзення забаўляльных мерапрыемстваў. Таму тэатры будаваліся на схілах пагоркаў з улікам навакольнай прыроды і былі вялікіх памераў, каб забяспечыць усіх свабодных грамадзян магчымасцю прысутнічаць на спектаклях. Важнасць такога дзейства ў жыцці грэкаў стымулявала развіццё тэатра і стварэнне тэатральных збудаванняў у галоўных гарадах Старажытнай Грэцыі — Афінах, Пергаме, А́ргасе…

Яскравы прыклад мастацкай і тэхнічнай дасканаласці — *тэатр у Эпідаўры*. Ён змяшчае да 14 тысяч гледачоў і мае традыцыйную



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Тэатр у Эпідаўры (IV ст. да н. э.)

форму: глядацкія месцы паўкругам спускаюцца да велізарнай круглай архéстры. За архестрай — праскéній і скéна. Каменныя блокі, з якіх пабудаваны тэатр, ствараюць трывалую канструкцыю. Асаблівасцю тэатра ў Эпідаўры з'яўляецца яго ўнікальная акустыка. Дзякуючы спецыяльна прадуманай форме і канструкцыі голас акцёра добра чутны нават у самых аддаленых месцах збудавання.

*Як вы думаеце, чаму сучасны чалавек імкнецца выкарыстоўваць для правядзення канцэртаў, тэатральных пастановак пляцоўкі захаваных старажытнагрэчаскіх тэатраў?*

***Як арганізаваны тэатральны паказ.*** Прысутнасць свабодных грамадзян на святах была абавязковай, таму арганізацыя тэатральных паказаў мела важнае дзяржаўнае значэнне. Займаліся гэтым спецыяльна прызначаныя людзі.

Ключавая роля ў арганізацыі спектакля адводзілася *архонту* — вышэйшай службовай асобе ў старажытнагрэчаскім полісе. Архонт адбіраў творы паэтаў-драматургаў, кіраваў фінансамі і сачыў за выкананнем правілаў. Для кожнага паказу ён прызначаў акцёраў, каардынаваў іх працу на рэпетыцыях, адказваў за касцюмы.



Маскі старажытнагрэчаскага тэатра

**Цікавы факт!**
Не заўсёды паэты, якія вядомыя сёння як вялікія, перамагалі ў спаборніцтвах. Эсхіл заняў аднойчы другое месца, а Гамер — апошняе...







Эсхіл, Сафокл, Еўрыпід — стваральнікі старажытнагрэчаскай трагедыі, якія ўдзельнічалі ў тэатральных спаборніцтвах

Фінансава падтрымлівалі спектакль багатыя грамадзяне. Пасада чалавека, закліканага фінансаваць тэатральны паказ, называлася *харэ́г* — кіраўнік. Менавіта харэг ускладаў на сябе выдаткі на касцюмы, маскі, рэквізіт, аплату ўсім удзельнікам паказу і падрыхтоўку хору. Пасада харэга ў старажытнагрэчаскім полісе была адной з самых паважаных.

Паказы ладзіліся тры разы на год па тры дні — з самай раніцы і да заходу сонца. Гэта былі спаборніцтвы драматургаў, выбраных архонтам. Кожны драматург выносіў на суд гледачоў тры драмы, аб’яднаныя агульным сюжэтам, і адну п’есу жартаўлівага зместу. Па рэакцыі гледачоў адмысловае журы выбірала сярод драматургаў пераможцаў, якія атрымлівалі ўзнагароджанне і вянок з плюшчу. Імёны тых, хто перамог у спаборніцтве, а таксама харэгаў, якія ладзілі паказ, увекавечваліся ў спецыяльных спісах ганаровых грамадзян.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

*Адным з твораў, якія дайшоў да нашых дзён, з'яўляецца п'еса Эсхіла «Праметэй прыкуты». Прачытайце ўрывак з яе ў электронным дадатку. Якія фрагменты тэксту вы прапанавалі б прадэкламаваць акцёру, а якія — хору? Чаму?*

***Асаблівасці старажытнагрэчаскага спектакля.*** Мы з вамі памятаем, што паказ у старажытнагрэчаскім тэатры адбываўся на асаблівай круглай пляцоўцы — *архестры*. Тут размяшчаліся акцёры і хор. У тэатральным дзействе словы акцёраў чаргаваліся з песнямі хору, які дапамагаў гледачам лепш зразумець тое, што адбываецца, ацэньваў учынкі герояў, каментаваў падзеі. Значэнне хору паступова зніжалася: кожны новы драматург памяншаў колькасць выканаўцаў. З часам месца харавых уставак замянілі харэаграфічныя нумары.



Хор на хадулях. Выява на амфары (VI ст. да н. э.)

Спачатку гледачы размяшчаліся вакол архестры, пазней для публікі на схілах вакол архестры пачалі будаваць спецыяльныя месцы — *тэатрон*. Гледачы сядзелі або стаялі на лавах так, каб было і відаць, і чуваць тое, што адбываецца ў архестры і скене. *Скéна* знаходзілася адразу за архестрай. Гэта была палатка, у якой пераапраналіся акцёры. Пазней да пярэдняй сцяны скены сталі прымацоўваць дэкарацыі. У *параскéніях*, прыбудовах паабапал скены, захоўвалася тэатральная маёмасць. А вось месца перад скенай атрымала назву *праскéній* — трохі прыўзнятая над узроўнем архестры пляцоўка. Праходы, па якіх гледачы ўваходзілі ў тэатр, называліся *пáрады*.

*Тэатральныя машыны* — механічныя прыстасаванні, з дапамогай якіх старажытныя грэкі стваралі тэатральныя эфекты, — з'яўляліся па неабходнасці. Спачатку мяняліся дэкарацыі — ад цяжкавагавых драўляных канструкцый да размаляваных дошак або палотнаў. Паступовае ўскладненне сюжэтаў запатрабавала больш складанай візуалізацыі. Напрыклад, з дапамогай пад'ёмнага крана



Машына для «палётаў» (рэканструкцыя; ілюстрацыя з кнігі В. Галаўні «История античного театра»)

зрабілася магчымым перасоўванне з аднаго пункта ў іншы: лунанне ў аблоках або палёт на велізарных жуках... А з дапамогай спецыяльнай платформы акцёры змаглі выязджаць на архестру ў самы нечаканы момант. Адмысловая тэхніка імітавала ў час спектакля гром і маланку.

*У старажытнасці быў даволі папулярны выраз «Бог з машыны». Здагадайцеся, што ён азначае.*

***Старажытнагрэчаская музыка.*** Музыка ў жыцці грэчаскіх гарадоў займала важнае месца. Бо для грэка музыка была адным з самых дасканалых выказванняў гармоніі і парадку. Калі ўсе гукі ўзгоднены адзін з адным, яны гучаць выдатна, ураўнаважваючы стан чалавека. Лічылася, што з дапамогай музыкі выхоўваецца гарманічны чалавек. Старажытнагрэчаскі філосаф Піфагор, напрыклад, у музыцы бачыў дасканаласць і гармонію ўсёй светабудовы. Таму музыку і спевы асвойвалі нароўні з чытаннем, граматыкай, лічэннем, гімнастыкай і маляваннем. А ўпадабанымі музычнымі інструментамі

**Цікавы факт!**
Для музычных спаборніцтваў было ўзведзена спецыяльнае збудаванне — *адэон*. Вонкава яно нагадвала грэчаскі амфітэатр, але было меншага памеру. Гэта дазваляла палепшыць акустыку.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

грэкаў былі струнныя шчыпковыя — *кіфа́ра, ліра* — і духавыя — розныя віды *аўлосаў**.

Грэкі вельмі любілі праводзіць музычныя спаборніцтвы. Самымі ганаровымі сярод музыкантаў лічыліся *Піфі́йскія гульні* ў Дэльфах у гонар Апалона. Пераможца на гэтых гульнях атрымоўваў лаўровы вянок.



Адэон Герода Атычнага ў Афінах (II ст. н. э.)



Ліра. Чырвонафігурны вазапіс (IV ст. да н. э.)



Кіфара. Чырвонафігурны вазапіс (IV ст. да н. э.)

*Спаборніцтвы ў Дэльфах існуюць і сёння. Але называюцца яны інакш. Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах звесткі пра гульні ў Дэльфах. Як яны называюцца, хто ў іх удзельнічае? Прапануйце ідэю правядзення падобных гульняў у сваёй школе, класе.*

---

* Гл. ілюстрацыю «Меандр у роспісе кіліка» на с. 131.

Старажытнагрэчаскі тэатр захапляў тысячы гледачоў, дарыў ім мудрыя думкі і перажыванні, што ўзвышалі душу. Музыка была сродкам зносін з багамі, спосабам выказвання сваіх пачуццяў і эмоцый. І тэатральнае, і музычнае мастацтва Старажытнай Грэцыі сталі той асновай, на якой пазней была пабудавана ўся сусветная мастацкая культура.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Што новага вы даведаліся пра старажытнагрэчаскі тэатр — яго гісторыю, пабудову, архітэктурныя знаходкі, асаблівасці арганізацыі пастановак? Паразважайце, што з гэтага вы бачыце ў сучасным тэатры.

2. Выканайце схематычную выяву старажытнагрэчаскага тэатра. Адзначце на малюнку ўсе пералічаныя ў тэксце параграфа элементы тэатра.

3. Калі вы былі б рэжысёрам пастаноўкі ў сучасным тэатры трагедыі «Праметэй прыкуты» старажытнагрэчаскага драматурга Эсхіла (электронны дадатак), якія з тэхналогій візуалізацыі старажытных грэкаў вы прапанавалі б?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

1. Наведайце адзін з беларускіх тэатраў. Падзяліцеся з аднакласнікамі меркаваннем аб прагледжаным вамі спектаклі (агульнае ўражанне, ідэя спектакля, сродкі яе ўвасаблення, роля рэжысёра, мастакоў, акцёраў, музычнае вырашэнне). Якія тэхнічныя сродкі былі выкарыстаны? Не забудзьцеся распавесці, што вас асабліва ўразіла. Ці зацікавіў аповед вашых сяброў?

2. Тэатральныя «квіткі» ствараліся з бронзы або абпаленай гліны. Набывалі іх за невялікую плату. Літарай на «квітках» паказваўся адзін з «кліноў» тэатрона, на якія з дапамогай лесвіц дзяліўся тэатр. На гэтым «кліне» глядач мог заняць любое месца, пачынаючы з другога рада. Падумайце, для каго прызначаўся першы рад. Прыдумайце і выканайце эскіз білета ў сучасны тэатр. Патлумачце, чым ён будзе адрозніваецца ад «білета» Старажытнай Грэцыі.



Старажытнагрэчаскія тэатральныя «білеты» — жэтоны з бронзы (IV–II стст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 27. ТВОРЧЫ ЎРОК. ВЫРАЗНЫЯ ПРЫЁМЫ Ў СТАРАЖЫТНАГРЕЧАСКІМ ТЭАТРЫ

У камедыі «Птушкі» старажытнагрэчаскага камедыёграфа Арыстафа́на мы назіраем за стварэннем ідэальнага горада Тучакуку́еўска ў далёкім завоблачным свеце. У ім жывуць самыя разнастайныя птушкі:

«Видишь, это куропатка, вот нырок, вот алкион... сова-дятел, горлица, жаворонок, славка... голубь... сокол, вяхирь, кукушка, красноножка... пустельга...»

У гэтым незвычайным горадзе ўсё было наадварот — птушкі сталі божаствамі людзей.

*Пазнаёмцеся з тэкстам. Якія гукавыразныя прыёмы выкарыстаў аўтар? Якія з іх вас здзівілі?*

Эпой-пой, по-по-пой, по-пой!
Ио, ио, сюда, сюда, сюда!
Сюда, мои товарищи пернатые!
С полей поселян, из тучных овсов
Ко мне спешите, тысячи и тысячи,
Все, кто клюёт семена,
Скорей летите с песней ласковой и тихой!
В бороздах вы притаились, притаились
в рыхлых комьях,
Тихо-тихо чирикаете вы.
Тио-тио-тио-тио-тио-тио-тио-тио!
Те, что в садах, в ветках плюща ищут свой корм,
Также и те, что в горах от оливы к оливе летают,
Все вы ко мне поспешайте!
Триото-триото-тотобрикс!
Триото-триото-тотобрикс!

*Аристофан. Птицы. (Пер. С. Апта)*



Касцюм Удода са спектакля «Птушкі». Рэжысёр А. Ляляўскі, мастак Л. Скітовіч. Беларускі дзяржаўны тэатр лялек. *Фота С. Ждановіча*

*Прачытайце ўрывак уголас. Захавайце выразныя прыёмы, створаныя аўтарам для характарыстыкі птушак. Паразважайце, якім птушкам могуць належаць гэтыя гукавыя характарыстыкі. Якія гукавыя характарыстыкі вы дадалі б? Чаму?*

Раздзел 5

# МАСТАЦТВА СТАРАЖЫТНАГА РЫМА: ПАСЛАННЕ Ў БУДУЧЫНЮ



Жанчына з кіфарай.
Фрэска з вілы ў Баскарэа́ле (I ст. да н. э.)

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 28. МАСТАЦТВА ЭТРУСКАЎ: ПАПЯРЕДНІКІ ВЯЛІКІХ РЫМЛЯН

Рымляне былі таленавітымі заваёўнікамі. Перамагаючы суседзяў, яны не толькі далучалі новыя тэрыторыі, але і пераймалі досвед і веды заваяваных народаў. Грэкі, егіпцяне, этрускі... Усе яны ў розны час былі заваяваны Рымам, каб стаць для сваіх заваёўнікаў... настаўнікамі. Першымі ў гэтым спісе варта назваць этрускаў — прамых папярэднікаў старажытных рымлян.

***Архітэктурныя дасягненні этрускаў.*** Этрускі валодалі перадавымі ведамі ў будаўніцтве, асабліва ў галіне інжынерыі. Яны стваралі гарады, вуліцы якіх перасякаліся пад прамым вуглом, будавалі выдатныя дарогі, а праз рэкі перакідвалі масты.

Для ўзвядзення крапасных пабудоў, падмуркаў храмаў і жылых дамоў выкарыстоўвалі розныя пароды каменю, а таксама дрэва і гліну. Паступова тэхнічныя навыкі архітэктараў удасканальваліся, і этрускія майстры пачалі ўзводзіць магутныя крапасныя сцены з адмысловымі падпоркамі — контрфорсамі. Гэтыя сцены з праходамі-аркамі зрабіліся прыкладам для наступных пакаленняў рымскіх дойлідаў.

Этрускі надзвычай паважна ставіліся да памінальнага культу. Ніводны народ у Старажытным свеце, акрамя егіпцян, не клапаціўся



Порта-дэль-Арка ў Вальтэ́ры (II ст. да н. э.)



Роспіс з «Грабніцы палявання і рыбалкі» (V ст. да н. э.)

гэтак уважліва пра ўпарадкаванне месцаў вечнага спачыну для памерлых, як этрускі. Захавалася вялікая колькасць этрускіх пахавальных збудаванняў — грабніц. Як і храмы, грабніцы мелі розны дэкор: на сценах засталіся роспісы на розныя сюжэты.

Нягледзячы на тое што большасць будынкаў была разбурана, археолагі знайшлі цікавыя дэталі архітэктурнага дэкору — антэфіксы. Антэфікс з Вей уяўляе сабой жаночы твар у асяроддзі пялёсткаў, якія нагадваюць ракавіну. Майстар падрабязна прапрацаваў нават завіткі валасоў, а лёгкая паўусмешка персанажа нагадвае твары этрускіх статуй. І сёння нас уражвае прыгажосць антэфіксаў, па-майстэрску створаных этрускім майстрам.



Менада. Антэфікс з Вей. Архітэктурная дэталь. Музей Джуліі (500 г. да н. э.)

*Звярніце ўвагу на жыццярадасныя фарбы і важныя дэталі роспісаў у грабніцах (электронны дадатак). На выяве вышэй адзін з паляўнічых рыхтуецца трапіць у птушку з прашчы́, а рыбак закідвае ў вадаём сеткі. Параўнайце гэты роспіс з роспісам «Паляванне ў зарасніках папірусу» з грабніцы вяльможы Небамона (с. 43). Які з іх можна лічыць больш рэалістычным, дынамічным, дэталёвым? Чаму?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***«Дамы́ для вечнага жыцця»: грабніцы і саркафагі.*** Значнымі пабудовамі этрускі лічылі грабніцы. Іх высякалі ў скалах або складалі з каменю, а зверху часта насыпалі курган. «Дамы для вечнага жыцця» будавалі паводле прынцыпу зямнога жылля: калідор і некалькі пакояў, часам нават з вокнамі. Інтэр'ер напаўнялі мэбляй: высечанымі з каменю ложкамі, крэсламі, зэдлікамі для ног. І, вядома ж, разнастайнымі прадметамі ўжытку і асабістымі рэчамі нябожчыка.

Цела памерлага чалавека змяшчалі ў *саркафа́г*, на вечку якога малявалі нябожчыка за святочнай трапезай. Самыя цікавыя этрускія саркафагі ўяўляюць сабой скульптурныя партрэты шлюбных пар. Яны выкананы з *тэракоты* — чырвона-бурай ці жоўта-карычневай абпаленай гліны.

Грэкаў і рымлян здзіўляла, што ў этрускім грамадстве жанчыны былі раўнапраўныя з мужчынамі. Павагу і любоў паміж мужам і жонкай этрускія майстры перадавалі з вялікай кранальнасцю. На вечку *саркафага з Чэрве́тэры* вобразы мужа і жонкі выпраменьваюць дзіўную пяшчоту. Іх прасветленыя твары перадаюць глыбокую ўнутраную згоду, што панавала паміж мужам і жонкай.

Існаваў у этрускаў і звычай крэмацыі. У гэтым выпадку прах памерлага змяшчалі ў спецыяльныя *пасудзіны-урны* — *канопы*. Асноўная частка скрыні сімвалізавала цела чалавека, а вечка часта выконвалася ў выглядзе яго галавы. Некаторыя канопы дапаўнялі ручкамі, у якія ўстаўляліся «рукі».



Адна з грабніц у этрускім горадзе Чэрветэры (Цэ́рэ) (VI–V стст. да н. э.)



Саркафаг мужа і жонкі з Чэрветэры (Цэрэ) (VI ст. да н. э.)



Канопа
(VII–VI стст. да н. э.)



Канопа
(VII ст. да н. э.)

*Вечкі каноп з выявай галавы чалавека адрозніваюцца паміж сабой (электронны дадатак). Як вы думаеце, ці мелі гэтыя выявы партрэтнае падабенства з памерлымі?*

***Скульптура.*** Статуі сваіх багоў этрускі звычайна выраблялі таксама з тэракоты. А гэта вельмі далікатны матэрыял. Таму статуі дайшлі да нас толькі ў выключных выпадках.

*Статуя Апалона з Вей* была знойдзена пры раскопках храма. Вялікая, у чалавечы рост, скульптура выканана пад уплывам старажытнагрэчаскага мастацтва. Усмешка на твары Апалона, спадаючыя складкі адзення нагадваюць скульптуры кор з Афінскага акропаля. Аднак у этрускай статуі больш руху і пачуццяў. Рашучы крок Апалона настолькі шырокі, што ўся яго фігура імкнецца наперад.

Этрускаў у выяўленчым мастацтве прыцягвалі вострыя і рэзкія характарыстыкі вобразаў. Гэта тлумачыцца любоўю этрускіх майстроў да бронзы — матэрыялу, здольнага перадаць максімальнае напружанне формы.



Апалон з Вей
(VI ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Хімера з Арэцы (V ст. да н. э.)

*Скульптура хімеры з Арэ́ца* выканана якраз з бронзы. Выява фантастычнай жывёлы валодае вялікай экспрэсіяй! Хімера рыкае і рыхтуецца напасці, прыпаўшы на пярэднія лапы. Поўсць яе ўзнялася, спіна выгнулася дугой, на баках праступілі рэбры... Здаецца, яна схопіць зубамі любога, хто наблізіцца да яе. Ні ў адным творы старажытных грэкаў мы не сустрэнем такога пераканаўчага вобраза дзікага звера.

*Скульптурная выява хімеры ўнікальная. Ахарактарызуйце скульптурны вобраз, створаны этрускамі. Часткі якіх жывёл вы пазналі ў гэтым вобразе?*

***Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*** Сярод прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва этрускаў да нашага часу захаваліся ў асноўным вырабы з бронзы і кераміка. Гэта розныя пасудзіны і інвентар для спецыяльных абрадаў. Менавіта гэтыя знаходкі прымушаюць нас успрымаць культуру этрускаў як вельмі загадкавую. Персанажаў, малюнкі дэкору і само прызначэнне прадметаў цяжка расшыфраваць дакладна. Пасудзіны з бронзы літаральна «населены» рознымі персанажамі, занятымі магічным дзействам.



Трыножнік з катлом з грабніцы Барберыні, Палесціна (VII ст. да н. э.)

*Разгледзьце прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва этрускаў у параграфе і электронным дадатку. У чым, на ваш погляд, заключаецца іх своеасаблівасць? Што вас асабліва ўразіла?*

Этрускі — загадкавы народ. З аднаго боку, яны валодалі перадавымі ведамі ў галіне архітэктуры. З другога — былі вельмі рэлігійныя. Але дасягненні этрускаў у дойлідстве і скульптурным партрэце сталі асновай мастацтва старажытных рымлян.

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Параўнайце творы старажытнагрэчаскага і этрускага выяўленчага мастацтва. Паспрабуйце вызначыць агульнае і адрознае. Праілюструйце свой адказ мастацкімі прыкладамі.

2. Па́бла Піка́са — знакаміты мастак XX стагоддзя — любіў ствараць кераміку з выкарыстаннем матываў твару або цела чалавека. Параўнайце керамічныя пасудзіны Пікаса і этрускіх майстроў. Апішыце, у чым іх падабенства і адрозненне, звярнуўшы ўвагу на колер, форму, ступень праўдзівасці выявы.



**П. Пікаса.** Керамічная пасудзіна (XX ст.)

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Бронзавую скульптуру ваўчыцы (электронны дадатак) у старажытнасці называлі «маці рымлян». Яна стала сімвалам Вечнага горада — Рыма. Яе стварэнне прыпісваюць этрускім майстрам. Невядомы скульптар аб'яднаў у статуі Капіталійскай ваўчыцы натуральнасць і дэкаратыўнасць. Разгледзьце выяву звера. Што аб'ядноўвае яго з хімерай з Арэца? Якія дэталі скульптур рэалістычныя, якія маюць рысы дэкаратыўнасці? Стварыце з пластыліну фігурку жывёлы, стылізаваную пад скульптуру этрускаў.

## § 29. АРХІТЭКТУРА СТАРАЖЫТНАГА РЫМА: НАВАТАРСТВА, ВЕЛІЧ І ІНЖЫНЕРНАЕ МАЙСТЭРСТВА

Архітэктуру Старажытнага Рыма гэтак жа, як і архітэктуру Старажытнай Грэцыі, называюць класічнай. Рымскія дойліды стварылі непаўторныя збудаванні, якія ўражваюць людзей з усяго свету. Пераасэнсаваўшы і захаваўшы лепшыя архітэктурныя традыцыі,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Апіева дарога
(канец IV ст. да н. э.)



Мост Фабры́цыя цераз Тыбр
(I ст. да н. э.)

рымляне дапоўнілі іх новымі вынаходствамі. Мэтай архітэктурных пабудоў было ўслаўленне імперыі. А ідэалам — спалучэнне карысці і прыгажосці.

***Як выглядаў старажытнарымскі горад.*** Культурнае жыццё старажытных рымлян праходзіла ў гарадах. Таму дойліды планавалі свае гарады так, каб жыхарам у іх было камфортна і бяспечна. Гарады былі абкружаны крапаснымі сценамі і мелі выразную структуру. Галоўныя вуліцы перасякалі горад з усходу на захад і з поўначы на поўдзень. Тэрыторыя горада падзялялася на кварталы.

Рымляне арганізоўвалі жыццё ў гарадах як заваёўнікі, улічваючы неабходнасць хутка мабілізаваць ваенныя сілы ў выпадку баявых



Табуларый на Рымскім форуме (I ст. да н. э.). Графічная рэканструкцыя

дзеянняў. У сувязі з гэтым яны надавалі вялікую ўвагу *дарогам*. Добрая дарога скарачала час перамяшчэнняў як унутры горада, так і з аднаго пункта (ваеннага лагера або паселішча) у іншы.

Адны дарогі, найбольш важныя, брукавалі каменем, іншыя пакрывалі ўтрамбаваным пяском. Першая з брукаваных дарог Старажытнага Рыма — *А́піева дарога* — была названа «царыцай дарог». Менавіта яна дазволіла наладзіць зносіны з Грэцыяй і Егіптам. Гэта было неабходна для ваеннай справы, развіцця гандлю і пашырэння культурных сувязяў.

Яры і рэкі, з якімі сустракаліся будаўнікі дарог, змушалі ўзводзіць каменныя *масты*, здольныя стагоддзямі вытрымліваць паходы шматлікіх войскаў. Такіх мастоў, як у Старажытным Рыме, яшчэ не ведала ніводная цывілізацыя. Трывалыя, працягласцю нават у некалькі кіламетраў, масты мелі гарманічныя архітэктурныя формы. У праёмах шматразова паўтаральных арак адкрываліся цікавыя панарамы.

Гарадскім цэнтрам быў *форум* — плошча. Менавіта на форуме праходзілі сходы грамадзян, праводзіліся дыскусіі, выступалі дзяржаўныя дзеячы. Тут жа размяшчаліся крамы гандляроў, бібліятэкі, храмы, будынкі суда... Форумы будавалі не толькі ў буйных гарадах, такіх як Рым і Пампеі, але і ў правінцыяльных. Аднак самай раскошнай і пышнай была архітэктура форумаў Рыма. У гэтым горадзе, у адрозненне ад іншых, на працягу старажытнай эпохі быў створаны не адзін, а некалькі форумаў.

*Першы рымскі форум* арганізавалі ля Капіталійскага ўзгорка як галоўную гарадскую плошчу. На ім быў пабудаваны дзяржаўны архіў — *Табула́рый*. Менавіта ў гэтым будынку ўпершыню ў архітэктуры Рыма гарманічна злучыліся запазычаныя ў грэкаў ордарныя формы і новы элемент — *арка́да* — шэраг паўтаральных арак, устаноўленых на апорах. Аркада выкарыстоўвалася як «сценка» форума альбо займала цэлы ярус-паверх пабудовы.

*Са словам «форум» мы сустракаемся і ў наш час. Якая, на вашу думку, існуе сувязь паміж форумам у Старажытным Рыме і форумамі ў сучаснай культуры?*



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***Ідэі трыумфу ў Старажытным Рыме.*** Свае ваенныя подзвігі і культурныя дасягненні рымляне праслаўлялі праз веліч архітэктурных формаў і пышнае дэкаратыўнае ўбранне збудаванняў. Адным з такіх збудаванняў стала трыумфальная арка. Яе правобразам былі гарадскія вароты, а сімвалізавала яна ўваход у вялікую дзяржаву — Рым. Трыумфальныя аркі ўзводзілі не толькі ў гарадах, але і на межах з заваяванымі дзяржавамі. Такіх збудаванняў у культуры Старажытнага Рыма налічвалася больш за 300.



Трыумфальная арка імператара Канстанціна ў Рыме (IV ст.)

Трыумфальныя аркі мелі адзін або тры пралёты для праходу або праезду грамадзян. У архітэктуры гэтых збудаванняў рымляне выкарыстоўвалі ардарныя элементы. Упершыню ў трыумфальных арках быў выкарыстаны *а́тык* — дэкаратыўная сценка, размешчаная вышэй за карніз. На гэтай дэкаратыўнай сценцы размяшчаліся выбітыя прысвячальныя надпісы або рэльефы.

*На сценах аркі імператара Канстанціна засталіся ўнікальныя выявы. Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах звесткі пра іх.*

***Інжынерны і будаўнічы геній рымлян.*** Адна з самых значных знаходак рымлян — *бетон,* з'яўленне якога адносіцца да канца III стагоддзя да н. э. Яго рыхтавалі на аснове вапны з дадаваннем вулканічнага пяску. Спачатку бетон выкарыстоўвалі як злучальны раствор для каменнай кладкі сцен. А пазней рымляне пачалі выкарыстоўваць яго і як асноўны будаўнічы матэрыял для ўзвядзення жылых дамоў і грамадскіх збудаванняў.

Будынкі выглядалі пераканаўча і ўрачыста. Абліцаваныя мармуровымі плітамі, яны здаваліся створанымі цалкам з гэтага матэрыялу. Аднак усярэдзіне быў бетон, які дазваляў узводзіць грандыёзныя скляпенні і аркады.

Аркада выкарыстоўвалася ў Старажытным Рыме пры будаўніцтве *акведу́каў* — збудаванняў у выглядзе моста з трубаправодам або каналам для падачы вады цераз раку, роў, яр. Але, у адрозненне ад дарожных мастоў, у акведуках аркада мела больш зграбныя формы. Шмат'ярусная кампазіцыя перадавала накіраванасць архітэктурных формаў увышыню. Ніжні ярус служыў свайго роду базай, апорай. Ён меў найбольш масіўныя формы. Мастацкі акцэнт дойліды зрабілі на сярэдні ярус. Верхні ж ярус служыў завяршальным элементам.



Гарскі мост, Францыя (сярэдзіна I ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Акведук у Сегові, Іспанія (I ст.)

*Разгледзьце акведукі. Падумайце, як і чаму змяняецца ўражанне ў залежнасці ад канструкцыі акведукаў.*

Дойліды Старажытнага Рыма стварылі цудоўныя збудаванні і архітэктурныя ансамблі, якія зрабіліся яркімі прыкладамі ўмелага спалучэння традыцыйных будаўнічых прыёмаў і наватарскіх архітэктурных пошукаў. Велічная па духу, грандыёзная па формах, урачыстая па характары архітэктура стала прыкладам увасаблення сілы і магутнасці дзяржавы ў мастацкіх вобразах.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пералічыце асноўныя вынаходкі старажытнарымскіх дойлідаў. Ахарактарызуйце адну з іх.

2. Рымскі архітэктар і інжынер Вітрýвій у I стагоддзі да н. э. абгрунтаваў асноўныя патрабаванні да архітэктуры: «Карысць, трываласць, прыгажосць». Як вы думаеце, ці актуальныя сёння гэтыя патрабаванні? Якое з іх, на ваш погляд, з'яўляецца найбольш важным? Прывядзіце аргументы. Па адказ звярніцеся да электроннага дадатку.

Праз некалькі стагоддзяў трыумфальныя аркі, што ўвасаблялі магутнасць дзяржавы, пачалі зноў узводзіць у розных гарадах свету. Усталёўвалі іх у гонар важных падзей. З нагоды перамогі ў ваенных бітвах трыумфальныя аркі і трыумфальныя вароты былі пастаўлены ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Курску (Расія), Патсдаме (Германія).

Трыумфальная арка ў беларускім горадзе Магілёве адлюстроўвае палітыку дзяржавы па ўвекавечанні гістарычнай памяці. Даведайцеся ў інфармацыйных крыніцах, да якой падзеі было прымеркавана яе будаўніцтва. Назавіце архітэктурна-мастацкія асаблівасці.




Трыумфальная арка ў Магілёве. Архітэктар В. Рагоўцаў (2017)

## § 30. ВЫДАТНЫЯ ПАБУДОВЫ СТАРАЖЫТНАГА РЫМА

Большасць часу рымляне праводзілі па-за домам: на вуліцах, форумах, у тэрмах, цырку або тэатры. Таму архітэктурным пабудовам самага рознага прызначэння ўладары Рыма надавалі шмат увагі. Праслявіўшы сябе ў камені, яны імкнуліся захаваць свае імёны ў гісторыі.

***Амфітэатр Калізей.*** Важнае месца ў жыцці рымлян займалі відовішчы, любімымі сярод якіх былі баі гладыятараў і цкаванне звяроў. Спачатку яны адбываліся на форуме, у цырку або тэатры. А пры імператарах Флавіях быў пабудаваны *амфітэатр*, названы за свае грандыёзныя памеры *Калізей*, гэта значыць каласальны, велічэзны.

Калізей быў пабудаваны незвычайна. Чатыры ярусы глядацкіх месцаў узвышаліся прыступкамі над авальнай арэнай. Гэта давала магчымасць усім наведвальнікам добра бачыць гладыятарскія баі. Выцягнутая форма арэны дазваляла з размахам праводзіць баі на забаву публіцы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Амфітэатр Флавіяў (Калізей) (I ст.). Графічная рэканструкцыя

Пры гэтым кожны ярус атрымаў сваё архітэктурна-мастацкае афармленне. Аркі галерэі ніжняга яруса, як найбольш масіўнага, які нясе на сваіх «плячах» наступныя аркады, абкружалі дарычныя паўкалоны. Іанічны ордар дойліды выкарыстоўвалі ў другім ярусе. А карынфскі як найбольш урачысты — у трэцім. У прасветах арак другога і трэцяга ярусаў былі ўсталяваны скульптуры. Яны былі бачныя здалёк, нібы запрашалі грамадзян Рыма наведаць амфітэатр і ўбачыць небывалыя відовішчы.

*Ідэі старажытнарымскіх архітэктараў да нашага часу выкарыстоўваюць пры будаўніцтве цыркаў і стадыёнаў. Даведайцеся пра іх у інфармацыйных крыніцах. Падзяліцеся інфармацыяй з аднакласнікамі.*

***Пантэон — храм усіх багоў.*** Адно з грандыёзных культавых збудаванняў антычнага свету атрымала назву *Пантэон* — храм усіх багоў. У гэты храм маглі ўваходзіць не толькі жрацы, але і ўсе грамадзяне Рыма. У Пантэоне знайшлі ўвасабленне найлепшыя дасягненні ў галіне будаўнічага мастацтва.

Бетон дазволіў узвесці небывалы па памерах купал — дыяметрам больш за 43 метры. Цыліндрычная форма падмурка купала адлюстравала ідэю яднання з багамі, спакою, вечнасці. Класічны порцік карынфскага ордара надаў урачыстасць уваходу ў храм.

Пантэон (II ст.)




Трапляючы ўнутр, грамадзяне Рыма адчувалі хваляванне, далучаліся да таінства зносін з багамі.

*Будынак Пантэона меў незвычайнае асвятленне. Даведайцеся ў інфармацыйных крыніцах пра тое, як сонечнае святло трапляла ўнутр будынка і якое інжынернае рашэнне звязана з гэтай асаблівасцю храма.*

***Форум імператара Траяна.*** Апошнім у Рыме было ўзведзена самае значнае і грандыёзнае архітэктурнае збудаванне — *форум імператара Тра́яна*. Гэты форум і звязаны з ім пяціпавярховы



Форум Траяна (II ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

рынак будаваліся ў памяць пра два паходы Траяна, які захапіў велізарную тэрыторыю і незлічоныя скарбы Да́кіі. Дзяржаўная казна поўнілася золатам захопленых народаў. Дзякуючы гэтаму форум будавалі вельмі хуткімі тэмпамі.

Уваход на форум адкрывала *трыумфальная арка Траяна*, узведзеная ў яго гонар. У цэнтры шырокай плошчы быў устаноўлены пазалочаны конны манумент імператара. Таксама да плошчы прымыкалі базі́ліка і храм Траяна. За імі сіметрычна размяшчаліся дзве бібліятэкі — лацінская і грэчаская.



Трыумфальная калона Траяна (II ст.)



Фрагмент калоны Траяна (II ст.)

Паміж бібліятэкамі высілася *трыумфальная калона Траяна* вышынёй 38 метраў. Яе ўпрыгожвала спіральная стужка рэльефаў — 23 віткі даўжынёй 190 метраў. Адлюстраваныя на калоне сцэны апавядалі пра жыццё народаў, захопленых рымскімі салдатамі на чале з Траянам. Сам рэльеф быў размаляваны, а дэталі пазалочаныя. Пазней статую Траяна, размешчаную на самым версе калоны, замянілі скульптурай святога Пятра.

*Уважліва разгледзьце ў электронным дадатку дэкор калоны Траяна. Якія сюжэты вы ўбачылі на ёй? Апішыце адзін з сюжэтаў.*

***Рымскія тэрмы.*** Важнае месца ў культурным жыцці рымлян займалі *тэ́рмы*, або грамадскія лазні. Яны не толькі прызначаліся для абмыванняў і іншых водных працэдур, але і былі месцам для культурнага адпачынку і заняткаў спортам.

Сваімі каласальнымі памерамі і багатым убраннем праславіліся *тэрмы імператара Карака́лы*. Па маштабе і сіметрычнай планіроўцы яны нагадвалі маленькі горад. З боку галоўнага ўвахода, уздоўж агароджы, размяшчаліся лазні. Сэрцам тэрмаў былі памяшканні для водных працэдур, пакоі для адпачынку і двары для прагулак. У комплекс тэрмаў Каракалы ўваходзілі дзве бібліятэкі, стадый (стадыён) для гімнастычных гульняў, а таксама парк.

Архітэктурны ансамбль тэрмаў Каракалы быў збудаваны на схіле пагорка, што давала магчымасць бесперашкодна падаваць у лазні ваду. Багаты інжынерны досвед рымлян дазволіў ім правесці пад падлогай спецыяльныя каналы для падагрэву, у якія падавалася гарачае паветра.

**Цікавы факт!**
У некаторых басейнах была такая гарачая падлога, што людзі заходзілі ў ваду ў скураных сандалях.



Руіны тэрмаў Каракалы, г. Рым, Італія



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Галава атлета-пераможцы. Фрагмент мазаікі з тэрмаў Каракалы (III ст.)

Прасторныя залы ўпрыгожвалі мазаічныя падлогі, калоны з пышнымі капітэлямі, статуі, фантаны. Да нашага часу тэрмы Каракалы дайшлі ў руінах, аднак і іх маштаб здзіўляе! Больш поўнае ўражанне пра комплекс тэрмаў могуць даць сучасныя рэканструкцыі. А вось захаваныя фрагменты мазаік і статуй распавядаюць нам пра вытанчанае мастацкае афармленне тэрмаў.

*Што запазычылі сучасныя дойліды ў старажытных рымлян пры стварэнні архітэктурных збудаванняў для адпачынку? Звярніцеся да электроннага дадатку.*

Рым быў адным з самых вялікіх і багатых гарадоў у свеце. Яго вобраз стваралі выдатныя архітэктары і інжынеры. Архітэктура «вечнага горада» — сапраўдная энцыклапедыя рознага тыпу збудаванняў і крыніца натхнення для дойлідаў наступных эпох, аж да нашага часу.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Разгледзьце ўважліва рымскі амфітэатр у параграфе і электронным дадатку. Падумайце і назавіце некалькі сучасных архітэктурных збудаванняў, у якіх выкарыстаны матывы рымскага амфітэатра. Праілюструйце адказ мастацкімі прыкладамі.

2. Старажытнарымскі гісторык Светоній пісаў пра рымскага імператара Актавія́на Аўгуста: «Ён так адбудаваў горад, што па праву ганарыўся тым, што прыняў Рым цагляным, а пакідае мармуровым». Патлумачце гэты выраз, выкарыстоўваючы прыклады архітэктурных збудаванняў з параграфа.



Мазаічная падлога ў тэрмах Каракалы (III ст.)

ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Разгледзьце фрагмент мазаічнай падлогі ў тэрмах Каракалы. На аркушы паперы ў клетачку намалюйце эскіз мазаікі для памяшкання, які складаецца са спалучэння белых і чорных геаметрычных фігур.

## § 31. ПАРТРЭТНЫ ЖАНР У СКУЛЬПТУРЫ СТАРАЖЫТНАГА РЫМА

Вядучым жанрам выяўленчага мастацтва ў Старажытным Рыме быў *партрэт*. Гэта тлумачыцца характарам старажытнарымскай культуры. Рымляне любілі гісторыю і шанавалі дакладнасць і рэалістычнасць партрэта. Яны ўспрымалі яго як своеасаблівы гістарычны дакумент. Больш за ўсё ў старажытнарымскім мастацтве жанр партрэта знайшоў адлюстраванне ў скульптуры.

***Скульптурныя партрэты продкаў.*** Скульптурны партрэт у старажытнарымскай культуры быў звязаны з культам продкаў. Ім пакланяліся амаль як багам. Партрэты продкаў захоўвалі ў парадных пакоях дома ў асаблівых шафах або нішах. Скульптурныя галовы выраблялі з розных матэрыялаў: гіпсу, воску, гліны, мармуру. Умацоўвалі іх на падстаўках з надпісам, які паведамляў пра імя і ўчынкі продка.

Лічылася, што чым больш *бюстаў* у сям'і, тым яна больш старажытная, а значыць, і больш аўтарытэтная. Такія сямейныя партрэты звычайна былі прыжыццёвымі выявамі. Іх стваралі па васковых масках, знятых з твару чалавека. Гэтаму рымляне навучыліся ў егіпцян. Рымскі скульптар узнаўляў усе партрэтныя рысы з высокай дакладнасцю.

*Скульптурныя партрэты продкаў выкарыстоўвалі ў пахавальных цырымоніях. Сваякі неслі іх у руках услед за памерлым. Як вы лічыце, што гэта азначала? У адказе выкарыстоўвайце ілюстрацыі з электроннага дадатку.*

***Ідэалізацыя вобразаў.*** У пачатку I стагоддзя пры стварэнні скульптурных партрэтаў старажытнарымскія майстры звярталіся да



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Статуя рымляніна з бюстамі продкаў (I ст. да н. э.)



Статуя Актавіяна Аўгуста з Прыма Порта (I ст.)

досведу старажытных грэкаў. У пошуку гармоніі партрэтныя рысы моцна ідэалізаваліся.

Асабліва ярка ідэалізацыя вобразаў прыкметная *ў скульптурнай выяве імператара Актавіяна Аўгуста*. Гэты кіраўнік валодаў розумам і цвёрдым характарам, але не адрозніваўся прыгажосцю і фізічнай сілай. Тым не менш у статуі Актавіяна з Пры́ма Порта скульптар адлюстраваў імператара атлетычна складзеным і мужна прыгожым. Паводле задумы сам бог вайны Марс выступае з прамовай перад арміяй. Сваёй дасканаласцю скульптура нагадвае выдатныя грэчаскія ўзоры. Аднак энергічны жэст узнятай рукі выдае выключна рымскі, уладны характар правіцеля.

*Знайдзіце ў інфармацыйных крыніцах статую Актавіяна з Кум. Падумайце, у вобразе якога бога ён выяўлены. Аргументуйце сваё меркаванне.*

***Жаночыя партрэты.*** Жанр жаночага партрэта пачынае развівацца пазней за мужчынскі, толькі пры імператары Актавіяне Аўгусце. У гэты перыяд з'яўляецца вялікая колькасць партрэтаў жонкі імператара — Лі́віі. Дзякуючы рэалістычнасці старажытнарымскія жаночыя партрэты і дагэтуль з'яўляюцца неацэннай крыніцай для гісторыі касцюма і моды.



Бюст Лівіі (I ст.)

У партрэце Лівіі рысы твару прыкметна ідэалізаваныя, але аснова вобраза рэалістычная. Шырока расстаўленыя вочы, буйны нос, маленькі рот... Падціснутыя вусны выдаюць халодны і амбіцыйны характар першай дамы дзяржавы. Валасы Лівіі ўкладзены па апошняй модзе таго часу: яны сабраны над ілбом у авальны локан. Калі ў моду ўвайшлі жаночыя прычоскі з крута завітых валасоў, укладзеных у форме высокай кароны, усіх дам пачалі адлюстроўваць менавіта ў такім выглядзе.

*Разгледзьце прычоску старажытнай рымлянкі. Якія з элементаў гэтай прычоскі вам знаёмыя? Як вы думаеце, у якіх выпадках можна выкарыстоўваць гэтыя элементы ў наш час?*

***Асаблівасці старажытнарымскага партрэта.*** Ствараючы партрэт, рымскія скульптары імкнуліся падкрэсліць *індывідуальнасць персанажа*. Яны дакладна паўтаралі міміку мадэлі, вылучалі яе самыя яркія і характэрныя рысы.

У партрэце імператара Веспасія́на ўвасоблены вобраз энергічнага і дзелавога чалавека. Скульптар невыпадкова падкрэсліў грубаватыя рысы твару і масіўную галаву. Бо Веспасіян зрабіў кар'еру толькі дзякуючы сваёй правінцыяльнай хватцы. Па-майстэрску злоўленая міміка Веспасіяна перадае яго здаровы розум, прыродную праніклівасць і хітрасць.

Пазней, у пачатку III стагоддзя, скульптары пачынаюць звяртаць увагу не толькі на знешнасць, але і на ўнутраны стан мадэлі.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Бюст Веспасіяна (I ст.)



Бюст Марка Аўрэлія (II ст.)



Бюст Каракалы (III ст.)

Напрыклад, бюст Марка Аўрэлія ўяўляе сабой абцяжаранага вярхоўнай уладай імператара. Погляд яго стомленых вачэй выдае сапраўдную натуру гэтага філосафа на троне. Перад намі паўстае чалавек, для якога зямное быццё — цяжкая абуза.

А партрэт імператара Каракалы, наадварот, паказвае каварнага і жорсткага чалавека. Змрочнасць і падазронасць ясна чытаюцца ў выразным нахіле галавы, у падбародку, што крута выступае наперад, у зрослых насупленых бровах. Тое, як глыбока здолелі пранікнуць у чалавечую натуру старажытнарымскія скульптары, проста зачароўвае.

*Параўнайце скульптурныя партрэты Марка Аўрэлія і Каракалы. Ахарактарызуйце сродкі выразнасці, з дапамогай якіх скульптары дасягнулі высокага ўзроўню ў перадачы жыццёвай праўды — амаль як на фатаграфіі.*

***Конная статуя.*** Большасць старажытнарымскіх партрэтаў — гэта бюсты. Аднак рымскія скульптары выкарыстоўвалі і іншыя формы партрэтаў. Яны вынайшлі, напрыклад, *конную статую*. Паўстаць перад гледачом у выглядзе вершніка, які гарцуе на кані, любілі і рымскія военачальнікі, і імператары. Але да нас дайшоў толькі адзін такі конны манумент — *бронзавая статуя Марка Аўрэлія*.

Калісьці яна стаяла на Рымскім форуме, але ў XVI стагоддзі вялікі італьянскі скульптар і архітэктар Мікела́нджэла ўстанавіў яе ў цэнтры перабудаванай ім Капіталійскай плошчы. У XX стагоддзі з мэтай захавання ўнікальны твор перанеслі ў залы Капіталійскага музея. А на плошчы выставілі дакладную копію антычнага арыгінала.

*Конная статуя дагэтуль застаецца папулярнай формай партрэта. Калі перад жывапісцам або скульптарам узнікае задача праслаўлення нейкай гераічнай асобы, ён, як правіла, звяртаецца да коннага манумента. Як вы думаеце, чаму?*

Рымскі скульптурны партрэт — адна са значных з'яў у развіцці жанру партрэта. У адрозненне ад грэчаскага, ён больш канкрэтны, рэалістычны і праўдзівы. Акрамя мастацкіх якасцяў, рымскі скульптурны партрэт мае высокую гістарычную каштоўнасць.



Конная статуя Марка Аўрэлія (II ст.)



**А. Прохараў, С. Ігнацьеў, Л. Мінкевіч.** Помнік Усяславу Чарадзею, Полацк (2007)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

### ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Партрэт адыгрываў важную ролю ў культуры Старажытнага Егіпта і Старажытнага Рыма. А ў мастацтве Старажытнай Грэцыі быў амаль не запатрабаваны. Чаму?

2. Статуя Усяслава Чарадзея, устаноўленая ў Полацку, — сімвал нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Яна сведчыць пра багатую гісторыю нашай краіны і яе культурныя карані. Такія помнікі адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні нацыянальнага гонару. Параўнайце конную статую Марка Аўрэлія са статуяй Усяслава Чарадзея. Што іх аб'ядноўвае?

### ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Падрыхтуйце ілюстраваны аповед на тэму «Рымскія правіцелі ў люстэрку мастацтва». Дапоўніце пададзеную ў параграфе і электронным дадатку галерэю партрэтаў старажытнарымскіх імператараў. Збярыце звесткі пра жыццё і характар двух-трох з іх.

## § 32. СВОЕАСАБЛІВАСЦЬ ТЭХНІК МАНУМЕНТАЛЬНАГА ЖЫВАПІСУ СТАРАЖЫТНАГА РЫМА

Манументальны жывапіс у Старажытным Рыме быў вельмі запатрабаваны — ён з'яўляўся галоўным сродкам упрыгожвання інтэр'ера. Сцены храмаў, грамадскіх збудаванняў, багатых жылых дамоў звычайна размалёўвалі фрэскамі або ўпрыгожвалі мазаікай.

***Аблічча чалавека.*** Нароўні са скульптурнымі партрэтамі ў Старажытным Рыме былі распаўсюджаны і жывапісныя. Праўда, захаваліся яны горш. *Партрэт Лу́цыя Септы́мія Севе́ра з сям'ёй* — адзіная жывапісная выява рымскага імператара, якая дайшла да нас. На ім Луцый Септымій Север прадстаўлены разам з жонкай і сынамі — Каракалам і Гетам. Партрэт афіцыйны і ўрачысты. Усе апрануты ў дарагое адзенне, а сам імператар і яго старэйшы сын Каракала



Партрэт Луцыя Септымія Севера з сям'ёй (II ст.)

ўвянчаны залатымі лаўровымі вянкамі. Луцый Септымій Север спадзяваўся, што пасля яго смерці браты будуць правіць разам. Аднак не прайшло і года пасля смерці бацькі, як Каракала забіў Гету, загадаўшы знішчыць усе выявы і тэксты, у якіх згадвалася яго імя. Расправе падвергнууўся і сямейны партрэт: твар Геты на ім, на жаль, бязлітасна выскрабены.

*Разгледзьце ўважліва партрэт Луцыя Септымія Севера з сям'ёй. На малюнку добра заўважнае месца, на якім быў твар Геты. Як ён мог выглядаць? Прыдумайце яго слоўны партрэт.*

***Сакрэты з-пад попелу.*** У выніку вывяржэння вулкана Везу́вія пад патокамі лавы і попелам загінулі цэлыя гарады — Пампе́і, Геркула́нум і Ста́біі. Але менавіта гэта падзея дазволіла захаваць для нашчадкаў мастацкія каштоўнасці далёкага мінулага. Зніклыя пад пластом лавы і попелу, старажытнарымскія гарады захаваліся да нашага часу ў амаль некранутым выглядзе. Археалагічныя раскопкі, якія ідуць на іх тэрыторыі ўжо больш за дзвесце гадоў, адкрылі мноства твораў мастацтва, у тым ліку і жывапісных.

Галоўным скарбам *вілы Містэрый*, пабудаванай у Пампеях, лічацца фрэскі, што цудам захаваліся пасля вывяржэння Везувія. Яны ўражваюць незвычайна гарачым каларытам. Фон насычанага



Фрэскі вілы Містэрый (II ст.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

чырвонага колеру дапамагае вылучыць фігуры людзей, намаляваныя больш празрыстымі фарбамі. Мы можам бачыць каля 25 персанажаў, якія паказаны ў час розных рытуальных дзеянняў, прысвечаных культу Дыяніса.

Роспіс залы завяршаецца выявай прыбірання нявесты і партрэтам, як мяркуюць, гаспадыні дома. Сёння значэнне некаторых сцэн расшыфравана, але многія засталіся для навукоўцаў загадкай. Частка сюжэтаў адбываецца ў зямным свеце, а частка — у містычным.

*Ахарактарызуйце каларыт кампазіцыі фрэсак вілы Містэрый. Выкажыце здагадку, для чаго гаспадарам дома служыла гэтак пышна ўпрыгожанае памяшканне.*

***Карціны, выкананыя без пэндзля.*** Мазаікі ў Рыме мы можам убачыць і ў прыватных дамах, і ў грамадскіх пабудовах. Гэты від манументальна-дэкаратыўнага жывапісу надзвычай устойлівы да вільгаці і таму часта выкарыстоўваўся ў аздабленні тэрмаў. Мазаікай аздаблялі не толькі сцены, але і падлогі. Хоць адна мазаіка мелася ў кожным старажытнарымскім заможным доме. Яна выконвалася з розных матэрыялаў: *сма́льты* (каляровага непразрыстага



Бітва Аляксандра Македонскага з Дарыем.
Мазаіка з дома Фаўна ў Пампеях (II ст. да н. э.)

шкла) або камянёў. Асаблівасцю рымскай мазаікі было тое, што яе модулі (кубікі смальты або каменю) укладваліся ў напрамку ліній, якія падкрэслівалі аб'ём адлюстраваных аб'ектаў.

У *доме Фаўна*, адным з самых багатых дамоў Пампей, была знойдзена падлогавая мазаіка памерам прыкладна тры на шэсць метраў. На ёй адлюстравана бітва паміж войскамі Аляксандра Македонскага і персідскага цара Да́рыя. Яна скончылася паразай персаў. І гэта разумее глядач, які бачыць на мазаіцы пераломны момант бітвы.

Не звяртаючы ўвагі на воінаў, што падаюць, Аляксандр на верным кані Буцэфа́ле рвецца да Дарыя. Здаецца, што ён б'е саперніка і дзідай, і гарачым позіркам. Пад такім напорам войска Дарыя, ахопленае замяшаннем, разбягаецца ў розныя бакі. Па-майстэрску распрацаваная кампазіцыя выдатна аднаўляе эмацыянальны напал бітвы і прадказвае яе зыход.

*Навукоўцы мяркуюць, што мазаіка з дома Фаўна выканана па карціне грэчаскага мастака Філо́ксена. Падумайце, якое значэнне для сусветнай культуры мае работа рымскіх мазаістаў. Чаму сучасныя майстры зрабілі яе дакладную копію (арыгінал захоўваецца ў Неапалі)?*

***Незвычайныя функцыі мазаікі.*** Цікава, што адной з функцый рымскай мазаікі была ахоўная: лічылася, што такая выява можа засцерагаць ад «благога вока», злодзеяў, зайздроснікаў і іншых непрыемнасцей.

Сустракаюцца ў старажытнарымскім жывапісе і побытавыя сцэны, і ўзоры *анімалістычнага жанру*. Цікавыя мазаікі з вілы імператара Адрыяна ў Ты́валі. Яны мелі самыя розныя сюжэты. Галубы, якія п'юць з «крыніцы жыцця», мелі сімвалічнае значэнне і былі звязаны з хрысціянскай верай. А мыш, якая імкнецца да грэцкага арэха, уяўляла сабой займальны эпізод, прыкмечаны дапытлівым мастаком. Звярніце ўвагу, што мастак адлюстраваў нават лёгкія цені ад грызуна і арэха.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

 

Мазаікі з вілы Адрыяна ў Тывалі (1-я палова II ст.)

*Якія эмоцыі вы адчуваеце, разглядаючы мазаікі старажытных майстроў (электронны дадатак)? Як яны раскрываюць прыгажосць побыту жыхароў Рыма?*

Мастакі Старажытнага Рыма дасягнулі вялікіх поспехаў у авалоданні ўсімі мастацкімі сродкамі жывапісу. Тэхнічная дасканаласць, разнастайнасць і харaство каларыту, тонка прыкмечаныя моманты рэчаіснасці і адначасова складанасць міфалагічных сюжэтаў адрозніваюць старажытнарымскі жывапіс.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Пералічыце асноўныя сюжэты і тэмы, якія былі распаўсюджаны ў жывапісе Старажытнага Рыма. Як яны характарызуюць разуменне прыгажосці рымлянамі? Звярніцеся да электроннага дадатку.

2. Ахарактарызуйце своеасаблівасць тэхнік жывапісу ў Старажытным Рыме. Якое значэнне яны маюць у сучаснай культуры?

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Падбярыце шэраг твораў старажытнарымскіх жывапісцаў, якія можна аднесці да вызначанага жанру сучаснага жывапісу: нацюрморту, анімалістычнага жанру, партрэта і г. д. Раскажыце аднакласнікам пра тэхніку іх стварэння, месцазнаходжанне, гісторыю здабыцця. Патлумачце, чаму вы выбралі для прыкладу менавіта гэтыя творы.

# § 33. ТЭАТР І МУЗЫКА Ў СТАРАЖЫТНЫМ РЫМЕ

У Старажытным Рыме тэатр з'явіўся на некалькі стагоддзяў пазней, чым у Грэцыі. Тэатральныя паказы адразу сталі неад'емнай часткай старажытнарымскай культуры. Захаваўшы лепшае з таго, што рымляне запазычылі ў грэкаў, яны ўзбагацілі і разнастаілі тэатральнае мастацтва новымі ідэямі, тэмамі і сюжэтамі.

***Вытокі старажытнарымскага тэатра.*** Тэатральныя паказы ў Старажытным Рыме звязаны з вясёлымі сельскімі святамі збору ўраджаю, у час якіх жыхары спявалі гарэзныя жартоўныя песні. А таксама са святкаваннямі і гульнямі, што ладзіліся ў гонар багоў.



Музы́ка і танцор. Фрэска з грабніцы Трыклінія, або грабніцы Свята (V ст. да н. э.)

Важную ролю ў станаўленні старажытнарымскага тэатра адыгралі *сату́ры* — невялікія сцэнкі камічнага характару. Гэты тэатральны жанр у Старажытны Рым у час моцнай эпідэміі прынеслі этрускі. Этрускіх акцёраў запрасілі, каб улагодзіць багоў сцэнічнымі гульнямі — «справай новай для ваяўнічага народа». Яны прыгожа танцавалі пад акампанемент флейты. Рымляне, пераймаючы этрускія танцы, унеслі ў іх змены, дадаўшы песні, вершы без рыфмы, жартоўныя дыялогі і жэсты.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Персанаж атэланы (І ст. да н. э.)

Апрача сатур у Старажытным Рыме быў распаўсюджаны яшчэ адзін жанр — *атэла́на*. Гэты від камічных спектакляў трапіў у рымскі тэатр з горада Атэлы. Асаблівасцю атэланы з'яўляецца тое, што ў ёй удзельнічаюць пастаянныя персанажы — маскі. Кожная маска хавала пэўны характар. Дурны Мак, балбатун Букон, скупы стары Пап і злы гарбун Дарсен... Сцэнарый для атэланы не пісалі спецыяльна, выступленне акцёраў часцей за ўсё было імправізацыйным.

*Якое месца ў жыцці рымлян займалі тэатральныя паказы?*

***Жанры старажытнарымскага тэатра.*** Прафесійны тэатр у Старажытным Рыме з'явіўся дзякуючы пераасэнсаванню дасягненняў старажытнагрэчаскай культуры: для пастаноўкі на тэатральнай сцэне рымляне пераклалі грэчаскую драму. Пазней рымляне прыстасавалі грэчаскі тэатральны вопыт да сваіх умоў у адпаведнасці з пажаданнямі і густамі. Асноўнымі сюжэтамі тэатральных п'ес былі падзеі з рымскай гісторыі і жыцця простых людзей.

Галоўнае адрозненне старажытнарымскага тэатра ад грэчаскага заключалася ў імкненні рымлян да забаў і пацехі. Таму гледачы больш любілі камедыю — *паліяту, або камедыю грэчаскага плашча* (па́лія ў перакладзе азначае 'грэчаскі плашч'). Персанажы паліяты апрануты ў грэчаскае адзенне і носяць грэчаскія імёны, а дзеянне адбываецца ў грэчаскім горадзе.

Яркі прадстаўнік паліяты — рымскі драматург *Плаўт*. Яго п'есы былі заснаваны на камічных сітуацыях са штодзённага жыцця простых людзей. На сцэне пастаянна ўзнікалі непаразуменні, інтрыгі, жарты. Дзеянне дапаўнялі песні, музыка, танцы, цыркавыя

**У п’есе Плаўта «Два Менехмы»** сюжэт заснаваны на гісторыі пра двух братоў-блізнят, якія згубіліся ў дзяцінстве. Калі браты аднойчы апынаюцца ў адным горадзе, пачынаюцца заблытаныя і пацешныя непаразуменні, звязаныя з іх падабенствам, — аднаго брата прымаюць за другога. Героі сутыкаюцца з рознымі персанажамі, уцягваюцца ў канфлікты, трапляюць у недарэчныя сітуацыі, што выклікае смех і ў саміх персанажаў, і ў гледачоў.

нумары. Акцёры «заводзілі» гледачоў, звяртаючыся да іх з дасціпнымі рэплікамі і пытаннямі з рознымі інтанацыямі. Гэта вельмі падабалася публіцы, выклікала захоплены водгук.

*Рымскую камедыю часта параўноўваюць з сучаснай аперэтай. Як вы думаеце, чаму?*

***Архітэктура рымскага тэатра.*** Будынак рымскага тэатра з’явіўся не адразу: спектакль ладзілі на драўляных памостах, якія пасля яго заканчэння разбуралі. Гледачы сядзелі на лавах або стаялі. Дэкарацыі былі вельмі простыя. На іх малявалі гарадскую вуліцу з фасадамі некалькіх дамоў. Дзеянне разгортвалася не ўнутры дома, як у грэкаў, а на вуліцы, перад домам.

Пазней былі ўзведзены каменныя будынкі — тэатр Пампе́я і тэатр Марцэ́ла. Памеры тэатраў рабіліся ўсё больш вялікімі, бо колькасць толькі ўдзельнікаў масавых дзей з часам стала дасягаць 16 тысяч, а гледачоў — 50 тысяч. Гэта былі ўжо асобныя адкрытыя архітэктурныя комплексы — амфітэатры і цыркі, пабудаваныя на роўнай мясцовасці. Глядацкія месцы размяшчаліся вакол арэны-пляцоўкі, пасыпанай пяском і галькай.



Сцэна з камедыі Тэрэнцыя «Дзяўчына з А́ндраса». Рэльеф (II ст. да н. э.)



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Тэатр Марцэла ў Рыме (I ст. да н. э.)

Па сваёй форме старажытнарымскі тэатр быў падобны да старажытнагрэчаскага. Аднак многія архітэктурныя элементы мелі свае адрозненні. Вышэйшай, часам у тры паверхі, стала *скена*, што дазволіла выкарыстоўваць больш буйныя і эфектныя дэкарацыі. А вось *архестра* стала меншай і ўяўляла сабой не круг, а паўкруг. *Пу́льпітум* (у грэчаскім тэатры гэта праскеній) быў пашыраны і ператварыўся з часам у асноўную сцэнічную пляцоўку. У грэчаскім тэатры ўваход для гледачоў быў размешчаны зверху, а ў рымскім — унізе падмурка.

З'явіліся ў рымскім тэатры і новыя элементы: *навес* над сцэнічнай пляцоўкай; *заслона*, якая адкрывае і закрывае спектакль, а таксама *фантаны*, што ствараюць разнастайныя эфекты.

Ускладніліся і тэхнічныя прыстасаванні. Гэта было звязана з маштабнасцю і відовішчнасцю паказаў. На сцэне ўспыхвалі пажары, квітнелі раскошныя сады, лёталі прадметы.

Новыя магчымасці дазволілі ладзіць не толькі тэатральныя паказы, але і рэканструкцыі бітваў, гладыятарскія баі, гонкі на калясніцах і спартыўныя спаборніцтвы. Аднак самым дарагім відовішчам у жыцці рымлян былі марскія бітвы — *наўма́хіі*. З дапамогай водаправода, размешчанага ў падземнай частцы амфітэатра, ваду падавалі



**Ж.-Б. Шарпанцье.** Марскі бой у рымскім Калізеі

наверх, ператвараючы арэну-пляцоўку ў возера і ствараючы для гледачоў дзіўныя эфекты.

*Параўнайце будову старажытнагрэчаскага і старажытнарымскага тэатраў (электронны дадатак) паводле плана: архестра, скена, праскеній (пульпітум). Пакажыце падабенствы і адрозненні на канкрэтных прыкладах.*

***Тэатральныя паказы.*** У старажытнарымскім тэатры акцёры доўгі час ігралі без масак, і гледачы маглі назіраць за іх эмоцыямі. Маскі, якія з'явіліся пазней, мелі шырокія адтуліны для рота і вачэй, прычоскі з локанамі. Жэсты і рухі акцёраў, што падкрэслівалі індывідуальнасць персанажа, былі выразныя і старанна прадуманыя. Рымляне распрацавалі адмысловую «мову жэстаў» — кожны рух на сцэне меў пэўнае значэнне.

Да акцёрскай ігры прад'яўляліся высокія патрабаванні. Неабходна было ўмець спяваць, граць на музычных інструментах, танцаваць, выконваць акрабатычныя нумары і фокусы. Паколькі рымскія акцёры, у адрозненне ад грэчаскіх, займалі нізкае грамадскае становішча, за дрэнную ігру на сцэне іх маглі пакараць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Тэатральныя маскі. Мазаіка з вілы Адрыяна ў Тывалі (II ст. да н. э.)

Важнае значэнне ў рымскім тэатры надавалася знешняму выгляду персанажаў. Камічныя акцёры апраналі доўгія плашчы, якія спадалі шырокімі складкамі. Маладыя людзі і салдаты насілі кароткія плашчы, што зашпільваліся пры дапамозе шпількі з аднаго боку. Трагічныя акцёры, дэманструючы веліч сваіх персанажаў, выкарыстоўвалі высокія, да 20 см (!), кату́рны і больш вялікія парыкі.

***Музычнае жыццё рымлян.*** У Старажытным Рыме, як і ў Грэцыі, музыкай захапляліся ўсе. Ні адно свята, тэатральны паказ або масавае відовішча не абыходзілася без музыкі і спеваў. Пад музычны акампанемент выступалі акцёры, танцоры, мімы, паэты... Музыка гучала і ў час паказаў, і ў перапынках. Часам на сцэне знаходзілася больш музыкаў-выканаўцаў, чым артыстаў. Спецыяльна арганізоўваліся спаборніцтвы ў ігры на кіфары і аўлосе, а таксама канцэрты музыкаў-віртуозаў.

Багатыя грамадзяне трымалі ў сваіх дамах інструментальныя ансамблі або аркестры. Сваіх дзяцей яны навучалі спевам і ігры на музычных інструментах. У Рымскай імперыі была заснавана музычная школа.



Бадзяжныя музыкі. Мазаіка. Віла Цыцэрона, Пампеі (II ст. да н. э.)

У рымскіх легіёнах існавалі ваенныя аркестры. Магутныя гукі труб і ражкоў у іх выкананні далёка разносіліся па акрузе і палохалі ворагаў. Духавыя інструменты — *флейта, труба, ці́бія, рог* — былі такія папулярныя, што на асаблівым штогадовым свяце рымляне праводзілі ўрачыстую цырымонію асвячэння труб. Нароўні з духавымі былі распаўсюджаны струнныя — *аўлос*, *кіфа́ра* — і ўдарныя — *кімва́л* і *тымпа́н* — музычныя інструменты.

*Пры ўваходзе ў рымскі тэатр гледачы чулі гукі труб і цібій. Хутчэй за ўсё, гэта музыка не мела дачынення да маючага адбыцца спектакля. Падумайце, з якой мэтай яна выконвалася.*

Старажытнарымскі тэатр прайшоў унікальны шлях развіцця. Галоўнымі героямі шматлікіх трагедый сталі гістарычныя асобы. У камедыях у цэнтры ўвагі апынуліся звычайныя людзі ў кур'ёзных сітуацыях. Спектаклі зрабіліся больш відовішчнымі дзякуючы яркім касцюмам, дэкарацыям і вялікай колькасці выканаўцаў.

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія перавагі былі ў рымскіх акцёраў, якія, у адрозненне ад старажытнагрэчаскіх, масак не насілі?

2. Адна з важных умоў у камічным спектаклі — умець здзівіць гледача. Старажытнарымскі драматург Плаўт рабіў гэта па-рознаму. Напрыклад, у адной з п'ес ён у адным вершы зладзіў «перастрэлку» пытаннямі, у другой — прапанаваў адразу сем пытанняў без адказу. Паспрабуйце разыграць у класе эпізод з любога літаратурнага твора з ярка выяўленым камічным эфектам. Ці атрымалася ў вас выклікаць смех у гледачоў? Раскажыце, што для гэтага спатрэбілася.

## ТВОРЧАЯ МАЙСТЭРНЯ

Акрамя сатуры і атэланы ў Старажытным Рыме была шырока распаўсюджана пантамі́ма — невялікія сцэнкі са штодзённага побыту, сыграныя з дапамогай мімікі і руху. Падрыхтуйце ў класе невялікі тэатральны паказ. Раскажыце простую гісторыю, не прамаўляючы ні слова, выкарыстоўваючы толькі міміку, рухі і жэсты. Пастарайцеся, каб аднакласнікам была зразумелая ваша гісторыя.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# § 34. ТВОРЧЫ ЎРОК. СТАРАЖЫТНАРЫМСКАЯ МАЗАІКА

Мазаічныя выявы эпохі Рымскай імперыі знойдзены ў розных кутках Еўропы, Азіі і Афрыкі. Аднымі з самых вядомых мазаік лічацца падлогавыя выявы з віл горада Цыпóры (Сепфóрыса). З вялікім майстэрствам рымскія мазаісты ўпрыгожылі падлогу трапезнай дома Дыяніса вытанчанымі сцэнамі з жыцця багоў і людзей. Жамчужынай кампазіцыі з'яўляецца твар выдатнай маладой жанчыны, які называюць Монай Лізай з Галілеі.



Мона Ліза з Галілеі. Мазаіка, г. Цыпоры, Ізраіль (V ст.)



Воін з дома Ніла. Мазаіка, г. Цыпоры, Ізраіль (V ст.)

• Разгледзьце фрагменты мазаік з г. Цыпоры. Якое ўражанне яны на вас зрабілі?

• Уявіце, што вы рымскія патрыцыі. Прапануйце сюжэты для ўпрыгожвання сваёй вілы. Выберыце фотаздымак з асабістага фотаальбома. Пераўтварыце яго ў мазаічную выяву пры дапамозе спецыяльных камп'ютарных дадаткаў. Узяўшы выяву ў якасці эскіза, выканайце аплікацыю з кавалачкаў каляровай паперы.



Арнамент. Мазаіка, г. Цыпоры, Ізраіль (V ст.)

# § 35. ТВОРЧЫ ПРАЕКТ

Мастацтва першабытнага грамадства і Старажытнага свету — ключавыя вехі ў гісторыі сусветнай мастацкай культуры. Бо менавіта тады былі закладзены асновы ўсёй сістэмы мастацтва, сфарміраваліся яго асноўныя віды і жанры. Яны працягваюць сваё развіццё і сёння.

Ужо ў першабытную эпоху чалавек усвядоміў сябе як творчую асобу, здольную пераўтвараць навакольную рэчаіснасць паводле законаў прыгажосці. Тым самым ён канчаткова вылучыў сябе з прыроднага свету.

Шмат якія творы першабытнага часу вядомыя сучаснаму чалавеку толькі дзякуючы скрупулёзнай працы даследчыкаў — археолагаў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў…

У вас таксама з’явілася магчымасць стаць даследчыкам і больш глыбока разабрацца ў адным з пытанняў мастацтва першабытнай эпохі (форма, матэрыял і тэхнікі на ваш выбар).



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Прапанаваныя тэмы для даследавання**

- Міфалагічны вобраз у першабытным мастацтве
- Загадкі Стоўнхенджа
- Пра што распавядае нам першабытны мастак
- Адгалоскі першабытнай культуры ў сучасным свеце
- Першабытнае мастацтва на беларускіх землях
- Ад пячоры да экрана: сімволіка жывёл у мастацтве розных эпох
- Геаметрыя першабытнага мастацтва: элементы арнаменту ў сучаснай модзе
- Татэм або музей: малюнак татэмнай жывёлы

Своеасаблівасць архітэктуры і выяўленчага мастацтва Старажытнага Егіпта, Месапатаміі, Індыі і Кітая вызначалася, перш за ўсё, рэлігійнымі і міфалагічнымі ўяўленнямі. У гэтых культурах у народнай творчасці водгаласы старажытнай сувязі магіі і мастацтва захоўваюцца да гэтай пары.

Свае веды вы прымножыце, калі разам з аднакласнікамі абдумаеце і выканаеце міні-праекты на адну з тэм (форма, матэрыял і тэхнікі на ваш выбар).

**Магчымыя тэмы для даследавання**

- Экскурсія па Старажытным Егіпце
- Загадкі старажытнаегіпецкіх пірамід
- Скарбы Тутанхамона
- Сімволіка зікурата
- Рэльефы Месапатаміі
- Прыгоды Гільгамеша
- Бюст Неферціці: жанр партрэта ўчора і сёння
- Каліграфія Кітая і старажытнага Ірана і мастацтва лагатыпа
- Сюжэты казкі «Тысяча і адна ноч» у выяўленчым, музычным і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве

Вяршыняй у развіцці мастацтва Старажытнага свету з'яўляецца эпоха Антычнасці. Дасягненні старажытных грэкаў і рымлян ва ўсіх відах мастацтва без перабольшання грандыёзныя. Антычныя дойліды стварылі тую мову, на якой дагэтуль гаворыць архітэктура. Ордар, порцік, франтон, аркада — гэта азбука не толькі еўрапейскай, але і сусветнай архітэктуры.

Не менш важныя заваёвы характарызуюць антычнае выяўленчае мастацтва. Галоўнай тэмай у антычных скульптараў і жывапісцаў быў чалавек. У параўнанні з мастацтвам папярэдняй пары яго вобраз стаў багацейшы і складанейшы. Старажытныя грэкі ўвайшлі ў гісторыю мастацтва як ствральнікі ідэальна прыгожага вобраза чалавека. Старажытныя рымляне завастрылі ўвагу на яго індывідуальнай непаўторнасці. У сваіх творах яны зафіксавалі ўсю складанасць і неадназначнасць, уласцівыя канкрэтнай асобе. Гэтым яны невымерна пашырылі нашы веды пра саміх сябе.

Даследаванні антычнага мастацтва працягваюцца і сёння. А што пра антычную мастацкую культуру хацелі б даведацца вы? Выканайце міні-праект, які дапаможа паглыбіць вашы веды пра творы мастацтва антычнага свету (форма, матэрыял, тэхнікі на ваш выбар).

**Магчымыя тэмы для даследавання**

- Цуды свету ў Старажытнай Грэцыі
- Роля Г. Шлімана ў сусветнай мастацкай культуры
- Экскурсія па Кноскім палацы, Афінскім акропалі ці інш.
- Старажытнагрэчаскія і старажытнарымскія крылатыя выразы, якімі мы карыстаемся
- Жыццё рымскіх цэзараў у люстэрку мастацтва
- Водгаласы антычнага свету ў сучасным мастацтве
- Антычныя міфы ў сучасным кінематографе
- Старажытнарымскія матывы ў сучаснай архітэктуры
- Рымская мазаіка: камяні або пікселі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# СЛОЎНІК

| | |
|---|---|
| **Абра́д** | традыцыйныя дзеянні, якія суправаджаюць важныя моманты жыцця чалавечага калектыву |
| **Антабleме́нт архітэктурнага ордара** | (ад фр. «entablement», «table» — стол, дошка). Верхняя, нясучая, частка стойкава-бэлечнай канструкцыі. Перакрыцце, што складаецца з архітрава (ніжняй часткі, якая непасрэдна абапіраецца на капітэлі калоны), фрыза (сярэдняй часткі, звычайна з упрыгажэннем) і карніза (верхняй часткі, якая рэзка выходзіць наперад і навісае над астатнімі часткамі) |
| **Антэфікс** | (ад лац. «antefixum» — спераду прымацаваны). Рэльефная пліта з керамікі, каменю ці дрэва, усталяваная на даху антычнага храма для палягчэння сцёку вады (у якасці рассякальніка) |
| **Базі́ліка** | (ад грэч. «дом базілеўса, царскі дом»). У Старажытным Рыме — прамавугольны ў плане грамадскі будынак для суда і гандлю |
| **Гекза́метр** | (ад грэч. «эксі» — шэсць і «метрон» — мера). У антычнасці любы верш, які складаўся з шасці метраў |
| **Грыўня (упрыгажэнне)** | металічны выраб у выглядзе абруча, які насілі на шыі |
| **Каліграфія** | (ад грэч. «каліграфія» — прыгожае пісьмо). Мастацтва прыгожага рукатворнага пісьма, высокамастацкае напісанне тэксту |
| **Кало́на** | від апоры, галоўны элемент апорнай часткі архітэктурнага ордара |
| **Лу́нніца** | падвеска ў форме паўмесяца, рожкі якога накіраваны ўніз |

| | |
|---|---|
| **Наска́льныя малюнкі** | выбітыя або нанесеныя фарбай выявы ў пячорах і на скалах у першабытны час |
| **Паліва́ны** | пакрыты палівай (бліскучай шклопадобнай масай, якая надае трываласць і прыгажосць вырабу з абпаленай гліны) |
| **Па́ндус** | (ад фр. «pente douce» — пакаты схіл). Нахіленая пляцоўка, якая злучае дзве рознавышынныя гарызантальныя плоскасці. У адрозненне ад лесвіцы, не мае прыступак, бо прызначаецца для руху колавых сродкаў |
| **Рытуа́л** | від абраду, які складаецца з пэўных сімвалічных дзеянняў |
| **Стэ́ла** | вертыкальная, часцей за ўсё каменная пліта (слуп), пакрытая тэкстамі або рэльефнымі выявамі |
| **Трыумфа́льная а́рка** | архітэктурнае збудаванне з пышным дэкаратыўным убраннем, якое мае адзін ці тры пралёты для праходу. Узводзіцца ў гонар значных падзей або асоб |
| **Фі́була** | (ад лац. «fibula» — шпілька (засцежка). Металічная засцежка для адзення, якую адначасова выкарыстоўвалі як упрыгажэнне |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |


Вучэбнае выданне

**Захарына** Юлія Юр'еўна
**Колбышава** Святлана Іванаўна
**Карпянкова** Марыя Леанідаўна і інш.


# МАСТАЦТВА
# (айчынная і сусветная мастацкая культура)


Вучэбны дапаможнік для 7 класа
ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы
агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання
(з электронным дадаткам)

| | |
|---|---|
| Рэдактары | *А. У. Бельская, А. В. Міронава* |
| Дызайн | *К. У. Максімава* |
| Мастацкі рэдактар | *К. У. Максімава* |
| Мастак вокладкі | *К. У. Максімава* |
| Камп'ютарны набор | *А. У. Бельская* |
| Праўка камп'ютарнага набору | *І. М. Кузьмянкова* |
| Камп'ютарная вёрстка | *І. М. Кузьмянкова* |
| Карэктар | *А. У. Бельская* |

*У мастацкім афармленні выдання выкарыстаны ілюстрацыі*
*з wikimedia.org, sutterstock.com і іншых крыніц,*
*а таксама тэксты мастацкіх твораў*
*(поўны пералік у электронным дадатку).*

Падпісана да друку 15.08.2024. Фармат 70×100 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 15,6. Ул.-выд. арк. 9,6 + 4,4 эл. дадатак. Тыраж 11 680 экз. Заказ .

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва “Адукацыя і выхаванне”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/19 ад 02.08.2013.
Вул. Будзённага, 21, 220070, г. Мінск.

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.